№ 48 (550) 27 сьнежня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА
ISSN 1819-1614
Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Чалавек году

Хто тыя людзі, якія зрабілі гэты год непадобным да папярэдніх? У Беларусі гэта найперш маладафронтаўцы. Асобы году ў ацэнцы «НН» — **старонка 3**. Рэпартаж з суду над **Артурам Фінькевічам** — **старонка 6**. Рэйтынгі і вынікі году — **старонкі 3—23**.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## У НУМАРЫ

**Мілінкевіч: «Не дай бог нам эканамічнага крызісу...»**

Гутарка зь лідэрам Руху за Свабоду пра вынікі гэтага году і бачаньні наступнага. **Старонка 10**.

**Пераменная хмарнасьць з пагрозай дэвальвацыі**

Прагноз эканамічнага надвор'я да 2011 году. **Старонка 8**.

**Кніга году 2007**

Рэйтынг экаспэртаў. **Старонка 16**.

**Год калыханак**

Музычныя вынікі-2007 падводзіць Сяргей Будкін. **Старонка 20**.

**Каляднае пасланьне айца Надсана**

Калі ўлада стаецца самамэтаю ў руках тых, што яе маюць, і не зважае на патрэбы падуладных, дык яна траціць сваю легітымнасьць, бо не выконвае таго, дзеля чаго яна была ўстаноўленая. Лацінская прымаўка кажа: «Corruptio optimi pessima», што можна перакласьці як «найлепшае, калі сапсуецца, робіцца найгоршым»... **Старонка 2**.

# Ад Рэдакцыі

Сканчаецца год, і мы хочам даць своеасаблівую справаздачу чытачам-ахвярадаўцам газэты.
За год мы выдалі 48 выпускаў «Нашай Нівы»: дзьве сотні аўтараў пісалі ў «НН».
Праца была інтэнсіўнай: у дадатак да газэты наш асяродак выпускае інтэрнэт-сайт, які абнаўляецца штодзённа, ператвараючыся ў такую сабе штодзённую электронную газэту, і змагаецца за пазыцыю самага папулярнага інтэрнэт-рэсурсу па-беларуску. Колькасьць аўтараў nn.by вымяраецца сотнямі.

Значныя грамадзкія і інтэлектуальныя дыскусіі адбываліся ў гэтым годзе на старонках нашага выданьня.

Шмат асалоды дала нам выдавецкая сэрыя «Кнігарня «НН». За 2007 год у ёй выйшла 17 пазыцыяў. Задуманая для ўшанаваньня 100-годзьдзя газэты, яна вырасла за рамкі першапачатковае ідэі і, магчыма, застанецца ў якасьці сталае, калі

**Працяг на старонцы 28.**

# Каляднае пасланьне

апостальскага візытатара для беларусаў–каталікоў замежжа айца **Аляксандра Надсана.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

У Кнізе Роду ёсьць аповед пра патрыярха Абрагама, як ён аднойчы сядзеў ля свайго намёту ў час дзённай сьпёкі і раптам убачыў трох падарожнікаў, што набліжаліся да яго. Ён хутка выбег ім насустрач, кажучы: «Мой Уладару! Калі я знайшоў ласку ў вачох Тваіх, дык прашу, не мінай слугі твайго. Хай прынясуць вады, каб вам памыць ногі і супачыць пад дрэвам. Я ж прынясу хлеба, каб вы падмацаваліся, а потым пойдзеце сабе: бо на тое ж вы зайшлі да вашага слугі» (*Род 18:3-5*). Насамрэч гэта быў Госпад Бог, які завітаў у госьці да Абрагама. Ва ўсходняй іканаграфіі гэтае здарэньне знайшло адлюстраваньне ў іконе, вядомай пад назваю «Старазапаветнай Тройцы».

У аповедзе ўражвае прастата стасункаў між Богам і чалавекам. Адчуваецца непасрэднасьць і цеплыня, звычайна характэрныя для стасункаў між прыяцелямі, а не між Творцам і ягоным творам. Пра гэта будзе пасьля казаць псальміст: «Госпадзе, Госпадзе наш, як вялікае імя Тваё па ўсёй зямлі! Ты веліч сваю ўзьняў вышэй за неба... Хто ёсьць чалавек, што Ты памятаеш пра яго, і сын чалавечы, што ты пра яго дбаеш? Ты зрабіў яго мала меншым за анёлаў, славаю і пашанаю вянчаў Ты яго» (*Пс 8:2, 5-6*).

Тая самая непасрэднасьць адчуваецца ў эвангельскім аповедзе пра сёньняшняе сьвята, калі мы згадваем таксама пра Падарожніка зь неба, Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, які прыйшоў, каб стаць адным з нас і пажыць сярод нас. Ён прыйшоў ня ў Боскай сіле і веліччы, але як маленькае дзіцятка, якое мае патрэбу ў нашай дапамозе і спагадзе. На жаль, гэтым разам не знайшлося Абрагама, які б яго гасьцінна прыняў. Месцам Ягонага нараджэньня стала пячора, у якой звычайна трымалі жывёлу, і якая такім чынам, як кажацца ў адной зь літургічных песьняў, сталася палацам Уладара.

Ня ведаю, ці мы ўяўляем важнасьць гэтага ўнікальнага здарэньня ў гісторыі чалавецтва, калі Бог ушанаваў нас, стаўшыся адным з нас. Гэты акт Ягонай бязьмежнай дабрыні меў на ўвеце нашае дабро і шчасьце. Безумоўна, Ягонае прыйсьце забавязвае нас усіх да таго, каб мы асэнсавалі нашае стаўленьне да Бога і да іншых людзей. Гэтае апошняе прыходзіцца нялёгка. Мы часта не здаем сабе справы, што, зьневажаючы ці крыўдзячы іншага чалавека або пагарджаючы ім, мы зьневажаем Таго, хто гэтага чалавека ўшанаваў, стаўшыся сам чалавекам. Гэта датычыцца ня толькі звычайных людзей, але і тых, што маюць уладу над іншымі. Апошнім часам часта многія любяць паўтараць словы сьвятога Паўла, што «ўсякая ўлада ад Бога». Гэта сапраўды так, бо крыніцай усякай улады ёсьць Бог. Але калі ўлада ад Бога, дык яна павінна паступаць пабожаму. А Бог у асобе Госпада Ісуса Хрыста сказаў, што «не прыйшоў, каб яму служылі, але каб паслужыць і жыцьцё сваё аддаць як выкуп за многіх» (*Мц 20:28*). Такім чынам, улада ёсьць формаю служэньня. Яе мэта — забясьпечыць парадак і супакой, каб людзі маглі свабодна і безь перашкодаў весьці сваё жыцьцё, разьвіваць дадзеныя ім Богам таленты і дасягнуць апошняй мэты — жыцьця з Богам, згодна са словамі сьвятога Аўгустына: «Стварыў Ты мяне для сябе, Божа, і неспакойнае сэрца маё, пакуль не супачыне ў Табе». Калі ж улада стаецца самамэтаю ў руках тых, што яе маюць, і не зважаюць на патрэбы падуладных, дык яна траціць сваю легітымнасьць, бо не выконвае таго, дзеля чаго яна была ўстаноўленая. Лацінская прымаўка кажа: «Corruptio optimi pessima», што можна перакласьці як «найлепшае, калі сапсуецца, робіцца найгоршым». Таму ніякая ўлада, — якая павінна быць удзелам ва ўладзе Божай, — калі сапсуецца, ня можа прынесьці нічога добрага.

Дык будзем прасіць добрага Госпада Ісуса Хрыста, чыё нараджэньне сьвяткуем, даравацьнашаму народу добрых правадыроў, каб усе мы пад іхнай аховаю, гаворачы словамі Сьвятой Літургіі, «маглі пражыць нашае жыцьцё ціха і спакойна, з усякай пабожнасьцю і ў чысьціні».

Хрыстос родзіцца — слаўце Яго!

**а. Аляксандар Надсан**
**Каляды 2007 г.**

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84

# Асобы году

Хто тыя людзі, якія зрабілі гэты год непадобным да папярэдніх? Кім гэты год быў адзначаны, хто пераступіў празь сябе, хто трапіў у летапісы пад лічбай 2007? У беларускай палітыцы гэта маладафронтаўцы.



**Зьміцер Дашкевіч вытрымаў паўторны суд у ізаляцыі.**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Чалавек году — Маладафронтавец

2007 год адзначыўся беспрэцэдэнтным ціскам на сяброў незарэгістраванага «Маладога фронту». Ён пачаўся арыштам Зьмітра Хведарука і Алега Корбана, якіх зьмясьцілі на некалькі дзён у сьледчы ізалятар КДБ — «амэрыканку».

Пасьля быў «Працэс пяці», калі на лаве падсудных за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі адначасова аказаліся Зьміцер Хведарук, Барыс Гарэцкі, Алег Корбан, Аляксей Янушэўскі і Наста Палажанка, апошняя на той момант была яшчэ непаўналетняй. Суд прыпаў на пэрыяд «лібэралізацыі» пасьля сустрэчы Натальлі Пяткевіч з памочнікам дзяржсакратара ЗША Дэвідам Крамэрам (за час пасьля той сустрэчы ён пасьпеў стаць самым маладым у найноўшай гісторыі намесьнікам дзяржсакратара), таму маладзёнаў толькі аштрафавалі.

Восеньню суды над актывістамі прадоўжыліся ў рэгіёнах: у Салігорску было вынесена папярэджаньне Івану Шылу, у Баранавічах аштрафавалі Яраслава Грышчэню, а ў Нясьвіжы — крохкую Насту Азарку, паводле ўсё таго ж сумнавядомага 193-яга артыкулу Крымінальнага кодэксу.

Новыя крымінальныя справы былі заведзеныя супраць Зьмітра Дашкевіча і Артура Фінькевіча, якія ўжо адбывалі зьняволеньне ў турме і на «хіміі». Даць новы тэрмін Дашкевічу за ўхіленьне ад дачы паказаньняў не наважыліся. Затое Артура за парушэньне ўнутранага парадку камэндатуры пакаралі па поўнай — паўтара году турмы.

Нарэшце, Зьмітра Хведарука, адразу пасьля яго візыту ў Вашынгтон і сустрэчы з Бушам, у часе акцыі супраць саюзу з Расеяй зьбіў амон, да страты прытомнасьці.

На сёньня яшчэ тры крымінальныя справы заведзеныя на маладафронтаўцаў з Го-

Працяг на старонцы 4.

# Асобы году

Працяг са старонкі 3.

мельскай вобласьці.

Маладафронтаўцы заслужылі павагу і сваіх сяброў, і праціўнікаў гатоўнасьцю ахвяраваць уласнай свабодай, здароўем і нават жыцьцём у імя сваіх ідэалаў. Яны надалі часам зашмальцаваным паняцьцям «палітычныя і культурныя правы», «свабода» і «каштоўнасьці» канкрэтны кошт: два гады, паўтара году, няпэўнасьць. Кожны можа ўявіць, што перажывае 18-гадовы юнак у ноч перад крымінальным судом.

Маладафронтаўцы ўнесьлі і яшчэ адну навіну ў грамадзкае жыцьцё: мэтадычныя рэпрэсіі супраць іх не выклікалі жаху і здранцьвеньня, а наадварот узьнімалі хвалю салідарнасьці, што дакатвалася да Нясьвіжаў і Магілёваў. Усё гэта дае падставу лічыць асобамі году ў беларускай палітыцы менавіта іх.

## Вяртаньне году — Тадэвуш Кандрусевіч

Пасьля 16 гадоў пастырскай дзейнасьці ў Расеі на Радзіму вярнуўся арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч. Каталіцкі касьцёл узначаліў энэргічны пастыр, які вычувае свой маральны аўтарытэт.

## Ахвяра сыстэмы — Сьцяпан Сухарэнка

Аўтар славутага выказваньня пра дохлых пацукоў Сьцяпан Сухарэнка сёлета пазбыўся пасады старшыні КДБ. Лукашэнка пры звальненьні кпіў: «З чэкістаў вы ператварыліся ў пастухоў». Хадзілі чуткі, што Сухарэнка мог быць нават арыштаваны, але ўрэшце ён аб’явіўся ў бацькоўскай хаце ў Сьветлагорскім раёне. І чакае новага прызначэньня, ціхенька, хоць першае сваё інтэрвію пасьля адстаўкі даў «Народнай волі». Якая сыстэма, такія і ахвяры.

## Расчараваньне — Юры Жадобін

Як высьветлілася, на месца Сухарэнкі прыйшла вартая зьмена. Новы кіраўнік службы Юры Жадобін на свой першы дзень чэкіста назваў палітычную апазыцыю «супольнасьцю дэструктыўных элемэнтаў», якіх ёсьць 1767 і якіх КДБ ведае пайменна.

## Салодкі галасок — Дзьмітры Калдун

Сьпявак Дзьмітры Калдун годна прадставіў Беларусь на Эўрабачаньні, конкурсе, вялікую ўвагу якому надаюць толькі на абшарах былога Савецкага Саюзу.



Памёр Барыс Ельцын — першы прэзыдэнт Расеі.

## Змагар году — Сяргей Сямёнаў

Сваёй прынцыповасьцю гомельскі хлопец Сяргей Сямёнаў адстаяў права запаўняць па-беларуску мытныя дэклярацыі пры ўезьдзе і выезьдзе за мяжу. Некалькі разоў за патрабаваньне беларускамоўнага бланку на Сямёнава складалі адміністрацыйныя пратаколы, але ахвоту адстойваць законнае права не адбілі. Урэшце Сямёнаў перамог, што прызнаў нават старшыня Канстытуцыйнага суду Рыгор Васілевіч. За тое, што даўно зьяўляецца нормай для іншых народаў, беларусам усё яшчэ трэба змагацца.

## Спартовец году — Аляксандар Глеб

Пасьля сыходу зь лёнданскага «Арсэналу» францускай зоркі Т’еры Анры беларус Аляксандар Глеб стаў лідэрам каманды і адным з найбольш яркіх гульцоў ангельскай прэм’ер-лігі. Ангельцы шкадуюць, што Глеб ня можа выступаць за іх зборную, а гішпанская «Барсэлёна» ня супраць бачыць капітана беларускай зборнай у сваіх шэрагах. Дзякуючы Аляксандру Глебу пра Беларусь штодня дазнаюцца ўсё болей і болей людзей у сьвеце.

## Аванс году — Агнешка Рамашэўская

Незалежнае беларускамоўнае тэлебачаньне спарадзіла вялізныя надзеі. Ці апраўдае яно іх? Заслуга стварэньня «Белсату» належыць перадусім ягонай дырэктарцы Агнешцы Рамашэўскай, і зь яе імём будуць зьвязвацца посьпехі і няўдачы каналу, што набірае прафэсіяналізму.

## Новыя зоркі ў палітыцы — Юлія Цімашэнка і Дзьмітры Мядзьведзеў

Пры канцы году Юлія Цімашэнка другі раз стала прэм’ер-міністрам Украіны. Менавіта яна разглядаецца як адна з найбольш яўных прэтэндэнтаў на прэзыдэнцтва на наступных выбарах.

Вызначыліся зь пераемнікам і ў Расеі. Месца Пуціна зойме 42-гадовы Дзьмітры Мядзьведзеў. На прэзыдэнцтва яго вылучылі чатыры найбуйнейшыя палітычныя партыі. Мядзьведзеў мае рэ-




Лукашэнка звольніў старшыню КДБ Сьцяпана Сухарэнку і выкарыстаў зьбіцьцё кадэбістамі кіраўніка Камітэту дзяржкантролю Зянона Ломаця для дыскрэдытацыі спэцслужбы з савецкімі каранямі. Звольнены Сухарэнка сваё першае інтэрвію даў апазыцыйнай «Народнай волі». На фота: у часе інтэрвію, на радзіме кадэбіста.

путацыю аднаго з найбольш эўрапейскіх палітыкаў Крамля. Але ў той Расеі ясна, што нічога ня ясна. Бо хто будзе сапраўдным кіраўніком — малады Мядвед ці такі стары Пуцін, якому ствараюць вобраз «любімага кіраўніка» і «нацыянальнага лідэра»? Ягоны культ нагадвае манархічны…

## Прага ўлады — Уладзімер Пуцін

Дзьмітры Мядзьведзеў адразу пасьля вылучэньня на прэзыдэнцтва прапанаваў Уладзімеру Пуціну пасаду прэм’ер-міністра. Пуцін згадзіўся. Амэрыканскі часопіс Time прызнаў У. Пуціна сёлета чалавекам году. Сярод іншага, званьне Пуціну было прысуджанае за тое, што ён «істотна парушыў прынцыпы і ідэі, якія цэняць свабодныя нацыі».

## Яна кінула выклік

Хілары ці ня Хілары? Калі дэмакраты такі выберуць сабе ў кандыдаткі жонку Біла Клінтана… стоп… гэта непаліткарэктна… сэнатара ад штату Нью-Ёрк Ms. Clinton, то амэрыканскія прэзыдэнцкія выбары напэўна ператворацца ў галасаваньне за Клінтаніху ці супраць Клінтаніхі. Яна кінула выклік мужчынскай палітыцы, і яна антаганізуе Амэрыку. Ужо першыя перадвыбары ў Аёве і Нью-Гэмпшыры неўзабаве пакажуць, ці гатовае даволі традыцыйная амэрыканская глыбінка зрабіць стаўку на бабу… стоп… жанчыну ці нэгра… ай… афраамэрыканца… А што ад таго нам, кабанам, як казаў пэрсанаж аднаго анэкдота? А нам напраўдзе ад выніку амэрыканскіх выбараў вельмі залежыць, бо Амэрыка застаецца безумоўным рухавіком заходняга сьвету, і калі наступным прэзыдэнтам акажацца такі самы стаўленік… стоп-стоп… чалавек, зьвязаны з нафтавым лобі, як Буш, і цэны на энэрганосьбіты застануцца на цяперашнім узроўні, Беларусі будзе цяжка вытрымліваць націск Расеі.

## Валадар хаосу

Пэрвэз Мушараф, дыктатар Пакістану, 3 лістапада прыпыніў дзеяньне канстытуцыі і абвесьціў надзвычайнае становішча ў сваёй 160-мільённай, г.зн. у 16 разоў больш населенай, чым Беларусь, краіне. Ягоная краіна мае атамную зброю і пры гэтым знаходзіцца ў канфлікце з атамнай Індыяй, мяжуе з Аўганістанам. Яе разьдзіраюць палітычныя і рэлігійныя спрэчкі. Гледзячы на пахмуры твар гэтага былога дэсантніка, міжволі ўспамінаеш, як мала аддзяляе чалавецтва ад атамнай катастрофы і колькі адвагі трэба мець, каб кіраваць такім пеклам як Пакістан.

## Нобэлеўскі намінант зь беларусаў — Станіслаў Шушкевіч

Калі тое было, што «беларусы нічога ня мелі»? ТВ маем, сусьветных зорак маем, вось толькі б мову сваю… Дарога да вяртаньня роўных правоў нацыянальнай культуры праходзіць праз палітычную барацьбу, і гэтым змаганьнем за свабоду, за чалавечую годнасьць, беларусы заслужылі ўвагу і павагу мільёнаў людзей у Вольным сьвеце. Другі год запар беларуса вылучаюць на атрыманьне Нобэлеўскай прэміі міру. Летась сярод прэтэндэнтаў быў старшыня ліквідаванай праваабарончай арганізацыі «Вясна» Алесь Бяляцкі, сёлета — Станіслаў Шушкевіч, якога прапанаваў былы прэзыдэнт Польшчы Лех Валэнса.

## Чалавек абавязку — Лявон Баршчэўскі

Пэдагог і перакладчык Лявон Баршчэўскі вярнуўся ў палітыку. Каля васьмі гадоў ён адмяжоўваўся ад палітычнай дзейнасьці, але на сьнежаньскім зьезьдзе Партыі БНФ Баршчэўскі быў вымушаны вярнуцца. Перад другім днём працы зьезду Партыя апынулася ў патавай сытуацыі: ніводзін прэтэндэнт не набраў патрэбнай колькасьці галасоў. Як у 1999 годзе, Фронт быў на мяжы расколу. Выратаваў становішча Лявон Баршчэўскі, які прапанаваў сваю кандыдатуру, як кампрамісную. Баршчэўскага падтрымалі амаль аднагалосна.

**Зьміцер Панкавец, Мікола Бугай**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Цяжкое рашэньне Лявона Баршчэўскага (у цэнтры).**

# Другі тэрмін Фінькевіча




Тэрмін знаходжаньня Артура Фінькевіча ў магілёўскай спэцкамэндатуры мусіў скончыцца 9 сьнежня. Хлопца пакаралі двухгадовым абмежаваньнем волі за графіці, зробленыя напярэдадні мінулых прэзыдэнцкіх выбараў. Аднак незадоўга да вызваленьня, 26 кастрычніка Артура зьмясьцілі ў сьледчы ізалятар за «сыстэмныя парушэньні ўнутранага распарадку камэндатуры». У той дзень Фінькевічу было вынесенае пятае папярэджаньне. Супраць яго была заведзеная крымінальная справа паводле артыкулу 415 КК (ухіленьне ад адбыцьця пакараньня). Санкцыі паводле гэтага артыкулу прадугледжвалі зьняволеньне да трох гадоў.

20 сьнежня судзьдзя Кастрычніцкага раёну Магілёва Натальля Крашкіна пачала разглядаць другую крымінальную справу Артура Фінькевіча. У Магілёў падтрымаць хлопца прыехалі Аляксандар Мілінкевіч, Іна Кулей, Павал Севярынец, браты Шылы з бацькам, Яраслаў Грышчэня, Вячаслаў Сіўчык, заходнія дыпляматы. Каля сарака чалавек змаглі патрапіць у залю, амаль столькі ж засталося на вуліцы.

Артура Фінькевіча міліцыянты ўвялі ў залю ў кайданках, спэцназаўцы заміналі фатографам здымаць Артура, хаця дазвол на гэта быў атрыманы ад судзьдзі. Фінькевіч выглядаў ня лепшым чынам — бледны, стомлены, вусны сьціснутыя, нават не здымаў курткі. Яго пасадзілі ня ў клетку, але з трох бакоў да яго былі прыстаўленыя міліцыянты.

Амаль адразу Артур заявіў хадайніцтва пра перанос судовага працэсу на іншы дзень, бо апошнія дні ў яго балела сэрца, а таксама быў павышаны ціск. Судзьдзя згадзілася, што павінна быць праведзеная мэдыцынская экспэртыза. Лекары сапраўды прызналі, што ў Артура высокі ціск, яму зрабілі ўкол. Кардыяграму ніхто не рабіў. Урачы канстатавалі, што суд можна працягваць.

Абвінавачваньне супраць Фінькевіча складалася з наступных пунктаў: 1) 14 і 15 верасьня 2006 году Фінькевіч без дазволу пакідаў больніцу, у якой знаходзіўся; 2) 6 студзеня 2007 году спазьніўся на 13 хвілінаў з адпачынку. Спазьненьне патлумачыў тым, што трапіў у затор, калі ехаў на таксоўцы ў камэндатуру; 3) 16 лютага 2007 году спазьніўся на 40 хвілінаў з адпачынку і быў нападпітку. Фінькевіч прызнаўся, што сапраўды ўжыў 3

пляшкі піва, патлумачыўшы гэта кепскім маральным станам, бо ў той дзень даведаўся пра хваробу бабулі; 4) 3 жніўня 2007 году зьявіўся ў камэндатуры п'яным. Фінькевіч сказаў, што выпіў 2/3 флякону лекаў «Навапасіт», які ўтрымлівае алькаголь, каб супакоіць нэрвы; 5) 22 кастрычніка спазьніўся на працу на будоўлю. Растлумачыў спазьненьне тым, што быў у паліклініцы, дзе здаваў аналіз мачы. Яго і ў той раз завезьлі на наркалягічную экспэртызу й выявілі ўтрыманьне алькаголю. Фінькевіч сказаў, што піў той самы «Навапасіт» і яшчэ настойку глогу.

Разам з тым, Артур сказаў, што лічыць гэты працэс палітычным. Ён расказаў пра тое, што цягам месяца ці нават болей яму не давалі дазволу выйсьці ў горад, а кіраўніцтва камэндатуры няспынна паўтарала, што хлопец у любым выпадку апынецца ў турме. Некалькі разоў да яго прыходзілі «кадэбісты», а таксама Фінькевіча штораз ізалявалі, калі прыязджаў нехта з апазыцыйных палітыкаў ці дыпляматаў.

Тым часам пад вокнамі суду моладзь працягвала гукаць: «Жыве Беларусь!», «Свабоду Фінькевічу», сьпявалі песьні «Таварыша Маўзэра» і N.R.M. Гэта добра было чуваць у залі. Міліцыя папярэджвала ўсіх пра адказнасьць, але нікога не затрымалі.

Апыталі больш за дзесяць сьведкаў. Нават пасьля гэтага судзьдзя Крашкіна не абвясьціла перапынку на абед. Тады і стала ясна, што скончыць працэс судзьдзя хоча за адзін дзень.

Падчас судовых спрэчак дзяржаўны пракурор Цяплова запатрабавала пакараць Артура Фінькевіча двума гадамі зьняволеньня. Адвакатка Ганна Рыбалка, якая адразу абрала тактыку найменшага супраціву, папрасіла пакараць свайго падабароннага мінімальным тэрмінам, які прадугледжваецца гэтым артыкулам, — паловай году зьняволеньня.

Сам Артур Фінькевіч прасіў пакараць яго максымальна мякка.

Прысуд быў вынесены ў 19.15. Артур Фінькевіч атрымаў 1,5 году калёніі агульнага рэжыму. Прысутныя сустрэлі прысуд словамі «Ганьба!» і «Артур, мы з табой». Дзяўчаты не маглі стрымаць сьлёз.

Тэрмін зьняволеньня будзе адлічвацца ад 26 кастрычніка. Цягам 10 дзён рашэньне можна абскардзіць у абласным судзе, у адваротным выпадку А. Фінькевіч будзе этапаваны ў турму. 28 сьнежня пройдзе паседжаньне аргкамітэту па вызваленьні Артура Фінькевіча. У прыватнасьці, яму памяняюць адваката.

**Зьміцер Панкавец, Магілёў — Менск**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Моладзь пікетуе будынак суду.**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Зампаліт Кузькоў (зьлева) паказаў у судзе, што Артур Фінькевіч злосна парушаў рэжым.**

# Параменная хмарнасьць

Прагноз эканамічнага надвор'я да 2011 году.

Нярэдка даводзіцца чуць, што беларуская эканамічная мадэль — гэта такая экзатычная птушка, якая жыве паводле сваіх уласных, нікому не зразумелых законаў. Аднак, як выявілі адмыслоўцы Дасьледчага цэнтру Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту (ІПМ), такая думка ня мае пад сабой падставаў. Насамрэч, беларускую эканоміку можна мадэляваць.

Мадэль, створаная эканамістамі ІПМ, дазваляе прагназаваць, як будзе паводзіць сябе эканоміка краіны ў залежнасьці ад пэўных фактараў. «Яна працуе паводле тых самых законаў, што і іншыя эканомікі, — кажа эканаміст ІПМ Аляксандар Чубрык. — Людзі паўсюль аднолькавыя, і яны аднолькава рэагуюць на пэўныя эканамічныя стымулы. Калі стымулы такія, як у Беларусі, то рэакцыя цалкам прадказальная. Мы нават самі дзівіліся, як блізка да некаторых — хоць і ня ўсіх — тэорыяў у нас выходзяць каэфіцыенты, знакі ў нашых ураўнаньнях».

Мадэль, збудаваная адмыслоўцамі Дасьледчага цэнтру ІПМ ужо атрымала захопленыя водгукі ад замежных арганізацыяў, якія займаюцца эканамічнымі дасьледваньнямі. Гэтак, у Стакгольмскім інстытуце пераходнай эканомікі адзначаюць, што экспэрты Дасьледчага цэнтру ІПМ — бадай, адзіныя ў СНД, хто здолеў стварыць такую пасьпяховую мадэль.

Сама мадэль выглядае як спалучэньне графікаў ды матэматычных формулаў, якія навуковец можа інтэрпрэтаваць для таго, каб, скажам, прадбачыць магчымае ўзьдзеяньне энэргетычных шокаў на эканоміку Беларусі. Для ствараньня мадэлі выкарыстоўваліся дадзеныя Мінстату ды Нацбанку з 1996 г. да першага кварталу 2007 г. «Прааналізаваўшы гэтыя дадзеныя, мы атрымалі ўнікальную базу», — кажа А.Чубрык.

## Прагнозы на базе досьведу

Эканамісты Дасьледчага цэнтру ІПМ вырашылі паспрабаваць змадэляваць, як паўплывае на эканоміку краіны энэргетычны шок, якога нам, бадай, не мінуць. У чым будзе складацца гэты шок? «Мы зыходзілі з таго, што будзем мець 100 % эўрапейскай цаны на газ у 2011 годзе, а таксама падвышэньне цаны на нафту як наступства пагадненьня паміж Беларусьсю ды Расеяй аб тым, што мыта на нафту будзе паволі падвышацца да 2009 г.», — тлумачыць А.Чубрык. Другі фактар, які улічаны ў мадэлі — будучыя прэзыдэнцкія выбары. Як падказвае досьвед, перад выбарамі ўрад заўжды ідзе на пэўныя эканамічныя захады з мэтай падвысіць узровень заробкаў. Паводле мадэлі, выбары адбываюцца ў чацьвертым квартале 2010 г. Ну і самая галоўная перадумова функцыяваньня мадэлі — імкненьне дзяржавы максымальна пазьбягаць дэвальвацыі беларускай валюты. Гэта важна ўлічваць яшчэ і таму, што ў 2007 г. праляцела першая ластаўка, якая сыгналізуе пра тое, што беларусы пачалі губляць давер да свайго рубля: колькасьць укладаў у нацыянальнай валюце пачала скарачацца, а ў замежнай валюце — узрастаць.

Акрамя гэтага, у мадэль трэ было закласьці меркаваную цану на энэрганосьбіты для Беларусі ў 2011 г. Зрабілі гэта на падставе прагнозаў МВФ. Паводле іх, цана газу дасягне амаль 240 даляраў у 2011 г. за тысячу кубоў, а нафты — прыкладна 370 даляраў за тону. «МВФ схільны недаацэньваць

### ЗДЫМКІ ГОДУ



**Расейскі бізнэс атрымаў у Беларусі некалькі шматмільярдавых падрадаў. На фота: начальнікі Масквы Юры Лужкоў і Менску Міхаіл Паўлаў на цырымоніі адкрыцьця памятнага знаку ў гонар пачатку будаўніцтва бізнэс-цэнтру «Дом Масквы».**

PHOTO.BYMEDIA.NET

# з пагрозай дэвальвацыі

рост цэнаў на расейскія энэрганосьбіты, — адзначае А.Чубрык, — але для нашай мадэлі дакладнасьць гэтых лічбаў істотна не ўплывае на вынік».

Такім чынам, заклаўшы гэтыя дадзеныя ў сваю мадэль, эканамісты Дасьледчага цэнтру ІПМ атрымалі тры сцэнары разьвіцьця беларускай эканомікі да 2011 г. — базавы (асноўны, сярэдні варыянт), адмоўны (калі справы — дрэнь) ды станоўчы (калі ўсё ідзе найлепшым чынам).

## Рост дэфіцыту

Такім чынам, у 2011 г. паводле базавага сцэнару дэфіцыт замежнага гандлю таварамі складзе каля 7 млрд даляраў, паводле адмоўнага — каля 8 млрд, паводле станоўчага — каля 5 млрд.

Гэты дэфіцыт трэба нейкім чынам фінансаваць. Якім чынам? Паводле базавага сцэнару да канца 2009 г. узьнікне недахоп фінансаваньня ўнутранага попыту на валюту. Той попыт складаецца з патрэбы фінансаваць імпарт, а таксама з жаданьня насельніцтва набываць валюту. Гэта асабліва моцна адчуваецца ў пэрыяды, калі ёсьць пэўныя эканамічныя праблемы, і людзі кідаюцца да абменьнікаў. Дык вось, згодна з асноўным сцэнаром, у краіне будзе бракаваць валюты для фінансаваньня ўнутранага попыту. Гэта значыць, што Нацбанк будзе вымушаны прадаваць частку сваіх рэзэрваў. Згодна з адмоўным сцэнаром, валюты будзе бракаваць нават на фінансаваньне імпарту, таму дэвальвацыя будзе проста непазьбежная. Паводле станоўчага сцэнару, валюты нам хопіць. Так, у 2011 г. Нацбанк будзе вымушаны прадаць крыху рэзэрваў, але ня больш за паўмільярда даляраў, што не зьяўляецца для нас істотнай праблемай.

У розных сцэнарах фінансаваньне дэфіцыту адбываецца з розных крыніцаў. У базавым сцэнары — за кошт падвышэньня замежнай пазыкі і прыватызацыі паводле прынцыпу «калі трэба грошы, то нешта прадамо, калі ня трэба — то прадаваць ня будзем». Паводле адмоўнага сцэнару, дзяржава імкнецца захаваць сваю ўласнасьць, і фінансаваньне дэфіцыту ідзе выключна за кошт павелічэньня вонкавай пазыкі. У станоўчым сцэнары даволі вялікі адсотак фінансаваньня ідзе за кошт простых замежных інвэстыцыяў.

Згодна з адмоўным сцэнаром, каля 20 % чыстага прытоку будзе прыпадаць на простыя замежныя інвэстыцыі, згодна са станоўчым — блізу 60 %, і 40—50 % — згодна з базавым.

## Курс рубля

Да якой дэвальвацыі беларускага рубля прывядуць такія сцэнары? Згодна са станоўчым сцэнаром, будзе невялічкая дэвальвацыя у 2010—2011 гг. Паводле базавага сцэнару, рубель чакае даволі вялікая дэвальвацыя. Яна можа скласьці амаль 10 % у 2009 г., і ў выніку ў 2011 г. мы маем назапашаную дэвальвацыю больш за 50 %. «Базавы сцэнар — гэта прыкладна тое, што адбываецца цяпер», — адзначае Аляксандар Чубрык. І, нарэшце, паводле адмоўнага сцэнару мы сутыкаемся з патаньненьнем беларускага рубля да даляра амаль у два разы ў параўнаньні з 2006 г.

«Прычым мы ня ўлічваем эфэкту сьпіралі, — зазначае эканаміст. — Калі дэвальвацыя пачынаецца, падвышаецца попыт на замежную валюту, а гэта, у сваю чаргу, патрабуе яшчэ большай дэвальвацыі. Складана ацаніць, наколькі далёка зойдзе гэтая сьпіраль».

Згодна з базавым сцэнаром, у 2011 г. занятасьць зьнізіцца на 1 %, згодна з адмоўным — на 2 %. Пры станоўчым сцэнары спачатку адбываецца невялікае падзеньне занятасьці, бо адбываецца рэструктурызацыя прадпрыемстваў, прыцягненьне замежных інвэстыцыяў — таму захаваць былы ўзровень занятасьці будзе цяжкавата. Але разьвіцьцё эканомікі будзе ісьці далей і дасьць падвышэньне занятасьці ў 2011 г.

## Рост заробкаў

«Галоўнае пытаньне, якое хвалюе людзей, — колькі яны будуць зарабляць у адпаведнасьці з нашымі сцэнарамі, — кажа А.Чубрык. — Гэта ўжо своеасаблівы прагноз на падставе гэтай мадэлі. Калі вы памятаеце, пры канцы 2010 г. нам усім абяцалі сярэдні заробак у 500 даляраў. Дык вось, згодна і з базавым, і са станоўчым сцэнарамі ўлады здолеюць выканаць свой плян і забясьпечыць гэтыя 500 даляраў пры канцы 2010 г. Толькі згодна з адмоўным сцэнаром яны ня здолеюць гэта зрабіць».

Здаецца, Беларусь мае дастаткова добрыя шанцы прыйсьці ў 2011 зь неблагімі эканамічнымі вынікамі. Але праблема ў тым, што адмоўны сцэнар будзе адбывацца ў тым выпадку, калі нашая эканоміка, разьвіваючыся ў адпаведнасьці з базавым сцэнаром, раптам перажыве нейкі эканамічны шок. «Скажам, калі Расея ўсё-такі вырашыць пасьля 2009 г. увесьці для Беларусі такое ж мыта на экспарт нафты, як для іншых краінаў, мы з базавага сцэнару скоцімся ў адмоўны», — прагназуе А.Чубрык.

Такім чынам, эканамісты ІПМ бачаць рэцэпт посьпеху ў прыватызацыі праз прыцягненьне простых замежных інвэстыцыяў. Яна дазволіць пазьбегнуць рэзкага павелічэньня замежнай пазыкі і прафінансаваць інвэстыцыі ў асноўны капітал, падвысіўшы, такім чынам, унутраны попыт і канкурэнтаздольнасьць беларускіх тавараў.

## Крызісны момант

«На наш погляд, самы хісткі момант для скатваньня ў нэгатыўны сцэнар — 2010 год, — мяркуе эканаміст. — Невядома, як вырашыцца пытаньне з нафтай, таксама могуць узьнікнуць праблемы з экспартам у Расею — скажам, новы віток гандлёвай вайны. Расея ж для нашай прамысловай прадукцыі застаецца асноўным рынкам (калі ня браць нафтапрадукты)».

А.Чубрык лічыць, што мэнтальнасьць уладаў пакуль што не зьмянілася настолькі, каб у краіне пачаліся сыстэмныя рэформы. Але ў выпадку палітычнага прэсінгу з боку Расеі на Беларусь гэтая мэнтальнасьць, магчыма, будзе ламацца, бо будзе ўзьнікаць патрэба абароны палітычнага сувэрэнітэту.

Мадэль, распрацаваная Дасьледчым цэнтрам ІПМ — гэта не гараскоп ці гаданьне на картах, а вынік дасканалага аналізу. «Людзі думаюць, што з гэтых дадзеных можна атрымаць нейкую абсалютную ісьціну, — кажа А.Чубрык. — Гэта ня так, абсалютна дакладны прагноз немагчымы. Аднак гэтыя дадзеныя, раскладкі, дапамагаюць мадэляваць варыянты разьвіцьця падзеяў».

**Алесь Кудрыцкі**



Аляксандар Мілінкевіч на «Эўрапейскім маршы» 14 кастрычніка.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Аляксандар Мілінкевіч: «Не дай Бог нам эканамічнага крызісу...»

Гутарка зь лідэрам «Руху «За Свабоду» пра вынікі гэтага году і бачаньні наступнага адбылася на другі дзень пасьля суду над Артурам Фінькевічам, таму мы і пачалі з гэтай тэмы.

**«Наша Ніва»: Якія ўражаньні пакінуў суд над Артурам Фінькевічам?**

**Аляксандар Мілінкевіч**: Я паўночы думаў над гэтым. Стратэгія адваката была абсалютна памылковая. Яна палічыла, што нельга ператвараць суд над Фінькевічам у палітычны працэс, а лепш пакорліва сказаць, што вінаваты, хаця і ня цалкам. Тады Артур, нібыта, атрымае па мінімуме. Аказалася ж, што ўсе гэтыя кулюарныя дамоўленасьці былі простымі мыльнымі бурбалкамі. Сёньня ў мяне пачуцьцё нейкай прыніжанасьці. Рэчы трэба называць сваімі імёнамі. Працэс над Артурам тыпова палітычны. Тыя ўмовы, у якіх ён знаходзіўся на «хіміі», прыніжалі гонар і годнасьць. Артур — чалавек зь вялікім пачуцьцём справядлівасьці, ён вельмі свабодны па сваёй натуры.

**«НН»: Суд мог пайсьці неяк інакш?**

**АМ:** Мог. Бессэнсоўна выклікаць у судзьдзі шкадаваньне. Нашая пазыцыя моцная, бо яна маральная. Артур мог шчыра расказаць, што яго прыніжалі і палохалі падчас «хіміі», што да яго прыходзілі кадэбісты, што начальнікі камэндатуры казалі яму: у любым выпадку будзеш у турме. Такая пакорлівасьць і спроба згуляць з уладамі, як было на судзе, безнадзейная. На тых працэсах, дзе мы паводзілі сябе агрэсіўна і актыўна, усе адчувалі за сабой пачуцьцё праўды. Тады мы выйгравалі. Учора ж у маёй жонкі былі сьлёзы на вачох. Нас прынізілі за тое, што мы не змаглі сябе адстаяць. Артур мусіць вытрымаць гэты тэрмін. Усім было відавочна, што ён у дрэнным фізычным стане. У яго баліць сэрца і хворыя ныркі. Мы мусім падтрымліваць хлопца любымі сродкамі. Трэба часьцей пісаць лісты, трэба, каб пра яго не забывалася прэса.

**«НН»: Таксама днямі былі ўзноўленыя тры крымінальныя справы супраць «маладафронтаўцаў» з Гомельшчыны. Ці выпадкова гэта?**

**АМ**: Улада прайграла барацьбу за моладзь. Канечне, не за ўсю, але за самую лепшую, за актыўную, за адукаваную. Гэта значыць, яна прайграе будучыню. Моладзь — галоўная сіла вулічных акцыяў, а ўлада вельмі баіцца вулічных маніфэстацыяў. Гэта і ёсьць прычыны, чаму аднаўляюцца і заводзяцца новыя крымінальныя справы. На судзе над Фінькевічам плакалі дзяўчаты, але яны плакалі не ад страху, а ад часовай бездапаможнасьці, ад беззаконнасьці. Я перакананы, што новымі «крыміналкамі» моладзь ня зломіш. Наадварот, яна толькі загартуецца.

**«НН»: Як Вы ацэньваеце нядаўнія заявы старшыні КДБ Жадобіна пра 1767 апазыцыянэраў?**

**АМ**: Сумна, што ўзровень працы КДБ няспынна зьніжаецца. Начальнік сказаў знай-

сьці апазыцыянэраў — іх знайшлі. Гэта сьмешна. Паводле зьвестак таго ж КДБ на Плошчы пабывала каля 34 тысячаў чалавек. Нават у сілавых структурах хапае людзей, якія падзяляюць нашыя мэты і погляды, бо людзі ўсьведамляюць заганнасьць сёньняшняй сыстэмы. Нас вельмі многа. Каб мы змаглі рэальна аб’яднацца, то сытуацыя ў краіне зьмянілася б за адзін дзень. Для гэтага трэба толькі выйсьці на вуліцу і сказаць, што мы супраць.

**«НН»: Сёлетняя стаўка на вулічныя акцыі апраўдала сябе?**

**АМ**: Я ведаю, што на гэты конт ёсьць розныя меркаваньні. Некаторыя лічаць, што хадзіць няма сэнсу, бо адзін і той жа маршрут, сумна і не прыносіць карысьці. Я ж лічу, што без дэманстрацыі сваёй сілы на вуліцы мы прыйдзем да заняпаду. Думаю, што варта выходзіць да той пары, пакуль не пераможам. Яшчэ вельмі важна, каб колькасьць людзей, якія здольныя выйсьці, пастаянна расла.

**«НН»: А што для гэтага трэба рабіць?**

**АМ**: Разбураць страх і інфармаваць. Страх мы разбураем салідарнасьцю. За апошні год у справе абароны рэпрэсаваных зроблена шмат. Гэта адзін з найбольшых посьпехаў. Трэба бараніць людзей юрыдычна, маральна, фінансава, даць ім магчымасьць працягнуць вучобу. Даваць канкрэтныя рэчы канкрэтнаму чалавеку. Калі будзе так, то галаву падымуць і астатнія. Што да інфармацыі, то нічога новага я вам не скажу. Не павінна быць чарговай моды на ідэю інфармаваньня Беларусі з-за мяжы. Я ўсюды падтрымліваю тэлебачаньне, хаця і ня ўпэўнены, што праект будзе стопрацэнтна апраўданы. Разам з тым, калі мы кінем усе сілы на тэлебачаньне і ня будзем займацца тут газэтамі, інтэрнэтам, улёткамі, то яно можа ператварыцца ў бессэнсоўшчыну. Налета мы хочам заняцца шырокай праграмай эўрапеізацыі людзей. Няхай пытаньне інтэграцыі ў Эўропу пачне абмяркоўвацца ў грамадстве. Няхай людзі задумаюцца над сваім лёсам, лёсам сям’і, краіны, а таксама над тым, хто мы і куды ідзем, што такое Эўропа, ці варта туды ісьці, ацэняць плюсы і мінусы, суседзяў, іхныя посьпехі і праблемы. Трэба пастаянна вучыць людзей, асабліва моладзь, як кіраваць на ўсіх узроўнях, найперш мясцовым. Мы будзем пасылаць людзей для такой вучобы ў суседнія краіны.

**«НН»: Гэта значыць, што будзе працягвацца практыка замежных сэмінараў для апазыцыі за мяжой?**

**АМ**: Гэта іншае. Сэмінары, якія ўжо рэдка каму патрэбныя, навучаюць таму, як стварыць грамадзкую арганізацыю, як зрабіць рэгіянальную газэту, журналістаў вучаць пісаць артыкулы. У нас гэта ўжо ўсе ўмеюць. Я кажу пра досьвед пераўтварэньняў, як ішлі па рэформах палякі, эстонцы, чэхі. Гэтаму трэба навучыць, бо такіх ведаў сапраўды не хапае. Я б сам хацеў больш разабрацца ў некаторых рэчах.

**«НН»: Якіх менавіта?**

**АМ**: Я б хацеў больш ведаць пра рэформы сацыяльныя, пэнсійныя, мэдычнай сыстэмы. Калі я прэтэндую на прэзыдэнцтва, то павінен арыентавацца ва ўсім.

**«НН»: Вы згадалі пра абарону рэпрэсаваных. Самы яскравы прыклад тут — праграма Каліноўскага. Ці апраўдала яна сябе?**

**АМ**: На сто працэнтаў. Гэта ня проста праграма падтрымкі пакрыўджаных. Ніводзін здабытак незалежнага грамадзтва не выклікае ва ўладаў столькі нэгатыву і злосьці, як праграма Каліноўскага. Яна разбурыла страх сярод студэнцкай моладзі, цяпер яны не баяцца выходзіць на акцыі і ўдзельнічаць у дэмакратычным руху. Я жыву ля ін’язу. Да мяне часта падыходзяць студэнты, якія дзякуюць мне, што зьявілася пачуцьцё абароненасьці. Я веру, што тыя, хто зьехаў, вернуцца. Яны будуць масткамі незалежнай Беларусі з вольным сьветам. Студэнты паехалі ня толькі ў Польшчу, але і ў Чэхію, Румынію, Эстонію, Францыю. Гэта выдатная праграма.

**«НН»: Што яшчэ станоўчае запомнілася Вам у гэтым годзе?**

**АМ**: Узрасла роля моладзі ў дэмакратычным грамадзтве. Раней у апазыцыі дамінавала хваля, якая прыйшла ў дэмакратычны рух падчас перабудовы. Сёньня ж прыйшла новая генэрацыя. Калі казаць рэальна, то моладзь — галоўная сіла апазыцыі. Яе наяўнасьць мае велізарнае значэньне. Згадваецца нядаўняя паездка ў Вашынгтон. Безь Севярынца, Хведарука і Браніцкай мы здаваліся б апазыцыйнай намэнклятурай, але яны надалі нашай вандроўцы імпэту. Яны пачувалі сябе вельмі спакойна на самых высокіх прыёмах, былі шчырымі і адкрытымі. Яны прадэманстравалі вялікую веру. Моладзь дае калясальную надзею.

**«НН»: А самае вялікае расчараваньне 2007 году?**

**АМ**: Мы не захавалі станоўчы патэнцыял і імідж апазыцыі, якога дамагліся падчас прэзыдэнцкіх выбараў. За гэты год мы многае згубілі. Згубілі яшчэ не безнадзейна, але шкада, што гэта крок назад. Палітычная актыўнасьць заўсёды ідзе хвалямі. У Беларусі пік прыпадае на гады прэзыдэнцкіх выбараў. Таму, можа быць, і ня страшна, што актыўнасьць крыху зьнізілася.

**«НН»: Ня крыўдна было на сёлетнім Кангрэсе страціць лідэрства ў апазыцыі?**

**АМ**: Лідэраў не прызначаюць на Кангрэсах. Можна выбіраць лідэра на кожным Кангрэсе, гэта ня значыць, што ён будзе ўспрымацца так людзьмі. Кангрэс мусіць прапанаваць чалавека, на якога захочуць працаваць актывісты. Пэрсаніфікацыя важная паўсюль, а ў Беларусі ва ўмовах аўтарытарнага грамадзтва, тым больш. Адмова ад адзінага лідэра — гэта велізарная памылка. Прыйдзе час, і мы зноў вернемся да гэтага.

**«НН»: Стварэньне «Руху «За Свабоду» сябе апраўдала?**

**АМ:** «Рух «За Свабоду» — гэта не арганізацыя. Гэта аб’яднаньне ў дзеяньне — людзей, арганізацыяў, групаў, партыяў, грамадзкіх арганізацыяў. Мы нешта выпрацоўваем, робім, заклікаем людзей да нас далучацца на добраахвотных пачатках. Няхай людзі робяць тое, што могуць. Мы ня будзем прымушаць іх рабіць звыш нормы. Некаторыя кажуць, што з такой вольнасьцю нічога ня зробіш, але толькі так мы зможам сабраць найбольшую колькасьць людзей. Так працавала «Салідарнасьць» у Польшчы. Нам удалося зрэалізаваць шмат мясцовых праграмаў. Хачу ўзгадаць толькі абарону Горадні. Мы зрабілі ўсё магчымае, каб замарудзіць гэтае разбурэньне, надаць гэтаму ўсясьветнае значэньне.

**«НН»: «Рух «За Свабоду» можа ператварыцца ў палітычную партыю?**

**АМ**: Зараз руху ня варта станавіцца партыяй. Сёньня партыйнай дзейнасьці ў Беларусі, фактычна, няма. Форма змаганьня мае быць іншай, гэта даказвае досьвед ў краінах, дзе дэмакратыя дабівалася перамогі. Там вырашалі ўсё ня партыі, а шырокая аб’яднаная супольнасьць людзей. Я не выключаю, што «Рух «За Свабоду» таксама некалі ператворыцца ў партыю. Толькі адбудзецца гэта, калі ў краіне ўсталюецца дэмакратыя.

**«НН»: Міністар адукацыі Аляксандар Радзькоў адразу пасьля абраньня на старшынства ў «Белай Русі», заявіў, што гатовы да дыялёгу з апазыцыяй. А Вы самі гатовыя да такога дыялёгу?**

**АМ**: Улада нават згубіла нешта ад стварэньня «Белай Русі». Гэтая арганізацыя абсалютна эфэмэрная, якая стварaецца ня зьнізу, а зьверху. Але размаўляць можна. У лютым мой зварот да Лукашэнкі

Працяг на старонцы 12.

# Аляксандар Мілінкевіч: «Не дай Бог нам эканамічнага крызісу...»

Працяг са старонкі 11.

выклікаў вялікія спрэчкі. Некаторыя і сёньня лічаць, што я здрадзіў нейкім прынцыпам. Паўтаруся, калі вырашаецца лёс краіны і незалежнасьці, то з уладай можа быць кантакт. Сёньня палітычная анэксія краіны немагчымая, але эканамічная цалкам рэальная. Мы ня ведаем на выгадных ці не ўмовах Беларусь узяла крэдыт у Расеі, дзеля чаго ён патрэбны, куды будзе разьмяркоўвацца. Крэдыты можна браць, але трэба, каб гэта было адкрыта. Тая самая абсалютная непразрыстасьць і з продажам VELCOM. Гэта небясьпечна для будучыні краіны. Ня дай Бог нам эканамічнага крызісу ў краіне, бо падымацца з каленяў прыйдзецца ня толькі ўладзе, але і звычайным людзям. Такі крызіс зробіць краіну настолькі слабай, што яна можа згубіць незалежнасьць.

**«НН»: Палітычная цікавасьць да Беларусі з боку Эўропы, здаецца, зьнізілася. З чым гэта зьвязана?**

**АМ**: Эўропа б вельмі хацела пазбавіцца беларускага аўтарытарызму. Беларусь сёньня нестабільны і непрадказальны партнэр. Яны чакаюць, што тут адбудуцца зьмены, верацъ у гэта, а пасьля расчароўваюцца і чакаюць. Наколькі доўгім будзе спад, залежыць толькі ад нас і ад нашай актыўнасьці.

**«НН»: Якія яшчэ задачы Вы будзе вырашаць у 2008 годзе?**

**АМ**: Наступны год — год выбараў у парлямэнт. Аднак, ня трэба ўсім сканцэнтравацца на гэтай кампаніі. Думаю, што галоўнай задачай будзе не згубіць тых людзей, якія да нас ужо прыйшлі, а таксама знайсьці новых. Нас цешыць, што ў дэмакратычны рух прыходзіць шмат вернікаў. Нам неабходна аб'яднаньне. Ня нейкія дэклярацыі, а тое аб'яднаньне, якое зможа каардынаваць усю нашу працу. Я сам у наступным годзе пачну максымальна шмат езьдзіць па краіне — гэта найбольшае, што я магу зрабіць сёньня. Калі наступныя прэзыдэнцкія выбары зноў будуць адбывацца ва ўмовах дыктатуры, то адзіны кандыдат проста неабходны. Здаецца, што хутка нам давядзецца зь ім вызначацца.

**«НН»: А самі думаеце ўдзельнічаць у наступных прэзыдэнцкіх выбарах?**

**АМ**: Думаю. І буду ўдзельнічаць, нікуды не зьбягу. Буду працаваць, як і раней. Калі знойдзецца кандыдат з нацыянальнымі поглядамі лепшы за мяне, то я ніколі ня буду яму перашкаджаць, згаджуся ўсім дапамагаць. Важна працаваць. Час усё пакажа.

**«НН»: Як Вы будзеце сьвяткаваць Каляды і Новы год?**

**АМ**: У нас ужо ёсьць невялікая традыцыя. На Каляды мы з жонкай едзем у Польшчу, дзе вучацца нашы дзеці. Паедзем ва Ўроцлаў, дзе і будзем сьвяткаваць у сямейным коле Божае Нараджэньне. Новы год — у Берштах, у нашай хаце. Гэта таксама традыцыя.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

## ЗДЫМКІ ГОДУ




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**«Эўрапейскі марш» прайшоў мірна і шматлюдна.**

## АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ

ДЖЫНГЛ БЭЛЗ

Калі сымпатычны атрамант неба зазьзяе сьвяточным надпісам,
калі фігурыстка-зіма размалюе вокны галяндзкім сьцізорыкам, —
на кожнай ялінцы запаліцца Бібліятэка й запахне канабісам
да самых вышыняў, і весела-весела зробіцца зоркам.

Агні на ялінках падсьвечваюць апошнія ночы сьнежня.
З апошнім ударам курантаў замежныя скончацца візы.
Але ты сёньня ў гуморы, і робіцца нават сьмешна,
як Ірад рыхтуе свой хор да дзіцячае Эўравізіі.

Сьнягурка-мулатка сьпявае калядкі, як Джэніфэр Лопэс,
і сьнег падазрона кладзецца дарожкамі ёй на дрэды.
А Дзеду-Марозу ўсё роўна: яму падабаецца хлопец,
у беларускім садку на ранішніку сустрэты.

А ў небе ўсё весялей, і добра сьледам за зоркаю
з бутэлькай «Тры каралі» па сьвецеісьці паломніку.
Сьняжынкі — як лёд у шклянцы: глыток — і адразу торкае,
і, тонучы ў гэтым express кактэйлі, хапаесься за саломінку.

І нехта заняты гатоўкай ці ў краме разьвітваецца з гатоўкай,
і нехта ў зімовым футры ў чужой заначуе ваньне.
А сьвяты разгортваюць сьвет каляднай паштоўкай
і бэтлеемскай асадкай пішуць табе віншаваньне.

І зноўку бяжыш дадому, і сэрца, як колісь, ные,
і сьлёзы, як некалі, замярзаюць у куточках вачэй.
І Новы год набліжаецца, як гопнік з паліфаніяй,
і — звон зьвініць, звон зьвініць, звон зьвініць грамчэй!

## ЗДЫМКІ ГОДУ



PHOTO.BY.MEDIA.NET

**У Менску адчыніўся гатэль «Эўропа».**

# Данайскія дары

Ці хопіць нам сілаў і ведаў, каб выстаяла беларуская Троя? Піша **Віталь Тарас**.

У пярэдадзень Калядаў і навагодніх сьвятаў зусім ня хочацца думаць пра сумнае. А тым больш пра палітыку. Але што рабіць, калі не даюць спакою кепскія прадчуваньні. Можа, прычына — ва ўспамінах пра недалёкае мінулае?

25 сьнежня 1998 году прэзыдэнты Беларусі і Расеі падпісваюць Дэклярацыю пра «далейшае яднаньне дзьвюх краінаў».

8 сьнежня 1999 году (на гадавіну Белавескіх пагадненьняў) Ельцын і Лукашэнка падпісваюць у Крамлі Дамову пра стварэньне саюзнай дзяржавы Беларусі й Расеі.

31 сьнежня 1999 году Барыс Ельцын абвяшчае пра сваю адстаўку з пасады прэзыдэнта Расейскай Фэдэрацыі. Улада пераходзіць у рукі Ўладзімера Пуціна.

31 сьнежня 2006 году з боем курантаў у Маскве падпісваюцца пагадненьні паміж РБ і «Газпромам» пра пастаўкі расейскага газу ў Беларусь па цане 100 даляраў за кубамэтар.

Сёлета ніякіх перамоваў пад Новы год не плянуецца. І эпахальных заяваў, можна спадзявацца, таксама ня будзе. Больш за тое, Расея паднесла Беларусі навагодні падарунак — крэдыт паўтара мільярда даляраў. І прапануе яшчэ. Што й трывожыць.

Але пра гэта — крыху ніжэй.

## Hasta la Vista

У мінулую сераду легенда беларускага фолк-року гурт «Палац» заняў трэцяе месца па выніках галасаваньня ў паўфінале адборачнага конкурсу, пераможца якога паедзе на конкурс «Эўрабачаньне»-2008. Рок-гурт сабраў у той вечар 2438 галасоў. Гэта куды больш, чым сакральная лічба «дэструктыўных элемэнтаў», названая старшынём КДБ Жадобіным, — 1767.

Але адзіны гурт, які сьпяваў на тым конкурсе па-беларуску, у фінал усё-такі не патрапіў.

Аўтару гэтых радкоў давялося на свае вочы бачыць, як за беларускіх музыкаў перажывалі й галасавалі ў яго дома. Перажываў і сам аўтар, што для яго ў такіх выпадках не характэрна. Можна не сумнявацца, што гэтаксама за «Палац» перажывалі ў той вечар у сотнях іншых дамоў па ўсёй Беларусі… Але ўсё дарэмна.

Алег Хаменка з партнэрамі нібыта атрымалі галасоў значна менш, чым Руслан Аляхно (звыш 6 тысячаў за кампазыцыю «Hasta la Vista») і Litesound (амаль 4-ы тысячы). Як вядома, паводле рашэньня журы, разам зь імі ў фінал былі дапушчаныя таксама Гюнэш (якая набрала на 21 голас менш за «Палац») і гурт «По глазам» (420 галасоў).

Думаецца, што вынікам гэтага галасаваньня гледачоў можна давяраць больш, чым вынікам галасаваньня на выбарах. Наўрад ці тут былі падтасоўкі. Цяжка ўявіць, каб журы на чале з шаноўным Міхалам Фінбергам атрымала загад з прэзыдэнцкай адміністрацыі: «Палац» з паўфіналу не выпускаць. Але — на шчасьце ці няшчасьце для «Палацу» — гэтага не адбылося, і на «Эўрабачаньне» ён не паедзе.

Можна было б паразважаць, а дзеля чаго жывым клясыкам беларускай фолк-рок-музыкі патрэбны быў удзел у конкурсе папсы? Але ж пра беларускіх рокераў і пра славуты іхны паход да Праляскоўскага сказана, дальбог, дастаткова. Дадаць можна хіба адно — мала хто з удзельнікаў тае грамадзкае дыскусіі ўсьвядоміў, што справа не ў музыках — справа, найперш, у самой публіцы. Якая галасуе, напрыклад, за «девочку трёхтысячных лет».

Зразумела, аднаго выпадковага тэлегаласаваньня занадта мала, каб рабіць нейкія сур'ёзныя высновы. Яно, як сказалі б сацыёлягі, нерэпрэзэнтатыўнае і тычыцца, найперш, густаў глядацкае аўдыторыі ў Беларусі. Але, паклаўшы руку на сэрца, трэба прызнаць, што тыя дзьве з паловаю тысячы галасоў — гэта тое, што мы маем на сёньня.

## «…Timeo Danaos et dona ferentes!»*

Прызнацца, спачатку аўтару, як і некаторым ягоным калегам, здавалася, што значэньне візыту Пуціна перабольшваецца ў незалежных СМІ. Тое, што Канстытуцыйны акт саюзнай дзяржавы ў Менску не падпішуць, было зразумела, відаць, усім і адразу.

А вось сам візыт, усіх падрабязнасьцяў якога мы дагэтуль ня ведаем, пакінуў дваістае ўражаньне. Абодва ўдзельнікі саміту выглядалі аднолькава незадаволенымі і раздражнёнымі. Здавалася, аднак, што перамовы скончыліся большай няўдачай для Пуціна, чым для Лукашэнкі.

Але вось факт — расейскі крэдыт на 1,5 мільярда даляраў тэрмінам на 15 гадоў Беларусі пераказаны. І міністар фінансаў РФ Кудрын пры сустрэчы зь беларускім калегам Корбутам абяцае, што ў 2008 годзе РБ могуць вылучыць яшчэ 2 мільярды. Трэба было бачыць твар Мікалая Корбута, які яўна ня быў гатовы да падобнай шчодрасьці расейскага ўраду — прынамсі, ня меў на гэты выпадак адпаведных інструкцыяў.

Цяжка не пагадзіцца зь Вінцуком Вячоркам, які пракамэнтаваў вынікі перамоваў так: «І гэты паўтарамільярдны крэдыт, і анансаваныя Кудрыным наступствы азначаюць, што пятля на шыі беларускай эканомікі ўсё больш зацягваецца. Пасьля доўгага тармажэньня гэтай справы — прадстаўленьня Беларусі расейскіх крэдытаў — яна раптам пайшла вельмі лёгка. Адначасова мы атрымліваем з Наваполацку інфармацыю пра перадачу «Нафтану» ў рукі расейскага «Лукойлу»… Мы можам толькі ўявіць, якую страшную для беларускай незалежнасьці, для міру на нашай зямлі цану пагадзілася заплаціць Расеі цяперашняя ўлада за гэтыя срэбранікі».

Гэта кажа беларускі палітык, «зацяты нацыяналіст» — як сказалі б расейскія паліталягі альбо адмыслоўцы ў адміністрацыі Лукашэнкі.

А вось што гаворыць галоўны рэдактар радыёстанцыі «Эхо Москвы» Аляксей Венядзіктаў: «Трэба зразумець ступень няпрыязі Ўладзімера Пуціна да Аляксандра Лукашэнкі. Асабістай няпрыязі. Колькі разоў ён яго кідаў, я маю на ўвазе, Лукашэнка кідаў Пуціна. Колькі разоў ён абяцаў і не выконваў. Колькі разоў абяцаньні ішлі адносна газу і адзінай валюты і адносна сыстэмы энэргетычнай бясьпекі… Што трэба зрабіць з чалавекам, каб ён з такім партнэрам гаварыў сем гадзінаў сам-насам, без памочнікаў, не кажу ўжо — безь перакладчыкаў. Гэта значыць, гандаль датычыў іх будучыні, будучыні

* «…баюся данайцаў, якія прыносяць дары» (Вэргілій — *лац.*)

Аляксандра Лукашэнкі і будучыні Ўладзімера Пуціна. Думаю, што гэтая дамоўленасьць, хутчэй за ўсё, пакуль не завершылася, мяркуючы з усяго. Менавіта таму прэм'ер (згода Пуціна заняць пасаду прэм'ер-міністра ў выпадку, калі Мядзьведзеў будзе абраны новым прэзыдэнтам Расеі — **ВТ**) — запасны крок. Але думаю, што перамовы будуць працягнутыя на нечуваных умовах — тыя паўтара мільярда крэдыту, якія атрымлівае Лукашэнка, не Беларусь, заўважу я, але Лукашэнка…»

## Гэтае салодкае слова «anschluß»

Менавіта «Эхо Москвы», заўважым мы, першай выпусьціла ў этэр, са спасылкаю на сваю крыніцу «ў блізкім атачэньні Лукашэнкі», навіну пра тое, што на перамовах у Менску можа быць падпісанае пагадненьне, згодна зь якім Пуцін становіцца прэзыдэнтам саюзнай дзяржавы, а Лукашэнка ўзначальвае саюзны парлямэнт. А фактычна — становіцца разам зь Мядзьведзевым адным з двух віцэ-прэзыдэнтаў новай дзяржавы.

Але тое, што гаворыць рэдактар Венядзіктаў — гэта ўжо не спэкуляцыі, гэта ўжо развагі пост-фактум. Акт перадачы крэдыту Лукашэнку адбыўся. Яму абяцаюць яшчэ й новыя крэдыты. (Як тут не прыгадаць старажытную гісторыю з дарункам данайцаў. Пасьля дзесяці гадоў беспасьпяховай аблогі Трoі, Адысэй даў данайцам параду дзейнічаць падманам. Данайцы схаваліся ў вялікім драўляным кані, пакінутым на беразе мора, і калі траянцы завезьлі яго ў крэпасьць, лазутчыкі напалі на горад знутры.)

Венядзіктаў лічыць, што размова ідзе не пра саюз, а пра ўваходжаньне Беларусі ў склад Расеі. Меншае Пуціна не задаволіць.

Слова «аншлюс» ужывае ў перадачы Яўгенія Кісялёва «Ўлада» і палітоляг Вадзім Малкін: «Усе разумеюць, што Аляксандар Рыгоравіч ня вечны, для яго мэханізм пераемніцтва ўнутры ягонай сыстэмы значна больш складаны: куды большы ціск Захаду і замежнага сьвету на Беларусь. І шляхам такога збліжэньня з Аляксандрам Лукашэнкам можна ажыцьцявіць апэрацыю аншлюс, тым самым стварыць некалькі рабочых месцаў у Крамлі, назавем гэтак так».

Праўда, паводле Малкіна, гэты працэс не прывязаны да цяперашняга выбарчага працэсу ў Расеі і доўжыцца ў часе. Іншымі словамі — ён можа пачацца ў кожны момант, які Крэмль палічыць для сябе найбольш зручным.

Ускосна пра амбіцыі Пуціна гаворыць і ягонае інтэрвію часопісу «Тайм», які абвясьціў расейскага кіраўніка «чалавекам году». На пытаньне (інтэрвію было запісанае да паездкі яго ў Беларусь), ці можа ў пэрспэктыве зьмяніцца дзяржаўная канструкцыя Расеі за кошт Беларусі, Пуцін адказвае: «У пэрспэктыве ўсё магчыма».

Што найбольш трывожыць у сёньняшняй сытуацыі, дык гэта тое, што расейская інтэлектуальная эліта, выглядае, занепакоеная меркаванымі плянамі Крамлю, Пуціна ў дачыненьні Беларусі ці ня больш за беларускую апазыцыю.



У нецярплівасьці мы прагнем бачыць тое, што здаецца нам зрухамі да лепшага

Не, адных лёзунгаў — «Бацькаўшчына ў небясьпецы!» — недастаткова. Куды важней зразумець, адкуль непасрэдна зыходзіць небясьпека. Што можна ёй проціпаставіць? Які плян дзеяньняў можа прапанаваць апазыцыя?

І самае галоўнае, што рабіць, калі пераважная частка народу за чаркай і скваркай можа нават не заўважыць ніякага аншлюсу, бо ў тэлевізары будзе ўсё тое самае — тыя ж дыктары, тыя ж палітыкі, тыя ж «песьні пра галоўнае»?

## Складанасьці перакладу

Калі чытаеш водгукі на форумах, прысьвечаных тэме незалежнасьці на сайтах «Нашай Нівы», «Хартыі», некаторых іншых, ахоплівае дваістае адчуваньне. З аднаго боку, верыш у абсалютна шчырыя пачуцьці ўсіх гэтых хлопцаў і дзяўчатаў, гатовых, падобна да маладафронтаўцаў, ахвяраваць сабой дзеля Беларусі. А з другога боку — ці хопіць ім сілаў, ведаў, цярплівасьці для доўгай і ўпартай барацьбы. І ці ёсьць каму гэта ім растлумачыць?

Часам мы ў нецярплівасьці прагнем бачыць тое, што нам падаецца зрухамі да лепшага. Што БТ, нібыта, стала менш лаяць апазыцыю, што Лукашэнка павіншаваў Цімашэнку з прэм'ерствам, што зрэдку зьяўляюцца перадачы на беларускай мове, што недзе запісваюць гурт «Крама», што на транспарце гучаць абвесткі па-беларуску. А ў той самы час міліцыянты зьбіваюць да страсеньня мазгоў хлопца, які выйшаў на мітынг за незалежнасьць, іншаму хлопцу даюць яшчэ паўтара году калёніі, трэцяга судзяць у турме за адмову выдаць паплечнікаў. А ўсе разам, як казаў герой адной літаратурнай пародыі, мы простыя савецкія людзі. То бок, прабачце, грамадзяне незалежнай Беларусі.

А чаго ж мы хацелі? Колькі гадоў змагаўся Ольстэр, перш чым атрымаў у 2007-м свой легітымны парлямэнт, а значыць, і самакіраваньне? І гэта ў складзе Брытанскай імпэрыі — ня самай горшай у гісторыі… У нас ёсьць пакуль адна перавага перад Паўночнай Ірляндыяй. На тэрыторыі Беларусі няма акупацыйных войскаў. Але складанасьць — у іншым.

Наўрад ці варта апазыцыйным беларускім палітыкам выступаць з шапказакідальніцкімі заявамі: «Беларусь сваю незалежнасьць нікому ня здасьць, апазыцыя гэтага не дазволіць, нас мала, але мы ў цяльняшках і г. д.»

Успамінаюцца заявы напярэдадні прыезду Пуціна ў Менск пра тое, што ў справе незалежнасьці Беларусі яна, апазыцыя, не саступіць ні на крок. Справа ня ў тым, што на Кастрычніцкую плошчу тады выйшла зусім няшмат людзей. Адзін зь лідэраў, які заклікаў іх да пратэсту, дазволіў сабе ў той вечар да іх не прыйсьці. Чым бы ні кіраваўся лідэр, якія б важныя сустрэчы ці іншыя абставіны ні замянялі яму зьявіцца на плошчы, ён павінен ведаць: для моладзі, гатовай пратэставаць, гэта стала проста яшчэ адным прыкладам разыходжаньня паміж словам і справай. Сталеньне прыходзіць хутка.

Калі няма што супрацьпаставіць палітыцы ўладаў, калі людзі не разумеюць, дзеля чаго яны павінныя выходзіць на вуліцу, калі няма ўпэўненасьці, што іншыя пойдуць за табой — тады лепей ня клікаць людзей на барыкады. Больш сумленна было б заставацца дома і разам з большасьцю тэлегледачоў галасаваць, скажам, за Аляхно.

Як казаў Тэрмінатар: «Аста ля віста, бэйбі»!

# Кніга году 2007




## Павал Севярынец. Лісты зь лесу

Сёлета традыцыйны кніжны рэйтынг, які складае газэта пры дапамозе сваіх экспэртаў, вызначаецца пэўнай стракатасьцю. Вельмі мала кніг, якія ўзгадваюцца некалькімі экспэртамі адначасова — вынік забаронаў на распаўсюд, заняпаду сыстэмы кнігагандлю і адсутнасьці агульнанацыянальнае публічнае дыскусіі. Выключэньне складае кніга Паўла Севярынца «Лісты зь лесу», якая ў выніку і трапіла зь вельмі вялікім адрывам на першае месца.

Як заўжды, не шанцуе добрым кнігам, што выходзяць пры канцы году: яны не пасьпяваюць трапіць у поле зроку экспэртаў.

Цікава параўнаць рэйтынгі кнігагандляроў, якія адбіваюць чытацкі попыт, і рэйтынгі навукоўцаў ці крытыкаў, што адлюстроўваюць навуковую вартасьць або пануючыя густы і зацікаўленьні.

Дзяржаўныя выдавецтвы вытрымліваюць канкурэнцыю з прыватнымі.

Агулам жа ў сьпіс трапілі 82 кнігі. Зь іх, што вельмі прыемна для нас, 14 выданьняў з сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва», заснаванай у гонар 100-годзьдзя газэты.

Нагадаем, што за кожнае першае месца ў сьпісе экспэртаў налічваецца 10 балаў, другое — 9 і гэтак далей.

Варта ўспомніць, якія **кнігі перамагалі ў кніжных рэйтынгах «НН»** у мінулыя гады. Гэта былі:

2003 — Арлоў Уладзімер, Герасімовіч Зьміцер. Краіна Беларусь. — Менск: Салвія.

2004 — Пяткевіч Часлаў. Рэчыцкае Палесьсе. — Беларускі кнігазбор.

2005 — Геніюш Ларыса. Каб вы ведалі: з эпісталярнай спадчыны (1945—1983). — Лімарыюс.

2006 — Юры Туронак. Мадэрная гісторыя Беларусі. — Інстытут беларусістыкі, Вільня.

**А вось сьпіс топ-выдавецтваў-2008:**

Логвінаў (2 пазыцыі)

Інстытут беларусістыкі (1 пазыцыя)

Беларусь (1 пазыцыя)

Літаратура і мастацтва (1 пазыцыя)

Мастацкая літаратура (1 пазыцыя)

Беларуская энцыкляпэдыя (1 пазыцыя)

Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода (1 пазыцыя)

Лімарыюс (1 пазыцыя)

Хурсік (1 пазыцыя)

Трэба адзначыць яшчэ выдавецтва «Кнігазбор», выданьні якога таксама часта згадваліся экспэртамі.

**Такім чынам, сёлетні топ-10 выглядае так:**

**1. Севярынец П. Лісты зь лесу. — Вільня: Інстытут беларусістыкі — 54 балы**

**2. Арлоў У. Імёны Свабоды. — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода — 37 балаў**

**3. Вялікае Княства Літоўскае. Энцыкляпэдыя ў 2-х тамах. Т. 2. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя. — 29 балаў**

**4. Купрэеў М. Палеская элегія. Проза. — Менск: РУП «Літаратура і мастацтва» — 27 балаў**

**5. Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годзьдзя прафэсара Адама Мальдзіса. — Менск: Лімарыюс — 25 балаў**

**6. Быкаў В. Бліндаж. — Менск: Хурсік — 22 балы**

**7. Рублеўская Л. Шыпшына для пані. — Менск: Мастацкая літаратура — 22 балы**

**8. Акудовіч В. Код адсутнасьці. — Менск: Логвінаў — 20 балаў**

**9. Мінкін А. Пэнаты: паэзія. — Менск: Логвінаў. — 19 балаў**

**10. Бялявіна В., Ракава Л. Мужчынскі касьцюм на Беларусі. — Менск: Беларусь — 18 балаў**

**10. Токць С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX — першая траціна XX ст. — Менск: Тэхналёгія — 18 балаў**

**Сьпісы найлепшых кніг, складзеныя экспэртамі:**

**Кнігарня «Акадэмкніга», Менск**
1. Сыракомля У. Выбраныя творы. — Менск: Кнігазбор.
2. Луцкевіч А. Выбраныя творы. — Менск: Кнігазбор.
3. Бядуля З. Выбраныя творы. — Менск: Кнігазбор.
4. Сыс А. Выбраныя творы. — Менск: Кнігазбор.
5. Напалеон Орда: З фондаў Нацыянальнай бібліятэкі. Укладальнік Чаропка В.
6. Вялікае Княства Літоўскае. Энцыкляпэдыя ў 2-х тамах. Т. 2. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя.
7. Гісторыя беларускай літаратуры XI—XIX стагодзьдзяў. У 2-х тамах. Т. 2. — Менск: Беларуская навука.
8. Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годзьдзя прафэсара Адама Мальдзіса. — Лімарыюс.
9. Мальдзіс А. Выбранае. — Менск: Кнігазбор.
10. Минск. Книга жизни. Альбом. — Менск: Фабрыка каляровага друку.

**«Кнігарня пісьменьніка», Менск**
1. Шыбека З. Минскъ сто гадоў таму. — Менск: Беларусь.
2. Чаропка В. Уладары Вялікага Княства. — Менск: Беларусь.
3. Рублеўская Л. Шыпшына для пані. — Менск: Мастацкая літаратура.
4. Караткевіч У. Каласы пад сярпом тваім. — Менск: Мастацкая літаратура.
5. Залатая яблынька: Беларускія народныя казкі. — Менск: Мастацкая літаратура.
6. Блакітны скарб Беларусі. Энцыкляпэдыя. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя.
7. Вялікае Княства Літоўскае. Энцыкляпэдыя ў 2-х тамах. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя.
8. Масла А. Вандроўка з божымі кароўкамі. — Менск: Мастацкая літаратура.
9. Разанаў А. Дождж: возера ў акупунктуры. — Менск: Логвінаў.
10. Ліндгрэн А. Малы і Карлсан-з-даху. Пераклад Ю. Жалезкі. — Менск: З.Колас.
11. Гісторыя беларускай літаратуры XI—XIX стагодзьдзяў. У 2-х тамах. Т. 2. — Менск: Беларуская навука.

**Алесь Мазанік, кнігагандляр, «Кніжны кірмаш», Менск**
1. Квяткоўскі С. Фрашкі да пляшкі. — Менск.
2. Севярынец П. Лісты зь лесу. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
3.Найясьнейшая Рэч Паспалітая. — Менск: Логвінаў.
4. Катлярчук А. Швэды ў гісторыі і культуры Беларусі. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
5. Паветраны шар: беларускае мужчынскае апавяданьне. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
6. Керэт Э. Кіроўца аўтобуса, які хацеў стаць Богам. Пераклад П. Касьцюкевіча. — Менск: Логвінаў.
7. Глёбус Адам. Казкі. — Менск: Логвінаў.
8. Ліндгрэн А. Малы і Карлсан-з-даху. Пераклад Ю.Жалезкі. — Менск: З. Колас.
9. Старажытная беларуская літаратура. — Менск: Беларускі кнігазбор.
10. Мінскевіч С. Прыгоды Какоса Маракоса. — Менск: Медысонт.

**Алесь Асіпцоў, кнігараспаўсюднік, Магілёў**
1. Арлоў У. Імёны Свабоды. — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
2. Плошча 19.03—25.03.2006, рэдактар С.Дубавец. — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
3. Ліндгрэн А. Малы і Карлсан-з-даху. Пераклад Ю.Жалезкі. — Менск: З.Колас.
4. Тарас Вал. На высьпе ўспамінаў. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
5. Рудкоўскі П. Паўстаньне Беларусі. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
6. Мудроў В. Альбом Сямейны. — Радыё свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
7. Дынько А., Скурко А. Беларусь за 10 падарожжаў. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
8. Карпечанка М. Уздоўж стромы. — Менск: Хурсік.
9. Кудрыцкі А. Суд на каляды. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
10. Новікаў Я. Ваенная гісторыя беларускіх земляў да канца XII ст. — Менск: Логвінаў.

**Выстава на сядзібе БНФ, Менск**
1. Тарас Віт. Звыклае зло. Зборнік эсэ. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
2. Севярынец П. Лісты зь лесу. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
3. Краўчанка П. Беларусь на ростанях. Нататкі дыпляматa і палітыка. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
4. Катлярчук А. Швэды ў гісторыі і культуры Беларусі. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
5. Бабілёнская бібліятэка. Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы». — Менск: Логвінаў.
6. Паветраны шар: беларускае мужчынскае апавяданьне. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
7. Дынько А., Скурко А. Беларусь за 10 падарожжаў. Кніга падарожных эсэ. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
8. Найясьнейшая Рэч Паспалітая: Цывілізацыя—Культура—Рэлігія—Палітыка—Авантура—Героіка—Успамін. — Менск: Логвінаў.
9. Тарас Вал. На высьпе ўспамінаў. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.

**Віталь Скалабан, гісторык, архівіст**
1. Дарагастайскі В. Гіпіка, або Кніга пра коней. Уклад. С.Ішчанка, В.Дубоўскі. — Менск: Юніпак.
2. Карский Е. Белорусы, т. 1—5 (завяршэньне выданьня, нягледзячы на выдавецкія хібы). — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя.
3. Токць С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX — першая трэціна XX ст. — Менск: Тэхналёгія.
4. Купрэеў М. Палеская элегія. Проза. — Менск: РУП «Літаратура і мастацтва».
5. Рублеўская Л. Шыпшына для пані. — Менск: Мастацкая літаратура.
6. Бажэнава В. Радзівілаўскі Нясьвіж. — Менск: Харвест.
7. Далэнга-Ходакоўскі З. Выбранае. — Менск: Кнігазбор.
8. Старажытная беларуская літаратура. Уклад. Саверчанка І. — Менск: Кнігазбор.
9. Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годзьдзя прафэсара Адама Мальдзіса. — Менск: Лімарыюс.
10. Кірычэнка В. Менск 1960—1969. — Менск: Беларусь.

**Даніла Жукоўскі, публіцыст, крытык, Горадня**
1. Маракоў Л. Рэпрэсаваныя праваслаўныя сьвяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі 1917—1967. Энцыкляпэдычны даведнік у 2-х тамах. Т.1—.2. — Менск.
2. Севярынец П. Лісты зь лесу. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
3. Беларускі каляндар-даведнік на кожны дзень. Уклад. У.Хільмановіч — Вільня: Gudas.
4. Маракоў Л. Непамяркоўныя. Трэцяя спроба: апавяданьні. — Менск.

**Людміла Рублеўская, аглядальніца газэты «Советская Белоруссия»**
1. Купрэеў М. Палеская элегія. Проза. — Менск: РУП «Літаратура і мастацтва».
2. Быкаў В. Бліндаж. — Менск: Хурсік.
3. Бялявіна В., Ракава Л. Мужчынскі касьцюм на Беларусі. — Менск: Беларусь.
4. Акудовіч В. Код адсутнасьці. — Менск: Логвінаў.
5. Маракоў Л. Ахвяры і карнікі. — Менск.
6. Арлоў У. Імёны свабоды. — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
7. Мінкін А. Пэнаты: паэзія. — Менск: Логвінаў.
8. Дубавец С. Вершы. — Бібліятэка часопіса «Дзеяслоў».
9. Ермаловіч М. Яго чакала Беларусь чатыры стагодзьдзі. Зборнік дакумэнтаў і матэрыялаў да 85-годзьдзя з дня нараджэньня.
10. Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годзьдзя прафэсара Адама Мальдзіса. — Менск: Лімарыюс.

**Павал Абрамовіч, крытык**
1. Ахроменка У., Клімковіч М. Янкі, альбо Астатні наезд на Літве. — Менск: Медысонт.
2. Бабілёнская бібліятэка: Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы». — Менск: Логвінаў.
3. Бабіна Н. Крыві не павідна быць відна. — Менск: Логвінаў.
4. Белавокі А. Лесьвіца ў нябёсы з адной прыступкі. — Менск: Логвінаў.
5. Жанчыны выходзяць з-пад кантролю: беларускае жаночае апавяданьне. — Менск: Логвінаў.
6. Керэт Э. Кіроўца аўтобуса, які хацеў стаць Богам. Пераклад П. Касьцюкевіча. — Менск: Логвінаў.
7. Мудроў В. Альбом сямейны. — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
8. Паветраны шар: беларускае мужчынскае апавяданьне. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
9. Тарас Вал. На высьпе ўспамінаў. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
10. Хадановіч А. Сто лі100ў на tut.by: паэзія — Менск: Логвінаў.
(Усім — адзін бал)

**Алег Дзярновіч, гісторык**
1. Бялявіна В., Ракава Л. Мужчынскі касьцюм на Беларусі.— Менск: Беларусь.
2. Ленсу Я. Дзіўныя гісторыі пра знаёмыя рэчы. — Менск: Беларусь.
3. Севярынец, П. Лісты зь лесу. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
4. Арлоў, У. Імёны свабоды. — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
5. Маракоў, Л. Ахвяры і карнікі. У 3-х частках. — Менск.
6. Янушкевіч А. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558—1570 г.: Манаграфія.
7. Шыбека З. Минскъ сто гадоў таму. — Менск: Беларусь.
8. Бабілёнская бібліятэка: Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы». — Менск: Логвінаў.
9. Застаемся! Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.

10. Тарас Віт. Звыклае зло. Зборнік эсэ. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.

**Міхась Скобла, аглядальнік радыё «Свабода»**
**1.** Мілаш Ч. Іншага канца сьвету ня будзе: Выбраныя творы. — Калегіюм Усходняй Эўропы.
2. Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годзьдзя Адама Мальдзіса. — Менск: Лімарыюс.
3. Разанаў А. Дождж: возера ў акупунктуры: Пункціры. — Менск: Логвінаў.
4. Барадулін Р. Гуканьне паэзіі Ўсходу: Пазыкі. — Менск: Рымска-каталіцкая парафія сьвятых Сымона і Алены.
5. Гілевіч Н. Літаратурныя містыфікацыі: Паэмы (Збор твораў: том 5). — Менск: Наша будучыня.
6. Мінкін А. Пэнаты: паэзія. — Менск: Логвінаў.
7. Бабіна Н. Рыбін горад: раман. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007.
8. Кудравец А. За дальнім прычалам: Літаратурныя партрэты. — Менск: Медысонт.
9. Далэнга-Хадакоўскі З. Выбранае. — Менск: Кнігазбор.
10—12. Крушына Р. Кантата самотных: Вершы і паэты. — Менск: Кнігазбор; Купрэеў М. Палеская элегія: Проза. — Менск: РУП «Літаратура і мастацтва»; Адзінец А. Паваенная эміграцыя: скрыжаваньні лёсаў. — Менск: Медисонт.

**Леанід Галубовіч, аглядальнік тыднёвіка «Літаратура і мастацтва»**
1. Мінкін А. Пэнаты: паэзія. — Менск: Логвінаў.
2. Купрэеў М. Палеская элегія. Проза. — Менск: РУП «Літаратура і мастацтва».
3. Сіпакоў Я. Наталеньне смагі. — Менск: Чатыры чвэрці.
4. Мудроў В. Альбом сямейны. — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
5. Разанаў А. Дождж: возера ў акупунктуры. — Менск: Логвінаў.
6. Дубавец С. Вершы. — Бібліятэка часопіса «Дзеяслоў».
7. Катляроў І. Сначала жизнь. Потом судьба. — Менск: Кнігазбор.
8. Літаратура пераходнага пэрыяду: тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу. М. Тычына і іншыя (літаратуразнаўства). Выданьне НАН РБ.
9. Ваячак Р. «Мёртвы сэзон». Перакладчык з польскай В. Морт. — Менск: Логвінаў.
10. Маракоў Л. Толькі адна ноч. Ахвяры і карнікі. — Менск.

**Аляксандар Фядута, палітычны кансультант**
1. Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годзьдзя прафэсара Адама Мальдзіса. — Менск: Лімарыюс.
2. Севярынец П. Лісты зь лесу. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
3. Рублеўская Л. Шыпшына для пані. — Менск: Мастацкая літаратура.
4. Карскиц Е. Белорусы, т. 1—5. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя.
5. Гісторыя беларускай літаратуры. XI — XIX стст. У 2 т. — Менск: Беларуская навука.
6. «Старажытная беларуская літаратура. — Менск: Беларускі кнігазбор.
7. Баразна М. Беларускае мастацтва кнігі XX ст. — Менск: Беларусь.
8. Сільнова Л. Зачараваная краіна. — Менск: Лімарыюс.
9. Вялікае Княства Літоўскае. Энцыкляпэдыя ў 2-х тамах. Т. 2. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя.
10. Колас Я. Збор твораў, т.1—2. — Менск: Беларуская навука.

**Андрэй Вашкевіч, гісторык, Горадня**
1. Токць С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX — першая траціна XX ст. — Менск: Тэхналёгія.
2. Янушкевіч А. Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558—1570 гг.: Манаграфія.
3. Старажытная беларуская літаратура. — Менск: Беларускі кнігазбор.
4. Мілаш Ч. Іншага канца сьвету ня будзе: Выбраныя творы. — Калегіюм Усходняй Эўропы.
5. Танк М. Збор твораў. — Менск: Беларуская навука.
6. Грыбоўскі Ю. Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фармаваньнях 1918—1945 гг. — Санкт-Пецярбург: Невский проспект.
7. Сыс А. Выбраныя творы. — Менск: Кнігазбор.
8. Сыракомля У. Выбраныя творы. — Менск: Кнігазбор.
9. Іпатава В. Да апошняга дыханьня. — Менск: Кнігазбор.
10. Хадановіч А. Сто лі100ў на tut.by: паэзія. — Менск: Логвінаў.

**Валянціна Трыгубовіч, мастацтвазнаўца**
1. Севярынец П. Лісты зь лесу. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
2. Вялікае Княства Літоўскае. Энцыкляпэдыя ў 2-х тамах. Т.2. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя.
3. Акудовіч В. Код адсутнасьці. — Менск: Логвінаў.
4. Арлоў У. Імёны свабоды. — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
5. Быкаў В. Бліндаж. — Менск: Хурсік.
6. Разанаў А. Дождж: возера ў акупунктуры. — Менск: Логвінаў.
7. Маракоў Л. Рэпрэсаваныя праваслаўныя сьвяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі Беларусі 1917—1967. — Менск.
8. Рудкоўскі П. Паўстаньне Беларусі.— Вільня: Інстытут беларусістыкі.
9. Хадановіч А. Сто лі100ў на tut.by: паэзія — Менск: Логвінаў.
10—12. Тарас Вал. На высьпе ўспамінаў. — Вільня: Інстытут беларусістыкі; Беларускі каляндар-даведнік на кожны дзень. Уклад. У.Хільмановіч. — Вільня: Gudas; Застаемся! Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.

**Ганна Ягорава, сацыёляг**
1. Керэт Э. Кіроўца аўтобуса, які хацеў стаць Богам. Пераклад П.Касьцюкевіча. — Менск: Логвінаў.
2. Вялікае Княства Літоўскае. Энцыкляпэдыя ў 2-х тамах. — Менск: Беларуская энцыкляпэдыя.
3. Караткевіч У. Каласы пад сярпом тваім. — Менск: Мастацкая літаратура
4. Быкаў В. Бліндаж. — Менск: Хурсік.
5. Арлоў У. Імёны свабоды. — Радыё Свабодная Эўропа/Радыё Свабода.
6. Акудовіч В. Код адсутнасьці. — Менск: Логвінаў.
7. Глёбус А. Казкі. — Менск: Логвінаў.
8. Адзінец А. Паваенная эміграцыя: скрыжаваньні лёсаў. — Менск: Медысонт.
9. Дынько А., Скурко А. Беларусь за 10 падарожжаў. Кніга падарожных эсэ. — Вільня: Інстытут беларусістыкі.
10 Шыбека З. Минскъ сто гадоў таму. — Менск: Беларусь

**Рэдакцыя выказвае шчырую падзяку ўсім экспэртам!**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

### Якая кніга 2007 году найлепшая?

| | |
|---|---|
| Севярынец П. Лісты зь лесу | 124 (27.9%) |
| Арлоў У. Імёны Свабоды | 63 (14.2%) |
| Вялікае Княства Літоўскае. Энцыкляпэдыя | 123 (27.7%) |
| Купрэеў М. Палеская элегія | 5 (1.1%) |
| Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годзьдзя праф.Мальдзіса. | 20 (4.5%) |
| Быкаў В. Бліндаж | 26 (5.9%) |
| Рублеўская Л. Шыпшына для пані | 17 (3.8%) |
| Акудовіч В. Код адсутнасьці | 19 (4.3%) |
| Мінкін А. Пэнаты: паэзія | 3 (0.7%) |
| Бялявіна В., Ракава Л. Мужчынскі касьцюм на Беларусі | 2 (0.5%) |
| Токць С. Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX — першая траціна XX ст. | 22 (5.0%) |
| Шыбека З. Мінскъ сто гадоў таму | 12 (2.7%) |
| Паветраны шар: беларускае мужчынскае апавяданьне | 8 (1.8%) |

Усяго прагаласавала: 444

## СЯРГЕЙ ПРЫЛУЦКІ

VIGILIA

кожны сьнежань перад Калядамі
жыцьцё нібыта робіцца сьвятлейшым
быццам сьвяты Пётр прыадчыняе сваю браму
і райскія промні кранаюцца нашых твараў
і тады верталёты падаюцца ўкормленымі анёламі
што патрулююць паветраныя калідоры
а неба — бясконцым сюррэалістычным фільмам

але я заўсёды ў сябе пытаўся
нашто яны тыя Каляды і хто іх наогул чакае
нашто яны наркаманам — у іх свае каналы прасьвятленьня
нашто спартоўцам — у іх свой трэнэр і ім ня трэба другога
і нават для рэлігійных фанатыкаў гэта толькі
бясплатная рэкляма іхнай
сьвятой карпарацыі

бо пакуль сьвятар прамаўляе
не — пакуль сьвятар адпрацоўвае
свой новы BMW і месца ў райскай намэнклятуры
у гэты ж час
у якой-небудзь раённай лякарні
малады акушэр прымае роды
ў маладой прыгожай цыганкі
зьверху б'е ў вочы хірургічны сафіт
а вуліца поўніцца сабачым брэхам

і пакуль сьвятар мые рукі перад сьвяточным банкетам
дзяўчына ўцякае ў невядомым кірунку
у свой таямнічы табар
ніхто ня ведае яе імя
зрэшты гэта нікога і не хвалюе
потым па хлопчыка прыходзяць трое з КМБ —
Камітэту Мэнтальнай Бясьпекі
і забіраюць туды дзе яму
ніколі ня стаць мэсіям
яго чакае жыцьцё — густое як кроў і сухое як хлеб
і ў ім для яго толькі дзьве дарогі —
фрэзэроўшчыка 5 разраду
або фрэзэроўшчыка 6 разраду
і ня выжна што ён выбярэ
бо які тут на фіг выбар

ягонай бібліяй будзе стос порначасопісаў
а паствай сябры і проста пітушчыя незнаёмцы
мецьме палюцыі комплексы крызіс сярэдняга веку
клясычны набор клясычнага лузэра
і само па сабе гэта ня дзіўна але небясьпечна
бо аднойчы такіх як ён знаходзяць мёртвымі
з расхрыстанымі рукамі і нагамі
на бальконе, забруджаным галубамі

## ЗДЫМКІ ГОДУ



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Другі Кангрэс дэмакратычных сілаў стаў апафэозам перацягваньня каната ўнутры апазыцыі.**

# Год калыханак

## Падзея

Безумоўная падзея году — вяртаньні. Але зусім ня ў зьвязку зь візытам рокераў у Адміністрацыю. Сёлета свае новыя нумарныя альбомы прадставілі фактычна ўсе героі беларускага рок-фронту. «Штазі» ад «дзюбеляў» і «Капітал» ад «ляпісаў» чакалі тры гады, «06» ад «энэрэмаў» выйшаў празь пяць гадоў маўчаньня гурту, а дыск «Усё жыцьцё — дзіўны сон» ад «Крамы» — зьявіўся наагул праз шэсьць год пасьля апошняй новай праграмы. Калі тут згадаць яшчэ «Песьняроў» з альбомам «Распавядальная» — першым ад часоў Мулявіна, і «Песьню пра зубра» ВІА «Сузор'е», расфармаванага ў 1983 годзе, — дык, наагул, наталот 2007 году можна прызнаць рэкордным.

## Песьні

Песьня году самавызначылася яшчэ летась, калі ў былым гардэробе, а цяпер рок-кавярні на 50 месцаў пад назвай «Графіці», Лявон Вольскі ўпершыню прасьпяваў: «Дарагія мінчане і госьці сталіцы...» На наступным выступе N.R.M. гэтую песьню слухачы ўжо падпявалі зь ня меншым імпэтам, чым «Тры чарапахі». А ў студыйным варыянце «Менск і Мінск» выйшаў сёлета — і з ходу па-за канкурэнцыяй перамог у «Тузіне Гітоў» (песьню спампавалі больш за 20 000 чалавек!) і ўжо загучаў у дварах і пад'ездах. Яшчэ толькі прэзэнтуючы гэты твор, Вольскі прадказваў: «Мне напачатку падавалася, што песьня будзе ня ў звыклай рок-стылістыцы, а як зонг з п'есы Брэхта. Але калі ўзяліся за аранжаваньне, міжволі атрымалася гэткая трошкі дваравата рок-балада».

«Рэвалюцыя» скончылася, час сьпяваць «Калыханкі». Так можна ахарактарызаваць настрой іншых рок-гітоў 2007 году. «Таварыш Маўзэр» з жорсткай леташняй «Беларусь будзе вольнай» пераключыўся на ціхенькую акустычную баляду пад назвай «Калыханка», якая займела вялікі посьпех. Свой новы гіт берасьцейская «Сьцяна» таксама вырашыла назваць «Калыханкаю» (хоць паводле стылістыкі яна зусім далёкая ад калыханкі). А тут яшчэ Naka на чале з акторкаю расейскага драматычнага тэатру Настай Шпакоўскай запісалі першую ў сваёй кар'еры беларускамоўную песьню — і тую назвалі «BY», з прыпевам: «Баю-бай, засынай».

Галоўным жа небеларускамоўным беларускім гітом відавочна стаў «Капітал» з аднайменнага альбому «Ляпіса Трубяцкога». Якраз

## ЗДЫМКІ ГОДУ



**Вялікай надзеяй для беларускай культуры стаўся запуск тэлеканалу «Белсат». На фота: Лявон Вольскі на адкрыцьці каналу.**

## ЗДЫМКІ ГОДУ




**Фэстывалі беларускай музыкі, забароненыя ідэолягамі РБ, множацца па пэрымэтры межаў краіны, зьбіраючы тысячы маладых людзей. На фота: міжнародны музычны фэст « be 2gether» у Нарвілішках (Літва).**

згадаўся 1996 год, калі іхнае «Аў» ды «Пастушок» гучалі ня толькі з кожнага праса, але і з кожнага пыласосу, лядоўні ды электрапліты:). «Мой піяр-мэнэджэр — Карл Маркс», — цяпер гэтак модна падпісвацца на форумах.

### Праекты

Урэшце і па праве ў шэраг праектаў музычнага году можна ўключыць нешта афіцыйнае. Праект «Нашы песьні. Вэрсія 2007» тэлеканалу АНТ выйшаў сапраўды душэўным, крэатыўным і… нечаканым. Пацяганыя народныя песьні загучалі ў альтэрнатыўных аранжыроўках, набылі другое дыханьне поп-гіты 1980-х — пачатку 1990-х гадоў. Некаторыя з выканаўцаў зь беларускай тэлеабоймы дзякуючы гэтаму праекту наагул упершыню беларускае слова прамовілі. А да ўсяго генпрадусар АНТ Ягор Хрусталёў уключыў у сьпіс удзельнікаў, акрамя абрыдлых ужо твараў, — сьвежых, як для нашага ТБ, Зьмітра Вайцюшкевіча з Багдановічавай «Зоркай Вэнэрай» і «Краму» зь неўміручай «Стэфкай» на новы лад. На пытаньне, калі будзе Вольскі на тэлебачаньні, Хрусталёў толькі хітра ўсьміхаецца: «Усё можа быць».

Безумоўнай падзеяй можна назваць і праект натхнёных «Хатынскай аповесьцю» беларускіх прадусараў пад назвай «Хатынь:Tacet, Sed Loquitur» з удзелам францускіх, італьянскіх, расейскіх, вугорскіх і, вядома ж, беларускіх музыкаў. Гатычная музыка, індастрыэл ды эмбіэнт ці не ўпершыню загучалі ў нашым кантэксьце. Калі ад праслухоўваньня песьні — па скуры прабягаюць мурашкі, значыць, яе творца дасягнуў сваёй мэты. Калі ад праслухоўваньня ўсяго праекту апаноўвае душэўнае трымценьне — значыць, гэта праца Надзвычайная.

### Падзея-2

І ўсё ж вяртаньне. Абяцанкі-цацанкі прэзыдэнцкіх ідэолягаў пад Новы год нечакана пачалі спраўджвацца: так супала, што пасьля візыту ў Адміністрацыю «Палац» трапіў на «Эўрафэст» (чытай — у лік галоўных прэтэндэнтаў на паездку на «Эўрабачаньне»), зьявіўся калядны беларускамоўны праект на АНТ. Ды яшчэ сэрыя канцэртаў прайшла зь вялікім посьпехам — клюбныя залі ламіліся на «Краме», «Крамбамбулі», «Народным альбоме». Neuro Dubel вымушаны быў граць двойчы, бо ня ўсе ахвочыя здолелі трапіць на канцэрт. А ці тое яшчэ будзе? Толькі ў першыя тры месяцы наступнага году плянуецца рок-фэст пад умоўнай назвай «Вяртаньне» ў Палацы спорту, заўжды скандальная і заўжды прывабная «Рок-каранацыя», дабрачынная акцыя рокераў у Палацы рэспублікі, а тут яшчэ і «Белсат» з масай музычных праграмаў. Жыцьцё — дзіўны сон, сапраўды.

**Сяргей Будкін**

**Рэйтынг песень 2007 на сайце «Тузін Гітоў» (па колькасьці спампоўваньняў)**

**N.R.M.** Miensk i Minsk

**Osimira** Зязюля мыя серыя

**IQ48** Схаванае сэрца

**B:N:** Дажджамі

**Tav.Mauzer** Калыханка

**Band A** Рэвалюцыя

**Krama** Неба — лёс арла

**Zet** Love story — dont worry

**Рокаш** Крумкач

**Троіца** Ведзьма

**PitBull** Maju nadzieju

**Nestarы Band** Агні гараць

# Нацыя цяжкіх атлетаў

## Неадназначнасьць году: Бэрнд Штанге

У чэрвені зборная Беларусі па футболе двойчы бязвольна саступіла баўгарам у рамках адбору да чэмпіянату Эўропы. Гэтыя паразы пазбавілі нашых хлопцаў шанцаў трапіць на кантынэнтальнае першынства.

Галоўны трэнэр каманды Юры Пунтус ня стаў чакаць афіцыйнага звальненьня з пасады, а сам падаў у адстаўку. Пошукі новага настаўніка вяліся пераважна сярод замежных спэцыялістаў. Сярод патэнцыйных кандыдатаў называліся расейскія, нямецкія, чэскія, украінскія трэнэры.

Урэшце, выбар быў спынены на Бэрнду Штанге з усходняй часткі Нямеччыны. У свой час Штанге зьяўляўся супрацоўнікам «Штазі», даносячы на гульцоў каманд, якія ўзначальваў. Пэрсоне немца дадае адыёзнасьці й той факт, што ён трэніраваў зборную Іраку часоў Садама Хусэйна. Штанге заўсёды падкрэсьлівае, што футбол па-за палітыкай, таму не саромеецца сваёй былой працы.

Першы таварыскі матч каманда Штанге правяла з ізраільцянамі, дзе пры канцы сустрэчы перамагла — 2:1. Пасьля былі чатыры паразы запар. Апатэозам няўдачаў немца стаў хатні матч зь Люксэмбургам: 0:1. Аднак ужо наступныя сустрэчы істотна зьмянілі стаўленьне заўзятараў да Бэрнда Штанге. Спачатку ў Тыране нашыя хлопцы перамаглі альбанцаў, а пасьля ў Менску — галяндцаў. Гэтыя перамогі дазволі заняць у рэйтынгу ФІФА амаль рэкорднае 60-е месца, а Штанге спакойна рыхтавацца да наступнага адборачнага цыклю. Супернікі тамака, дарэчы, будуць ня самыя лёгкія — Англія, Харватыя, Украіна. Разам з тым, Штанге не здымае задачы выхаду на Чэмпіянат сьвету-2010.

Налета ўжо ёсьць дамоўленасьць на таварыскія гульні з моцнымі туркамі, немцамі і аргентынцамі (дома!). Напэўна, наступны год і вырашыць ролю Штанге ў беларускім футболе.

## Трыюмф году: бронза баскетбалістак

Беларускія баскетбалісткі ехалі ў Італію на чэмпіянат Эўропы абсалютнымі дэбютанткамі топ-спаборніцтваў. Мала хто верыў, што нашыя дзяўчаты пераадолеюць хаця б першы бар’ер. На справе ж аказалася нашмат лягчэй, чым чакалася.

Каманда без асаблівых праблемаў выйшла ў чвэрцьфінал, дзе іх суперніцамі сталі чэмпіёнкі кантынэнту з Чэхіі. Гульня атрымалася ня самай прыгожай, але напружанай. Толькі на апошніх хвілінах стала зразумела, што нэрвы ў беларусак мацнейшыя. У паўфінале мы прайгралі гішпанкам, але змаглі зачапіць бронзу ў сустрэчы з латышкамі.

Зборная Беларусі ня мае ярка выражанага лідэра, якая б у адзіночку магла цягнуць за сабой цэлую каманду. Беларускі аказаліся моцнымі камандным духам.

Упершыню ў гісторыі незалежнай Беларусі зборная ў гульнявым відзе спорту

## ЗДЫМКІ ГОДУ




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Беларускія баскетбалісткі сталі бронзавымі прызэркамі Чэмпіянату Эўропы.**

заваявала мэдаль на чэмпіянаце Эўропы ці сьвету. На Радзіме баскетбалістак сустракалі як сапраўдных пераможцаў. Нацыя хоча адчуць сябе камандай.

Налета ў траўні гэтая самая каманда ў Мадрыдзе пазмагаецца за выхад на пэкінскую Алімпіяду. А на днях стане вядома, ці будзе прызнаная Натальля Марчанка найлепшай баскетбалісткай Старога сьвету за 2007 год.

## Расчараваньне году: біятлён

Зборная Беларусі па біятлёне, якая здаўна прывучыла нас да перамог, перажывае найгоршыя часы ў сваёй гісторыі. Скончылі выступленьне за каманду вэтэраны, годнай маладой зьмены на іх месца не прыйшло, легіянэры, прывезеныя з Расеі, таксама аказаліся не высокай клясы.

Тры першыя этапы Кубку сьвету гэтага году пакінулі жахлівае ўражаньне. Пакуль перамогі штампавалі немцы, нарвэгі, расейцы, бралі мэдалі ўкраінцы, аўстрыйцы, швэды, беларусы змагаліся за 40—70 месцы, як у жанчынаў, так і ў мужчынаў.

У Кубку нацыяў нашы біятляністы цяпер займаюць рэкордна нізкія адзінаццатыя месцы. Ніякага прасьвету бліжэйшым часам таксама ня бачна. Прыклад біятлёну паказвае, да чаго можа прывесьці практыка масавага прывозу ў краіну другасных спартоўцаў з-за мяжы.

## Прагрэс году: цяжкая атлетыка

Затое зусім іншая карціна назіраецца ў цяжкай атлетыцы. Галоўны трэнэр каманды Віктар Ганчароў неаднаразова гаварыў, што посьпехі ягонай каманды найперш грунтуюцца на «нацыяналізьме». Зборная складзеная выключна зь беларускіх атлетаў, якіх граматна і мэтаскіравана вядуць да перамог з самага раньняга ўзросту.

Чэмпіянат сьвету ў Тайляндзе падарыў нам двух пераможцаў — магілёўца Андрэя Рыбакова і барысаўца Андрэя Арамнава. Рыбакоў выйграў першынства з сусьветным рэкордам у рыўку і рэкордам Эўропы паводле сумы двух практыкаваньняў.

19-гадовы Арамнаў — адкрыцьцё году. Ніхто не чакаў сёлета ад яго такіх удалых выступаў. Вучань Міхаіла Саладара ўпэўнена выйграў сусьветны чэмпіянат, апярэдзіўшы асноўнага канкурэнта аж на 12 кіляграмаў!

Менавіта на цяжкую атлетыку будзе рабіцца адна з галоўных ставак на Алімпіядзе-2008 у Пэкіне.

**Зьміцер Панкавец**

## ЗДЫМКІ ГОДУ



**Ці стане Хілары Клінтан першай прэзыдэнткай ЗША? Яна кінула выклік мужчынскаму сьвету амэрыканскай палітыкі, яе кандыдатура антаганізуе выбарцаў.**



AFP

**Хаос у Пакістане жахае палітычны сьвет: калі атамная зброя трапіць у рукі фанатыкаў, сьвету пагражае глябальная катастрофа.**

**ЗША працягвалі экспэрымэнт па прышчапленьні дэмакратыі ў ісламскім сьвеце. У 2007 годзе першыя посьпехі: лічба тэрактаў зьменшылася ў два разы. Іракцы вяртаюцца да мірных заняткаў.**



# 2008

## Студзень

**1** — Новы год.
**6** — Тры Каралі ў каталікоў, Вадохрышча ва ўніятаў.
**7** — Божае Нараджэньне ў праваслаўных.
**11** — Міжнародны дзень слова «дзякуй».
**19** — Вадохрышча ў праваслаўных.
**31** — 175 гадоў таму (1833) нарадзіўся Станіслаў Сільвестровіч (в. Гожа, Гарадзенскі р–н), удзельнік паўстаньня 1863—1864 гадоў, памёр у 1910.

## Люты

**2** — Грамніцы ў каталікоў, уніятаў.
**2** — 25 гадоў таму (1983) трагічна загінуў Мікола Прашковіч, дысыдэнт, літаратуразнаўца, перакладчык. Пахаваны на могілках у в. Асмолаўка Бярэзінскага р–ну.
**4** — 200 гадоў таму (1808) нарадзіўся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (фальварак Панюшкавічы, цяпер Бабруйскі р–н, пахаваны ў Люцінцы, Валожынскі раён), паэт, драматург, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры.
**4** — Міжнародны дзень абароны ад раку.
**6** — Папяльцовая серада ў каталікоў.
**10** — 125 гадоў таму (1883) нарадзіўся Станіслаў Булак-Балаховіч (маёнтак Мейшты, цяпер Браслаўскі раён), вайскова–палітычны дзяяч, кіраўнік паўстаньня супраць савецкай улады. Загінуў у верасьні 1939 г. пры абароне Варшавы.
**13** — 125 гадоў таму (1883) памёр нямецкі кампазытар Рыхард Вагнэр.
**14** — Дзень Сьвятога Валянціна.
**15** — Грамніцы ў праваслаўных.
**15** — 50 гадоў таму (1958) памёр Язэп Рэшаць, рэлігійны і культурны дзяяч, тэоляг, публіцыст. Нарадзіўся ў 1890 г.
**16** — 250 гадоў таму (1758) нарадзіўся Юльян Нямцэвіч (в.Скокі, цяпер Берасьцейскі раён), пісьменьнік, палітычны дзяяч, гісторык, удзельнік паўстаньня 1794 г.
**19** — 100 гадоў таму (1908) нарадзіўся Станіслаў Шушкевіч (в. Бакіна, цяпер Дзяржынскі р–н), літаратар, вязень савецкіх канцлягераў, бацька першага кіраўніка незалежнай Рэспублікі Беларусі.
**20** — Пурым у жыдоў.
**21** — Міжнародны дзень роднай мовы.

## Сакавік

**1** — 75 гадоў таму памёр Уладзімер Жылка, паэт (нарадзіўся ў 1900). Пахаваны ў г. Уржум (цяпер Ніжагародская вобл., Расея).
**3** — Міжнародны дзень пісьменьніка (заснаваны Міжнародным ПЭН–клюбам у 1986 годзе).
**14** — Сьвята лічбы Пі.
**15** — Дзень Канстытуцыі.
**17** — 200 гадоў таму (1808) нарадзіўся Шыман Канарскі (в. Дабкішкі, цяпер Падляскае ваяводзтва, Польшча), удзельнік паўстаньня 1830—1831 гадоў, дзяяч вызвольнага руху.
**20** — Дзень нараджэньня Прарока Мухамада.
**21** — 400 гадоў таму памёр Канстанцін Васіль Астроскі, палітычны, вайсковы і культурны дзяяч Вялікага Княства Літоўскага, праваслаўны магнат, які задушыў паўстаньне Налівайкі.
**23** — Вялікдзень у каталікоў, уніятаў, пратэстантаў




Студзень | Люты | Сакавік

**24** — Сьвяты Ян у каталікоў, уніятаў.
**29** — 50 гадоў таму (1958) у Вільні памёр Фабіян Ярэміч, беларускі пасол у польскім Сойме, грамадзка-культурны дзяяч.
**29** — Пятра і Паўла ў каталікоў, уніятаў.

## Ліпень

**7** — Сьвяты Іван у праваслаўных
**7** — 375 гадоў таму (1633) памёр Леў Сапега, дзяржаўны дзяяч Вялікага Княства Літоўскага, канцлер. Пахаваны ў крыпце касьцёла Сьв. Міхала (Вільня).
**12** — Пятра і Паўла ў праваслаўных.
**27** — Дзень прыняцьця Дэкларацыі пра незалежнасьць Рэспублікі Беларусі (1990).
**29** — 100 гадоў таму (1908) нарадзіўся Юрка Лявонны (сапр. Леанід Юркевіч; Чавусы), паэт. Расстраляны ў Курапатах увосень 1937 г.

## Жнівень

**2** — 175 гадоў таму (1833) у Горадні павешаны Міхаіл Валовіч, арганізатар нацыянальна–вызвольнага руху, удзельнік паўстаньня 1830—1831 гг.
**6** — Перамяненьне ў каталікоў, Спас ва ўніятаў
**14** — 50 гадоў таму (1958) памёр Эдзюк Будзька, беларускі грамадзкі і палітычны дзяяч. Пахаваны на могілках Сьв. Вайцеха ў Чыкага (ЗША)
**15** — Спленьне ў каталікоў, уніятаў.
**19** — Спас у праваслаўных.
**28** — Спленьне (Прачыстая) у праваслаўных.
**15** — 150 гадоў таму (1858) нарадзіўся Міхаіл Пліс (Гарадзенская губ.), грамадзкі дзяяч, праваслаўны сьвятар.

## Верасень

**2** — Пачатак Рамазану ў мусульманаў.
**8** — Дзень вайсковай славы Беларусі.
**8** — Міжнародны дзень салідарнасьці журналістаў.
**12** — 75 гадоў таму (1933) памёр Антон Камінскі, мастак.
**21** — Міжнародны дзень міру.
**28** — Міжнародны дзень глухіх.
**30** — Міжнародны дзень перакладчыка.
**30** — Рош Ашонэ (Новы год) у жыдоў.

## Кастрычнік

**1** — Канец Рамазану.
**1** — Міжнародны дзень людзей сталага веку.
**1** — Міжнародны дзень музыкі.
**1** — Пакроў ва ўніятаў.
**5** — 550 гадоў таму (1458) нарадзіўся сьвяты Казімір, сын вялікага князя літоўскага Казіміра IV Ягайлавіча, патрон Гарадзенскага біскупства.
**6** — 100 гадоў таму (1908) нарадзіўся Алесь Мілюць (в. Скорычы, цяпер Карэліцкі раён), паэт.
**10** — 225 гадоў таму (1783) памёр Людвік Грыньцэвіч, архітэктар эпохі позьняга барока.
**14** — Пакроў у праваслаўных.
**15** — 175 гадоў таму (1833) у Флярэнцыі памёр Міхал Клеафас Агінскі, дзяржаўны дзяяч Рэчы Паспалітай, кампазытар, удзельнік паўстаньня 1794 г.
**25** — 25 гадоў таму (1983) памёр Марыян Пецюкевіч, дзяяч заходнебеларускага нацыянальнага руху, этно–

25 — Дзень Волі. 90-годзьдзе абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.
25 — Дабравешчаньне ў каталікоў, уніятаў.
27 — Міжнародны дзень тэатру.

## Красавік

1 — Дзень сьмеху
2 — 75 гадоў таму (1933) нарадзіўся Віктар Шымук (в. Зьмяёўка, цяпер Дзятлаўскі раён), пісьменьнік, перакладчык.
3 — 225 гадоў таму (1783) нарадзіўся Ўошынгтан Ірвінг, амэрыканскі пісьменьнік.
7 — 25 гадоў таму (1983) памерла Ларыса Геніюш, паэтка, дзяячка Беларускай Народнай Рэспублікі, якая так і не прыняла савецкага грамадзянства. Пахаваная ў Зэльве.
20 — Пэсах у жыдоў.
26 — Дзень Чарнобыльскай трагедыі
26 — 125 гадоў таму (1883) у Варшаве памёр Напалеон Орда, мастак, кампазытар, удзельнік паўстаньня 1830—1831 г г.
27 — Вялікдзень у праваслаўных.
28 — 125 гадоў таму (1883) у Маскве скончыў жыцьцё самагубствам Уладзімер Кавалеўскі, прыродазнаўца, заснавальнік эвалюцыйнай палеанталёгіі, удзельнік паўстаньня 1863—1864 г.

## Травень

1 — Сьвята Працы
3 — Міжнародны дзень свабоды друку.
6 — Радуніца.
8 — 125 гадоў таму (1883) нарадзіўся Сьцяпан Некрашэвіч (в. Данілаўка, цяпер Сьветлагорскі раён), мовазнаўца, грамадзкі дзяяч, адзін з бацькоў-заснавальнікаў сучаснай беларускай дзяржаўнасьці.
9 — Дзень перамогі над фашызмам.
9 — Дзень Эўропы.
10 — 125 гадоў таму (1883) нарадзіўся Янка Маўр (сапр. Іван Фёдараў; Лібава, цяпер Ліепая, Латвія), пісьменьнік, перакладчык, адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры.
11 — Тройца ў каталікоў, уніятаў.
21 — 25 гадоў таму (1983) памёр мітрапаліт Андрэй (Аляксандар Крыт), рэлігійны дзяяч эміграцыі.
29 — 75 гадоў таму (1933) нарадзіўся пісьменьнік Мікола Гайдук (в. Кабылянка, цяпер Беластоцкі павет Падляскага ваяв., Польшча).
31 — Дзень народзінаў Буды (563 год да н.э.).

## Чэрвень

1 — Міжнародны дзень абароны дзяцей.
3 — 125 гадоў таму (1883) нарадзіўся пісьменьнік Франц Кафка (памёр у 1924).
8 — 50 гадоў таму (1958) у Беластоку заснаванае беларускае літаратурнае аб'яднаньне «Белавежа».
15 — Тройца ў праваслаўных.
22 — 125 гадоў таму (1883) у Берасьці нарадзіўся Аляксандар Цьвікевіч, палітычны дзяяч, гісторык.
22 — 5 гадоў таму (2003) у шпіталі ў Бараўлянах памёр Васіль Быкаў, народны пісьменьнік Беларусі. Пахаваны на Ўсходніх могілках у Менску.
23 — Купальле

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

## Красавік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

## Травень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

## Чэрвень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | | | | | | |

## Ліпень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

## Жнівень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

## Верасень

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | | | | | |

## Кастрычнік

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

## Лістапад

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |

## Сьнежань

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

граф.
30 — 125 гадоў таму (1883) нарадзіўся Янка Быліна (сапр. Ян Семашкевіч; в. Лакцяны, цяпер Астравецкі раён), каталіцкі сьвятар, пісьменьнік.
31 — Гэлоўін.

## Лістапад

1 — Сьвята Ўсіх Сьвятых у каталікоў.
1 — 75 гадоў таму (1933) нарадзіўся Вячаслаў Адамчык (в.Варакомшчына, цяпер Дзятлаўскі раён), пісьменьнік.
2 — Дзяды.
3 — 25 гадоў таму (1983) памёр Антон Мартас (у манастве Апанас), архіяпіскап, гісторык Праваслаўнай царквы.
8 — 150 гадоў таму (1858) нарадзіўся Тадэвуш Урублеўскі, адвакат, грамадзкі дзяяч.
8 — 125 гадоў таму (1883) нарадзіўся Вацлаў Ластоўскі (маёнтак Калесьнікі, цяпер Глыбоцкі раён), грамадзка-палітычны дзяяч, гісторык, мовазнаўца, літаратуразнаўца, публіцыст, этнограф.
14 — 75 гадоў таму (1933) нарадзіўся Леанід Пракопчык (Менск), краязнаўца.
16 — Дзень Маці Божай Вастрабрамскай — апякункі Беларусі
18 — 125 гадоў таму (1883) нарадзіўся Язэп Лёсік (в. Мікалаеўшчына, цяпер Стаўпецкі раён), грамадзка-палітычны дзяяч, мовазнаўца.
28 — Пачатак Піліпаўкі (посту перад Божым Нараджэньнем у праваслаўных).

## Сьнежань

1 — Дзень абароны ад СНІДу.
10 — Дзень правоў чалавека.
17 — Дзень беларускага кіно.
22 — Ханука ў жыдоў.
23 — 225 гадоў таму (1783) нарадзіўся Стэндаль, францускі пісьменьнік.
25 — Божае Нараджэньне ў каталікоў, уніятаў, пратэстантаў.
27 — 375 гадоў таму (1633) памёр Мялеці Смятрыцкі, царкоўны, грамадзка-палітычны дзяяч, пісьменьнік-палеміст (пахаваны ў сяле Дзермань, цяпер Ровенская вобл., Украіна).

## Юбілеі 2008 году

**225** гадоў таму (1783) ЗША атрымалі незалежнасьць ад Брытаніі.
**150** гадоў таму (1858) упершыню агучаная тэорыя эвалюцыі Дарвіна (1 ліпеня).
**100** гадоў таму (1908) упершыню жанчыны ўзялі ўдзел у сучасных Алімпійскіх гульнях (13 чэрвеня).

## Сумныя юбілеі 2008 году

**300** гадоў таму (1708) падчас Паўночнай вайны расейскае войска разрабавала і спустошыла Горадню.
**300** гадоў таму (1708) на загад расейскага цара Пятра І спалены Магілёў.
**75** гадоў таму Райхстаг прыняў закон, які прызнаваў Гітлера фюрэрам.

## Падпішыся на прэмію

**У Барысаўскім дзяржаўным політэхнічным каледжы завяршаецца этап прымусовай падпіскі на дзяржаўныя СМІ.**

Колькі год запар «падпісная кампанія» ў гэтай дзяржаўнай установе мяне пасьпяхова абмінала. Дзе мог — даваў пара-ды, як пазьбегнуць прымусовай падпіскі, дзе — проста спачуваў. Але цяпер сытуацыя кранула і мяне. Я застаўся перад выбарам: альбо прынцыпова адстойваць пазыцыю, альбо здацца. Канечне, здавалася б, як проста сказаць «не», гледзячы ў вочы ідэолягу. Спыняе толькі адна акалічнасьць — гэта магу зрабіць толькі я адзін, астатнія прамаўчаць і заплацяць са свайго мізэрнага заробку дадаткова й маю суму…

Абсурднасьць сытуацыі палягае яшчэ й у тым, што адзін чалавек вымушаны здаваць грошы на газэту некалькі разоў: як сябар цыклявой камісіі плюс як просты служачы ў межах аднаго з падразьдзяленьняў каледжу. Да таго ж гэтыя выданьні выпісваюцца яшчэ й іхнымі сваякамі.

Лідуючыя пазыцыі па падпісцы займае, вядома ж, «СБ». Для «бедных» падразьдзяленьняў існуе дэмакратычны выбар: «СБ», мясцовае «Адзінства», «Звязда» і яшчэ парачка газэтак таньнейшых. Для выкладчыкаў таксама прадугледжаная магчымасьць прымусова падпісацца на «Настаўніцкую газэту». І гэта пры тым, што пералічаныя выданьні можна свабодна ўзяць у каледжнай бібліятэцы (пры гэтым самі бібліятэкары прымусу таксама ня ўніклі).

Усе абураюцца, але далей за ціхае абмеркаваньне сярод «сваіх» справа не заходзіць: «усё роўна праўды не даб'емся, ды, крый божа, яшчэ ў няласку да начальства патрапім». Начальства быццам бы таксама ні пры чым: «Нас таксама прымушаюць, даюць лічбы згары, круціся як хочаш, чуецца ад іх. Застаецца ім толькі ціха паспачуваць…

**Антось Памяркоўны, Барысаў**

## Замест аптэк — крамы садавіны і гародніны

**Апошнім часам мэдыкі ўздымаюць вэрхал: «Насельніцтва старэе! Растуць захворваньні. Народ вымірае!»**

А чаму ён больш старэе, хварэе і вымірае? Ды таму, што харчуецца абы-чым і лякуецца абы-як! А гэта ўжо — непасрэдная віна тых самых афіцыйных мэдыкаў. Самі гавораць, што ўсе лекі — атрута, і выпісваюць цэлыя вазкі тых лекаў.

Мала таго, што людзі і так зьнясіленыя хваробамі, дык гэтыя мэдыкі толькі дапамагаюць ім хутчэй сысьці ў труну. А з гэтага вынікае, што, адкрываючы новыя аптэкі для афіцыйных мэдыкаў, нашае гарадзкое кіраўніцтва спрыяе далейшаму атручаньню гараджанаў.

Тое ж і зь ежай. Вы паглядзіце толькі, што робіцца ў гастраномах! Колькі там розных бутэлечак, фляკончыкаў, пакецікаў, мяшэчкаў, скрыначак! І ва ўсіх гэтых пакуначках — суцэльная хімічная прадукцыя, праз якую і зьяўляюцца шматлікія алергіі і ўсялякія іншыя прыкрасьці.

Чым далейшыя мы ад прыроды, тым болей хваробаў.

Чаму нашыя народныя лекары-траўнікі — слынныя? Таму што яны лякуюць толькі натуральнымі сродкамі, тым, што вырасла ў натуральных умовах на лугах і ўзгорках, у лясах і на палянах. Але дзе ж ты набярэсься ўсіх гэтых чабораў, валяр'янаў, кацiных лапак, ад якіх яшчэ нядаўна жаўцелі ўсе пагоркі? Усё скошана, выдрана, вытаптана, занесена ў Чырвоную кнігу. Ды і, па шчырасьці, ня надта прыемныя стравы зь іх выпрабляюць.

Але выйсьце ёсьць!

Ужо колькі пісана-перапісана, гаворана-перагаворана пра крыніцы вітамінаў і іншых гаючых рэчываў — яблыкі і грушы, ягады, бульбу, моркву, цыбулю і іншую гародніну. Між іншага, у іх тыя ж самыя карысныя рэчывы, што і ў травах.

Дарэчы, адзінае, у чым трэба пагадзіцца з афіцыйнымі мэдыкамі, дык гэта з пажаданьнем, каб лекі былі ежай, а ежа — лекамі. І чаму тады не спалучыць прыемнае з карысным?

Ня верце нікому, хто кажа, што няма панацэі! Ёсьць яна! І ня дзе-небудзь, а пад бокам! Гэта ня нейкія там рогі насарогаў ці жэньшэні, а звычайная гародніна. Недарма кітайцы гавораць: «Самы лепшы лек расьце каля твайго ганку».

Вось нядаўна прачытаў пра фасолю. Дык, выяўляецца, калі б мы яе кожны дзень ужывалі, мы б і зусім не хварэлі і мёрлі ў значна меншай ступені, чым цяпер.

Але дзе ўзяць тую ж фасолю і іншую гародніну? У мікраараёне, дзе я жыву, тры прадуктовыя крамы, дзьве аптэкі і ніводнай крамы гародніны! Дык адкуль будзе тое здароўе? Калі ў прадуктовых крамах яго яшчэ можна неяк падтрымаць, дык у аптэках згубіш апошняе.

Таму хачу ўзяць увагу мэра і іншых гарадзкіх чыноўнікаў на гэтую акалічнасьць. Замест таго, каб канстатаваць факты і лямантаваць пра пагаршэньне здароўе гараджанаў, трэба палепшыць забесьпячэньне насельніцтва гароднінай. А дзеля гэтага ня трэба вялікіх фінансавых выдаткаў і нічога асабліваго ня трэба рабіць: дастаткова толькі павялічыць дастаўку гародніны.

**Генадзь Шэршань, Менск**

## Вігілійнае спатканьне беларусаў у Пазнані

**Увечары 18 сьнежня ў сэмінарыі Таварыства Хрыстовага ў Познані адбылося спатканьне беларусаў і тых, каму справы нашай краіны неабыякавыя, пры сьвяточным стале.** Спатканьне арганізавалі клерыкі зь Беларусі, якія вучацца ў Познані.

Прыйшлі каля дваццаці чалавек , у тым ліку рэктар Вышэйшай духоўнай сэмінарыі Таварыства Хрыстовага, Старшыня культурна-асветніцкага цэнтру ў Познані. Адным з галоўных дзеяньняў вігілійнага спатканьня была малітва за Беларусь.

## Ідэйная пошта

**У суботу, 15 сьнежня, я згадаў, што трэба падпісацца на газэты й часопісы.** Схадзіў у 117-е аддзяленьне сувязі, узяў некалькі адпаведных бланкаў, выразаў з газэтаў «Народная Воля» і «Новы Час» іхныя бланкі. Запоўніў усе гэтыя паперы і зноў пайшоў у 117-е аддзяленьне.

Падпіску на «Звязду», «Наша Слова», квартальнік «Царква», а таксама на часопісы «ARCHE» і «Дзеяслоў» апэратарка прыняла без праблемаў. Праблема нарадзілася, калі я падаў ёй плацежныя дакумэнты на «Народную Волю», «Нашу Ніву» ды «Новы Час». Пабачыўшы, што гэта ня проста нейкі там плацеж (скажам, штраф за няправільны пераход вуліцы), а зноў-такі падпіска, і падпіска на выданьні, ня ўключаныя ў каталёг Белсаюздруку, апэратарка хутка падскочыла і пакрочыла ў глыбіню аддзяленьня, дзе сядзіць начальніца. Праз хвіліну яна вярнулася і адрапартавала: гэтыя плацяжы не прымаем.

Уласна кажучы, я падазраваў, што пошта ў Рэспубліцы Беларусі, як і ў час БССР, — установа ідэалягічная, але хацеў гэта праверыць. І праверыў. Атрымаўшы адмову ў 117-м аддзяленьні сувязі, я пайшоў у суседнюю ўстанову Беларусбанку. Там, дзякаваць Богу, яшчэ не адкідваюць грошай, якія ім прыносяць грамадзяне за «забароненыя» газэты.

**Сацыяліст**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

## УЛАДЗІМЕР ЛЯЛЬКОЎ

НАВАГОДНЯЕ СЛОВА

Нябачна, нячутна мінаюць стагодзьдзі,
Гады, як імгненьні, у бездань ляцяць…
Сягоньня са сьвятам у дзень навагодзьдзя
Дазволь мне, радзіма, цябе прывітаць.
Дазволь пажадаць, каб штандар бел–чырвоны
Ізноў зашугаў над бацькоўскай зямлёй,
Каб сымбаль крылаты сьвятое Пагоні
З вар'яцтвам і цемрай паклікаў на бой.
Душа не змарнела. Ня зьніклі надзеі,
Што ўжо недалёка ён — вольнасьці час.
Растануць сумёты, адыдуць завеі,
І сонейка зноўку засьвеціць у нас.
Радзіма! Я зьведаў усе твае болі.
Ад Чорнай бяды чуў трывожны набат.
Малюся, хрышчуся, каб болей ніколі
Магільных ня зьведала ты Курапат.
Каб болей ня сьлепла ад чаду і дыму,
Пагост не хапаў бы дачок і сыноў.
Нябесны айцец, ўратуй жа Айчыну
Укрый, зьберажы ад усіх Трасьцянцоў.
Нам сёньня нялёгка. Дубеюць ад сьцюжы
І рукі і сэрцы на воўчым вятру,
Ды ноччу ж часамі нам мрояцца ружы,
Усьмешкі на тварах зьнямоглых матуль.
Радзіма! Адной я табе прысягаю,
У шчырым каханьні табе я малюсь.
Сьцягі вызваленьня ад краю да краю
Зазьзяюць над небам тваім, Беларусь!



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Зэмбін. Бусьлянка на руінах касьцёлу XVIII ст.**

# Ад Рэдакцыі

**Працяг са старонкі 2.**

толькі ўдасца захаваць мінімальную акупнасьць. Сёньня ў вытворчасьці маем 7 наступных тамоў: рыхтуюцца да перавыданьня апошнія прыжыцьцёвыя кнігі Васіля Быкава «Сьцяна» і «Пахаджане», выдатныя празаікі Франц Сіўко і Ева Вежнавец публікуюць у нашай сэрыі свае зборнікі «Дзень бубна» і «Шлях дробнай сволачы». Алесь Белы рыхтуе кніжнае выданьне «Нашай стравы», што пабачыла сьвет на старонках газэты як адзін з амбітных ніўскіх праектаў. Гатовая да друку новая кніга Андрэя Хадановіча, а гісторык Алег Дзярновіч у працяг «Найясьнейшай Рэчы Паспалітай» рыхтуе зборнік пад працоўнай назвай «Вялікае Княства Літоўскае на старонках «НН».

Амаль цалкам разышліся наклады (1500 асобнікаў) дзьвюх іншых кніг: «Сто лі100ў на tut.by» нашага зоркавага Андрэя Хадановіча (засталося меней за 80 экз.) і «Застаемся! Сакавік 2006: прыватнае і агульнае» (засталося меней за 20 экз.).

«НН» выпусьціла таксама постэр з выявай Янкі Купалы і паспрыяла выданьню дыска «літаратуры ў запісе» Андрэя Хадановіча (у 2008 г. за ім сьледам маюць зьявіцца запісы Джэці і Жыбуля на кампактах) — прадпрыемствы камэрцыйна заведама складаныя, але важныя для засваеньня беларускай культурай новых магчымасьцяў і «асваеньня прасторы».

Цудоўныя фатографы «НН» другі год запар выдаюць каляндар. Рэдактараў асабліва цешаць тыя праекты, якія людзі рэалізуюць каля «НН» самастойна, асобна.

Наш асяродак дапамагаў музыкам і грамадзкім дзеячам, спрыяў кнігарам і дыскарам.

За год выйшла 10 нумароў (адзін зь іх здвоены) часопіса ARCHE, вакол якога гуртуюцца прадуктыўныя навуковыя сілы. Часовыя творчыя калектывы пры гэтым месячніку працягваюць шэраг фундамэнтальных праектаў. Рыхтуецца перавыданьне (папраўленае і дапоўненае) збору твораў гісторыка Юр'я Туронка, першы наклад якога амаль разышоўся. Рыхтуюцца зборы твораў інтэлектуала і грамадзкага дзеяча першай паловы XX ст. ксяндза Адама Станкевіча і літаратуразнаўцы Адама Бабарэкі — абодва былі зьнішчаныя савецкім рэжымам. Гэта тысячы і тысячы машынапісных старонак. Вы думаеце, над гэтым працуе, як калісьці ў савецкіх акадэмічных інстытутах, каманда зь дзясяткаў навуковых супрацоўнікаў, якія маюць вызначаны бюджэт? Не, гэта ў кожным з выпадкаў справа трох—чатырох энтузіястаў. Рэдакцыі ARCHE і «НН» дзеля агульнага прагрэсу бачаць сваю задачу, сваю функцыю ў пашырэньні аб'ёму і якасьці выпусканай прадукцыі, у захаваньні культуры мовы, моўнае традыцыі, і мы цешымся, калі адчуваем, што здольныя нешта рабіць лепей, чым раней. Кожны з нас ставіць перад сабой усё новыя задачы, каб кожны рубель, ахвяраваны Вамі, выкарыстоўваўся з максымальнай эфэктыўнасьцю, каб не марнавалася ні адна працоўная хвіліна, каб захоўваліся ўзятыя намі стандарты. Гэтую патрабавальнасьць мы процістаўляем рэгулярным забаронам на друк і распаўсюд, падступнай прапагандзе лукашэнкаўцаў.

Асабліва нас цешыць зьяўленьне ў нашым і сяброўскіх асяродках групы падрыхтаваных маладых эканамістаў і палітычных навукоўцаў — спэцыялістаў, на якіх у Беларусі 1990-х быў дэфіцыт.

Мы выходзім з 2007 году з адчуваньнем творчага росту, з пачуцьцем перамогі над страхам, што паўзе зь мінулага, і імунітэтам да сьляпога спажывецтва, якое спакушае зь вітрынаў.

Вялізны энтузіязм выклікае ўмацаваньне беларускай дзяржаўнасьці. Адна за адной ідэі, якія адкрывалі і адстойвалі «Наша Ніва», ARCHE, іх аўтары і чытачы, як кажуць, пранікаюць у масы, выклікаюць пераварот у мазгах, робяцца агульнапрынятымі спачатку ў грамадзянскай супольнасьці — у тым ядры, у якім высьпявае будучыня нацыі, а пасьля і ў дзяржаўным апараце. Няхай «варожыць гадзючнік варожы», няхай Жадобіны працягваюць мысьліць у катэгорыях даўно мінулых гадоў, новае разуменьне нацыянальных інтарэсаў і нацыянальнае супольнасьці вабяць і лучаць, пасьлядоўна набліжаючы час ператварэньня Беларусі з імпэрскай сатрапіі ў сапраўды незалежную нацыю. Газэты, сайт, часопісы, кнігі, дыскі, круглыя сталы і сустрэчы з чытачамі — гэта нашы вынікі году 2007, гэта наша з Вамі «рэч паспалітая», супольная справа.

* * *

У Калядным нумары мы традыцыйна падводзім вынікі году — палітычныя, гаспадарчыя, культурныя і проста людзкія.

Таксама мы друкуем нізку апавяданьняў, розных, усялякіх, каб вы маглі вырвацца зь сьвяточнага шаленства, якое часам робіцца нясьцерпным — усё больш падарункаў, больш шакаляду, больш прадуктаў, больш выкарыстаных рэсурсаў. Гэтае «больш» на вачах ператвараецца ў «менш». Меншае месца ў сэрцы займаюць тыя падарункі, меншую радасьць прыносяць слодычы, а раскошныя супольныя вячэры не даюць ачышчэньня. Чым часьцей мы мыем свае аўтамабілі, тым меней вады застаецца пад нашай зямлёй, а болей дэтэргентаў трапляе ў прыроду. Мы стаім перад патрэбай фундамэнтальнай зьмены эстэтычных і этычных крытэраў; дзякуй сучаснасьці хоць бы за ўсьведамленьне, наколькі мала чалавецтва ведае пра Бога. На гэтай высокай ноце сканчаем год 2007-ы «Нашай Нівы».

# Бар’еры

Піша Аляксандра Ліс.

Пад Барысавам ёсьць санаторый «Бярэзіна», дзе ўжо некалькі год запар праводзяцца летнікі для інвалідаў-калясачнікаў, так званыя «шведзкія зборы». Тут наноў вучаць жыць людзей, якія атрымалі складаныя траўмы сьпіны і ня могуць самастойна рухацца.

На жаль, выходзіць так, што людзі, якія трапілі ў такую сытуацыю, робяцца палоннымі сваіх кватэраў. Для іх невырашальнымі праблемамі могуць стаць рэчы, пра якія здаровыя людзі нават не задумваюцца: засьцяліць ложак, апрануцца, прыняць душ… Інваліду-вазочніку цяжка выйсьці на вуліцу, а калі ён туды трапляе, то перашкодай на ягоным шляху становіцца кожная прыступка.

Івану Кацегаву, арганізатару збораў у «Бярэзіне», 50 год, «стаж» калясачніка — 23 гады. Мае сям’ю, двух сыноў, жыве ў прыватным доме і сваім прыкладам паказвае, што чалавек у вазку можа весьці паўнавартаснае жыцьцё: касіць траву і сячы дровы, кіраваць машынай і падарожнічаць.

Ужо дзесяць гадоў «Рэспубліканская асацыя інвалідаў-калясачнікаў» (РАІК) праводзіць летнікі для калясачнікаў, мэта якіх — дапамагчы чалавеку, што атрымаў траўму, вярнуцца да нармальнага жыцьця. Тут людзі атрымліваюць вазкі актыўнага тыпу, на якіх нашмат лягчэй рухацца па жыцьці (як у прамым, так і ў пераносным сэнсе). Патрэбныя навыкі і атрымліваюць у летніку.

Штолета за дзьве зьмены праз зборы праходзіць 60 чалавек. На жаль, сёлета з прычыны фінансавых цяжкасьцяў лічба зьменшылася ўдвая. З той самай прычыны курс рэабілітацыі скараціўся зь пятнаццаці да дзесяці дзён.

За сьціслы гэты тэрмін курсанты павінны ня толькі навучыцца кіраваць вазком актыўнага тыпу, а яшчэ атрымаць пэўныя веды з сацыяльнай абароны, фізыялёгіі чалавека на вазку… Распарадак дня вельмі насычаны: удзень абавязковыя тры паўтарагадзінныя трэніроўкі, увечары — лекцыі, мерапрыемствы, дыскатэкі…

Трэніроўкі бываюць чатырох відаў: тэхніка язды на вазку, настольны тэніс, цяжкая атлетыка, аэробіка. Карыснае для людзей з траўмамі сьпіны плаваньне, але, на жаль, басэйн цяпер на рэканструкцыі.

Заняткамі кіруюць інструктары, таксама вазочнікі. Прычым курсанта, напрыклад, з траўмай верхняга аддзелу хрыбта вучыць інструктар з падобнай траўмай, таму што ў «шыйнікаў» — свая спэцыфіка руху, у «сьпінальнікаў» — свая.

Тэхнічныя пытаньні дапамагаюць вырашаць валанцёры. У асноўным, гэта студэнты — звычайна мэдыкі, псыхолягі, але не абавязкова (дапамагаць можа кожны неабыякавы чалавек — было б жаданьне!). Раздаць гантэлі і эспандэры, падтрымаць пры пераадоленьні перашкодаў — іх справа.

Рамонтам вазкоў і іх «падгонам» пад курсантаў займаецца мэханік. Да траўмы гэты вясёлы камунікабэльны хлопец працаваў на мэталюргічным заводзе і, паводле ягоных словаў, «вырас на капоце, гуляючы з гайкамі і болцікамі».

Курсанты павінны навучыцца самастойна пераадольваць прыступкі, бардзю-

Працяг на старонцы 30.

## ЗДЫМКІ ГОДУ



Юлія Дарашкевіч

**Амон затрымаў усіх актораў і гледачоў на спэктаклі Свабоднага тэатру, які атрымаў шэраг прэстыжных міжнародных прэміяў, але вымушаны граць на радзіме крадком. На фота: Мікалай Халезін, драматург Свабоднага.**

# Бар’еры

Працяг са старонкі 29.

ры, падымацца па пандусе і зьяжджаць зь яго. Здавалася б, ну што тут складанага? Аказваецца, каб адужаць пандус, трэба валодаць пэўнай тэхнікай. Я бачыла, як цяжка даецца курсантам кожны элемэнт і як настойліва яны вучацца. Побач інструктары, якія цярпліва дапамагаюць і даюць парады. Дарэчы, зь першага погляду ніколі б не падумала, што інструктар Косьця валодае такімі «талерантнымі» якасьцямі. Гэты хлопец з голенай галавой і выглядам тыповага «братка» мае добры і мяккі характар.

Трэніроўка па цяжкай атлетыцы ўжо падыходзіла да канца, калі мы з Іванам наблізіліся да месца яе правядзеньня. Было горача, таму хлопцы падчас трэніроўкі паздымалі майкі, але ўбачыўшы незнаёмую дзяўчыну засароменіся і хуценька пачалі апранацца. Пад кіраўніцтвам інструктара Віктара тут з дапамогай гантэляў, эспандэраў ды іншых снарадаў разьвіваюць моц рук, патрэбную для карыстаньня каляскай ды й для жыцьцядзейнасьці ўвогуле.

Сам курс навучаньня займае шэсьць дзён, у астатні час курсанты шліфуюць атрыманыя навыкі, паўтараюць элементы, якія даюцца цяжэй за ўсё. У гэтыя дні таксама праводзяцца спаборніцтвы: вызначаюць, хто мацнейшы ў тэнісе, дартсе, праводзяць маратон (заезды на 1, 2, 5 а то і болей кілямэтраў). Звычайна робяць таксама выезд у горад, гуляюць вуліцамі, наведваюць кавярню, рынак, парк, прымяняюць атрыманыя навыкі ў рэальных умовах. Для многіх курсантаў гэта першы «выхад у сьвет» самастойна, без бацькоў. Дарэчы, пра бацькоў. Яны часта зь неахвотай пакідаюць сваіх дзяцей у летніку, бо баяцца, што тыя ня змогуць пражыць бязь іх апекі. Як паказвае досьвед, пасьля летніку людзі мяняюцца: зь бездапаможных ператвараюцца ў самастойных.

«Выхад у сьвет» — на вуліцы гораду Барысава — выклікае ў мінакоў неадназначную рэакцыю, нават фурор. Для нашых гарадоў чалавек на вазку — штосьці надзвычайнае, а тут — цэлы натоўп! Вазочнікі гадамі сядзяць дома, бо пераважная большасьць нашых будынкаў ня мае пандусаў, у іх вузкія дзьверы або няма ліфтаў… Для дваццаці тысячаў беларускіх інвалідаў- вазочнікаў недасяжныя тэатры, кіно, магазыны…

У летніку курсанты разам, ім лягчэй даваць рады быту ў кампаніі аднадумцаў і людзей з падобнымі фізычнымі абмежаваньнямі. Хутка праляціць зьмена, адгрыміць апошняя дыскатэка, пройдзе разьвітальны вечар — і яны разьедуцца па дамах, вернуцца ў рэальныя ўмовы. Але былыя курсанты ўжо ня будуць баяцца гэтых умоваў — яны будуць у іх актыўна жыць і пераадольваць тое, што яшчэ дзесяць дзён таму палохала.

Я глядзела на гэтых людзей і разумела, што ня трэба і немагчыма нават іх шкадаваць! Можна пазайздросьціць іх сіле волі, вытрымцы, жаданьню жыць і працаваць. Вось толькі з працай праблема. Вазочнікам цяжка яе знайсьці, бо ім трэба спэцыяльна абсталяваныя месцы. Іван кажа, што дзяржаве было б прасьцей затраціць мінімум сродкаў на абсталяваньне месцаў працы для калясачнікаў і плаціць ім заробак, чым пакідаць дома і плаціць пэнсію па нядзеяздольнасьці.

Час праляцеў хутка, і вось мне пара ад’яжджаць. Іван, як сапраўдны джэнтэльмэн, правёў мяне да прыпынку. Цiснучы яму руку на разьвітаньне, я радавалася, што прыехала сюды, што пазнаёмілася з такімі людзьмі, і спадзявалася, што наша сустрэча была не апошняй! Іван разьвітаўся і паехаў, а жанчынкі на прыпынку заквахталі: «Бедненькі, на вазку…» Я ўсьміхнулася: ні-чо-га яны не разумеюць у гэтым жыцьці…

## ЗДЫМКІ ГОДУ



На Будслаўскім фэсьце.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Лёсы

Уладзімер Лялькоў.
Апавяданьне.

Пазнаёміліся мы на курорце Пяцігорск, дзе я тым летам залечваў свае нечаканыя хваробы.

— Павал Гаўрылавіч! — працягнуў ён мне зьверху ўніз, з вышыні свайго амаль двухмэтровага росту, сваю шырокую моцную далонь. — Шахтар з Варкуты. Былы. Цяпер — пэнсіянэр зь Менску.

Зьвесткі былі вельмі сьціплымі, і мусіць толькі праз тыдзень яны дапоўніліся тым, што ён ня проста шахтар, а шахтар заслужаны, стаханавец, горны інжынэр, кандыдат тэхнічных навук. І больш таго — вэтэран вайны, уладальнік ці не паўтузіну розных баявых ордэнаў і мэдалёў.

У адрозьненьне ад мяне яму прызначылі шмат лекавых працэдур, але прымаў ён іх ня вельмі ахвотна.

— Лічу карысным толькі саўну з басэйнам, вечаровы прамэнад, — усьміхаўся ён. — Ды яшчэ, мабыць, сталоўку... Сьмяецеся? А для мяне сталоўка — гэта найлепшае задавальненьне. Жыў жа я пры сацыялістычным раі, калі нават па кільку былі вялізныя чэргі, а па хлеб, памятаю, мы з матуляй займалі некалі чаргу яшчэ з ночы, каб раніцай атрымаць бохан заўжды жаданага хлеба. І цяпер, успамінаючы дзяцінства, знаходжу ў сябе адчуваньне голаду, жаданьне есьці, пад'есьці, якое было тады мацней за усе іншыя жаданьні...

У тую нядзелю Павал Гаўрылавіч з раніцы пашыбаваў у горад, а калі вярнуўся, выставіў на стол бутэльку хвалёнага армянскага каньяку. На мой, відаць, зьдзіўлены погляд ён адказаў ледзь мільгануўшай нейкай незразумелай усьмешкай.

— Сягоньня ў мяне вельмі памятны, можна сказаць — лёсавызначальны дзень... Дзень, калі я нечакана для самога сябе з падонка, з крымінальнага злачынцы ператварыўся ў нармальнага, як кажуць, законапаслухмянага чалавека, грамадзяніна...

— Вы? З падонка? З злачынцы? — зьдзіўлена ўсклікнуў я. — Шуткуеце, Павал Гаўрылавіч, сьмяецеся...

— Ды не, дарагі суседзе, — пасур'ёзьнеў ён. — Гэта сьвятая праўда. Жыцьцё такая складаная рэч. Яно можа выкідваць такія каленцы, рабіць такія зыгзагі, што ніякаму фантасту гэта не пад сілу.

— Відаць, — шчыра ўсьміхнуўся Павал Гаўрылавіч, гледзячы на мой усё яшчэ зьдзіўлены твар, — вы ўжо не супакоіцеся, пакуль не пачуеце маю споведзь. Давайце для пачатку кульнем па стапырцы каньяку. Гэта ж ня менскі бальзам, а ўсё-ткі пяць армянскіх зорачак. А выпіць сапраўды ёсьць за што. Самі потым пераканаецеся...

Ён напоўніў чаркі, прытуліў на міг сваю да маёй і хутка абярнуў яе сабе ў рот.

— Час сёньня ў нас ёсьць. Выходны, — пажаваўшы скрылёк лімона, пачаў Павал Гаўрылавіч. — Пачну, бадай, здалёк. З самага пачатку.

— Мястэчка Журавічы. Гомельшчына. Блаславёны край майго дзяцінства і юнацтва... У мястэчку — вялікі прыгожы касьцёл, сынагога, драўляная праваслаўная царква, вакол якой невялікі зялёны сквэрык. Тут я часта сяджу з кнігай, спрабую ўжо складаць вершы... У той летні дзень, памятаю, чытаў я паэму Якуба Коласа «Сымон-музыка». Да мяне на траўку нечакана прысаджваюцца два хлапцы зь дзяўчынай. Знаёмяцца, выкладаюць на газэту ці не зь дзясятак пачкаў марозіва.

— Бяры, Паўлік, еж, — запрашаюць мяне.

— Ды не, — бянтэжуся я. — У мяне і грошай цяпер няма...

— Якіх грошай? — сьмяецца дзяўчына. — Дзівак! Еж колькі хочацца...

Яна працягвае мне марозіва, падаўшыся пры гэтым бліжэй да мяне. Дзяўчына вельмі прыгожая і гэта мяне цешыць. Трэба сказаць, што марозіва ці цукерку тады, у адрозьненьне ад сучасных падшыванцаў, я меў ці ня раз у год, па вялікіх сьвятах ці ў кірмашны дзень. Хутка яны адыходзяць, пакінуўшы мне дзьве некранутыя порцыі.

— Багатыя і такія добрыя, — падумаў я.

Сустрэліся мы і ў другі раз. Ужо безь дзяўчыны. Пілі ліманад і піва (мне яно доўга яшчэ не падабалася). Закусвалі сушонымі бычкамі і цукеркамі.

Тыдні праз два сустракаюць яны мяне каля хаты.

— Вазьмі, Паўлік, стакан і прыходзь у сквэрык. У нас пляшка файнага віна.

Зь імі зноў тая ж прыгажуня. Ад яе чароўных усьмешак, лёгкіх зьнянацкіх дакрананьняў, ад выпітага віна ў мяне кружыцца галава. Я вясёлы і шчасьлівы, хвалюся, што пасьля школы пайду ў інстытут, цяпер займаюся ў фотагуртку, люблю і ўмею фатаграфаваць. Можа, выпрашу ў маці грошай і куплю фотакор.

— Навошта ж абіраць маці, — упікаюць яны мяне. — Грошы можам пазычыць мы. А калі разбагацееш — аддасі...

— Ды я і за год не зьбяру столькі грошай, — адхіляю я працягнутыя мне паперкі.

— Гэта залежыць ад цябе, — загадкава глядзіць на мяне дзяўчына. — Захочаш — будзеш мець. Калі, вядома, станеш мужчынам...

— Каму з нас у дурнаватай маладосьці не хацелася шпарчэй стаць дарослым, называцца мужчынам? — паварочвае да мяне голаў Павал Гаўрылавіч, беручы чарговую цыгарэту. — І я ім стаў. Стаў, здаецца, ужо празь месяц...

Выклікаюць мяне аднойчы гэтыя мае новыя прыяцелі і кажуць, што ім тэрмінова спатрэбіліся грошы.

— У мяне цяпер нічога няма, — усхваляваўся я. — Вазьміце фотаапарат...

— На ліха ён нам здаўся? Нам патрэбныя грошы сёньня ж.

— Дзе ж іх знайсьці? — ледзь ня плачу я.

— Знайсьці б можна, — неяк загадкава адказваюць сябры. —Ёсьць у нас адзін плян. Калі б ты дапамог...

— Які плян? Чым я магу дапамагчы? — загарэлася ў мяне надзея.

— Вельмі ўсё лёгка і проста. Трэба пастаяць на стрэме...

— Як гэта? Дзе пастаяць?

— Пасьцерагчы. Пасачыць, пакуль мы будзем дзейнічаць.

Да мяне даходзіць, нарэшце, што яны будуць рабаваць бліжэйшы кіёск.

— Ні за што! Гэта ж злачынства, — рашуча пярэчу я.

— А калі ў лаўцы сядзіць спэкулянт і абірае нас — гэта не злачынства? — асаджваюць яны мяне. — Справа твая. Цябе ж не прымушаюць красьці. Трэба толькі пасьцерагчы дзесяць хвілін і атрымаць за гэта бабкі. Калі табе грошы не патрэбныя, гуляй. А даўжок вернеш сёньня ж.

— Што б вы рабілі на маім месцы? — пытальна глядзіць на мяне Павал Гаўрылавіч. — Грошай у хаце толькі на хлеб, маці хварэе, бацька атрымлівае грашы. Вярнуць жа пазычанае — справа гонару.

А тут яшчэ падыходзіць тая ж дзяўчына-прыгажуня.

— Што вы яго ўгаворваеце! — з сумам кажа яна. — Ён жа баязьлівец, блазьнюк. Я сама вас пасьцерагу. Хай ідзе па грошы.

**Уладзімер Лялькоў**

жыве ў Менску. Яму 88 гадоў. Ён прайшоў праз савецкія канцэнтрацыйныя лягеры. Ягоны ўнук Ігар дзейнічае ў беларускай апазыцыі.

Гэта ўжо быў, разумееце, удар ніжэй пупа. Мой хлапечы гонар ня мог гэтага вытрымаць.

— Я згодзен! — нечакана для сябе, з выклікам выпендрыўся я. — Кажыце, што і дзе рабіць...

«Апэрацыя» прайшла пасьпяхова. За «дзяжурства на стрэме» мне на другі ж дзень адвалілі жменю мятых рублёвак, а гэта сказалася ўжо мацней за неўсталяванае і ўсхваляванае сумленьне. Я быў ужо завязаны, мной маглі маніпуляваць, уцягваць у новыя авантуры і махлярствы.

Так яно і здарылася. З маім удзелам было абрабавана некалькі кватэр, утварылася маліна. Ведаеце, што гэта такое? Зладзейская шайка, кампанія блатных, павязаных крымінальнымі ўчынкамі і свайго роду прысягамі і клятвамі — «корышы на ўсё жыцьцё». Звонку гэта дэкляравалася наколкамі, нашэньнем на шыі розных ланцужкоў, крыжыкаў, амулетаў, нават адрозьненьнямі ў адзеньні і абутку.

Неўзабаве да нас далучыўся вопытны «пахан» — старэйшына, кіраўнік, аўтарытэт, які сплянаваў ужо даволі буйную «справу»: абабіраньне ювэлірнага магазыну. Мне даручалася ўжо ня толькі стаяць «на стрэме», але і трымаць пад прыцэлам прадаўшчыц магазыну (пістоль, праўда, быў цацачны).

Адразу скажу, што справа ня выгарала. Нехта з прадаўцоў пасьпеў націснуць таемную сыгнальную кнопку, і хутка каля крамы засігналіла міліцэйскае аўто. Мае кампаньнікі пасьпелі ўцячы праз падвальны выхад, мяне ж цёпленькага, схапілі ў саміх дзьвярах.

Было сьледзтва, быў суд. Я як непаўналетні атрымаў толькі год пазбаўленьня волі і быў накіраваны ў «воспитательно-трудовую колонию» гораду Полацку.

Мушу сказаць, што сваёй назвы «выхаваўчай» ні адна падобная ўстанова на тэрыторыі былога СССР не апраўдвала. Наадварот, усе гэтыя калёніі і лягеры разбэшчвалі асуджаных, судзейнічалі навучаньню і ўдасканаленьню крымінальнага рамяства, з пачаткоўцаў рабілі рэцыдывістаў. Менавіта ў калёніі я ўбачыў і пераканаўся, што крымінальны сьвет сапраўды існуе, што ён мае свае правілы і законы, сваю сымболіку і атрыбутыку, нават сваю мову і паэтыку.

Гэта страшэнна агідны сьвет, сіла і дзейнасьць якога трымаецца на фінцы і рэвальвэры, а жывучасьць на фізыялягічным страху сьмерці. Гэта міжнародны спрут, стогаловая неўміручая зьмяя, пік жыцьця якой — ноч, а пажыўная глеба — турма.

Змагацца з злачынным сьветам сучаснымі гуманнымі сродкамі — бескарысна. Можна запоўніць усе турмы, засьценкі, карцэры — ён будзе жыць. Можна палову насельніцтва апрануць у міліцэйскую форму — крымінал ня зьнікне. Тут хіба змогуць дапамагчы законы Ўсходу ці Афрыкі, дзе за любую кражу сякуць руку. А за разбой ці забойства — галаву.

Калі ж крымінал зрастаецца з уладнымі структурамі, ператвараецца ў карупцыю — ён наагул бесьсмяротны.

## ЗДЫМКІ ГОДУ


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Студэнта-выдатніка Юр'я Бусла выгналі з Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнце за тое, што ён удзельнічаў у грамадзкім жыцьці.**

У каленіі прабыў я паўгоду. З выпадку якогасьці савецкага сьвята была амністыя, і я выйшаў на волю адным зь першых.

На варотах мяне ўжо чакалі «корышы». Адразу пайшлі папойкі, гулянкі, а неўзабаве і ранейшая «самадзейнасьць». Праўда, для гэтага мы перакачавалі ўжо ў Гомель, дзе мяне прытуліў да сябе адпеты зладзюга на мянушку Скрыпач. Сапраўднага прозьвішча яго я ня ведаю і па сёньняшні час.

Быў ён увесь у татуіроўках, на грудзях красаваўся арол над многімі царкоўнымі купаламі. Гэта сьведчыла аб ягоным найвышэйшым крымінальным званьні — «вор в законе» — і пра ягоныя былыя найцяжэйшыя злачынствы і тэрміны зьняволеньня.

Доўга ён нам (нас ужо была ладная шайка) цягнуць рызіну (жыць беструботна) не дазволіў. Разгульнае беспрацоўнае жыцьцё патрабавала грошай, і мы павінныя былі іх здабываць.

Скрыпач прапанаваў нам вельмі «даходнае дзела». Трэба было «абчысьціць» багатую кватэру бухгальтара Гомсельмашу, дзе, паводле зьвестак наводчыка, дарэчы, пляменьніка гаспадыні кватэры, было шмат каштоўных рэчаў: грошы, золата, калекцыя старадаўніх манэт. Гаспадар быў у камандзіроўцы ў Менску, гаспадыня адна дома. Яе меркавалася добра прыпужнуць, можа нават крыху і «пашчыкатаць», пакуль не аддасьць усе каштоўнасьці, «нагрузіць кашары і драць когці» — ці — напоўніць мяшкі і зьнікнуць уначы. Піць, ідучы на дзела, не дазвалялася, але справа здавалася такой простай і лёгкай, усё было дэталёва прадумана і падрыхтавана, што мы не ўтрымаліся і «прынялі па шклянцы для бадзёрасьці».

Гэта, думаю, і зьявілася прычынаю ўсяго далейшага.

Позна ўначы мы высадзілі шкло, адчынілі вакно на кухні і ўлезьлі ў дом. Яшчэ не пасьпеўшы прыкрыць твары ды ўключыць сьвятло, мы ў цемры выпадкова скінулі з халадзільніка вазу з кветкамі. На грукат разьбітага вазону выбегла гаспадыня і, заўважыўшы цені на кухні, імгненна кінулася да тэлефону. Скрыпач адкінуў яе ад тэлефону, аднак яна схапіла падсьвечнік і ваўчыцай кінулася на злодзея. Маладая, моцная, як высьветлілася потым, спарцмэнка, яна з такой сілай стукнула яго падсьвечнікам, што Скрыпач з усіх капытоў грохнуўся на падлогу. Праўда, не прайшло і хвіліны, як ён апамятаўся, выхапіў фінку і садануў гаспадыні ў грудзі. Нават не выкрыкнуўшы, яна адразу ж павалілася на дыван у перадпакоі.

— Бяжым! — спалохана закрычаў я.

— Страхні пыл з вушэй! — ашчэрыўся Скрыпач. — Справа зроблена. Нічога назад ня вернеш. Бярэм усё, што зможам зьнесьці...

У доме сапраўды было шмат каштоўных рэчаў, і мы пасьпешліва набівалі імі свае торбы. Калі ж Скрыпач адчыніў дзьверы другой спальні і засьвяціў туды ліхтарыкам, пачуўся прарэзьлівы дзіцячы крык: «Мама!»

Аказалася, што там спала дачка гаспадыні, сямі- ці васьмігадовая дзяўчынка, спала моцным дзіцячым сном, ня чуючы праз зачыненя дзьверы нічога, што адбывалася ў сумежных пакоях.

— Маўчаць, гніда! — ступіў у спальню Скрыпач. — Ні гука, бо прырэжу як кураня...

Дзяўчынка забілася ад страху ў гістэрыцы і, калоцячыся ўсім целам, ціха, задыхаючыся, усхліпвала і паскульвала.

— Іншага выйсьця няма, — павярнуўся да нас Скрыпач. — Трэба канчаць і яе... Каб сёньня ж ня трапіць у рукі лягавым. Паўло, дзейнічай. Гэта твой экзамэн.

Што гэта такое, я ўжо ведаў. Так дзейнічаюць у бандыцкім асяродзьдзі заўсёды, вучачы пачаткоўцаў, прывязваючы іх да свайго злачыннага рамяства. І што б вы думалі?! Я абурыўся? Узбунтаваўся? Запратэставаў? Кінуўся ўцякаць?

Не! Нібы адубеўшы, чужы самому сабе, з памутнелым розумам і амаль нягнуткімі нагамі я зрабіў крок да дзяўчынкі.

— Бі прама ў сэрца, — пачуў я яшчэ настаўляльны голас Скрыпача.

Павал Гаўрылавіч змоўк і брызнуў сабе ў чарку кроплю каньяку.

— Ня бойцеся. Забойства ня здарылася, — з палёгкай пачуў я таксама ўсхваляваны голас Паўла Гаўрылавіча. — Зьберагло мяне і дзяўчынку нават ня ведаю што... Мусіць, нейкае наканаваньне, боская воля, лёс... Ці яшчэ што. Ня ведаю.

— Я ўбачыў вочы дзяўчынкі. Вялікія. Мокрыя. Спуджаныя. І малельныя...

Яны нагадалі мне вочы маёй сястрычкі, калі пасьля выпадкова разьбітай ёй бутэлькі гарэлкі на яе кінуўся п'яны азьвярэлы бацька. Я тады першы раз у жыцьці ўдарыў яго і скінуў на падлогу. Плачучы і лаючыся ён пагражаў мяне забіць, а я ў той жа дзень сышоў з дому, сышоў назаўсёды, каб пачаць сваё самастойнае распраклятае жыцьцё.

Дык вось, ужо трымаючыся за нож, я адчуў раптам нейкі туман у вачах, боль у сэрцы і як апантаны выскачыў з спальні.

— Не магу! Ня буду... Ня трэба, — зашаптаў я, зьвяртаючыся да сваіх сяброў.

— Ты чаго, чокнуўся, ідыёт! — падаўся да мяне Скрыпач. — Яна ж сёньня выдасьць нас лягавым, а за гэта, — кіўнуў ён на ляжачую ў перадпакоі жанчыну, — нам будзе вышка...

— Яна нас ня бачыла, цёмна ж навокал, — атачыў я нарэшце голас. — Досыць і адной ахвяры.

— Вось ты які, аказваецца, духарык. Хопіць! — ускінуўся Скрыпач. — Адыдзі ў бок...

— Дзяніс, давай ты, — зьвярнуўся ён да напарніка. — І бязь зіпішу. Хутчэй.

— Ня дам! — нечакана для сябе самога закрычаў я, адчуўшы штуршок крыві да галавы. — Яна ж зусім дзіця. Хіба мы зьвяры?

Прыкрыўшы дзьверы спальні, я стаў да яе сьпінай, а ўбачыўшы набліжаўшыхся да мяне нягоднікаў, выхапіў цясак і ўжо пагрозьліва спакойна працадзіў: «Заб'ю. Падыходзьце, гады...»

Гэта падзейнічала выцьвержальна. Ужо праз імгненьне я пачуў ласкавапрымірэнчы голас Скрыпача:

— Ладна, Паўлік. Пагарачыліся і хопіць. Хай жыве казяўка.

Я з палёгкай уздыхнуў, прыадкрыў дзьверы спальні і калі пасьвяціў туды ліхтарыкам, убачыў... раскрытае акно і пустую койку дзяўчынкі.

Расказчык змоўк і задыміў мо ўжо пятую цыгарэту.

— Хочаце ведаць, што было далей? — памаўчаўшы, спытаў ён. — Беглі мы адтуль, зразумела, з хуткасьцю спуджаных шакалаў. Нават ня ўсё нарабаванае пасьпелі захапіць. На явачнай кватэры перасартавалі дабычу, пакінулі крыху наводчыку і барыгу, а самі ўжо раніцой, як прыстойныя багатыя пасажыры, ехалі ў напрамку Растова. Заўважу, што перад гэтым Скрыпач правеў «лятучку».

— Хоць ніякіх сьлядоў і доказаў мы, здаецца, не пакінулі, тым ня менш магчыма ўсё. У выпадку забурэньня мы адзін другога ня ведаем. Хто пырнуў гаспадыню — невядома. Было цёмна. Калі ж стане невыносна, усё бярэ на сябе Паўло. Ты самы малады, непаўналетні, вялікага тэрміну табе не дадуць, а мы ўсю дарогу будзем дапамагаць. Чым жа разьлічваюцца за шухер, ты ведаеш.

Так, гэта ўжо ўсё я ведаў. Як ведаў напэўна і тое, што за свой учынак у начной кватэры, за непадпарадкаваньне злодзею ў законе я ўжо прыгавораны і ў любы час магу чакаць кулі ў патыліцу ці нажа ў плечы. Давяраць мне не маглі, значыць, павінныя былі ад мяне пазба-

віцца.

Не магу сказаць, што гэта мяне ня страшыла ці не хвалявала, але паверце, літаральна трасло ад думкі, што я толькі што мог стаць забойцам, забойцам дзіцяці, што толькі нейкая хвіліна аддзяляла мяне ад бездані, і як я ўцалеў — невядома.

Калі я не «завяжу» ці ня буду забіты, гэта можа паўтарыцца і тады ўжо на мне можна будзе паставіць крыж.

Трэба было шукаць выйсьце.

Бачылася яно ў адным: бегчы! Бегчы як мага далей ад гэтых месцаў, бегчы ў пустыню, у тундру, куды-колечы — хоць на край сьвету.

На першым жа прыпынку цягніка я зьняў зь сябе пінжак, кінуў яго на даручаны мне чамадан з рэчамі, кіўнуў паплечнікам: «Выбегу па піва» і сышоў з вагону. Пераканаўшыся, што сачэньня няма, я хутка перабег праз вакзал на другі бок станцыі і ўскочыў у адыходзячы ў адваротным напрамку цягнік. У Бахмачах адразу купіў білет на Маскву, выпіў бутэльку піва і, залезшы на верхнюю лаўку вагону, заснуў непрабудным амаль да Масквы сном: дало сябе адчуць нэрвовае напружаньне апошніх дзён.

Масква сустрэла мяне незвычайным шукам і гамам, гудкамі і сыгналамі незьлічоных машын, званкамі і крыкамі насільшчыкаў, гандляроў, грузчыкаў. Ад перапоўненых людзьмі плошчаў стаяў безупынны гул.

Прыпыняцца тут нават на некалькі гадзін я ня меў намеру.

Экспрэс Масква—Варкута залучыў усе мае грошы. Засталося толькі на сьціплую куртачку ў прывакзальнай лаўцы «Рабочае адзеньне».

— Чаму Варкута? Прыпомніліся паведамленьні ў «Гомельскай праўдзе» пра паўночныя шахты, прызывы і зарпашэньні туды працоўных. І сапраўды, ужо адразу на прывакзальнай плошчы вялізны шчыт бялеў аб'явамі тыпу: «Патрабуюцца...», «Прымаюцца...», «Запрашаюцца...».

Пайшоў па першым жа бліжэйшым адрасе. У канторы за сталом сядзеў пажылы мужчына з крыху стомленым тварам.

— Прозьвішча, імя, узрост, адкуль родам, хто бацькі, якое навучаньне? — закідаў ён мяне шматлікімі пытаньнямі.

Пачуўшы адказы, крыху памаўчаў, гледзячы на мяне добрымі вачыма, потым працягнуў ліст паперы і самапіску.

— Пішы. Начальніку шахты №4. Сваё прозьвішча, імя. Прашу прыняць на работу ў якасьці праходчыка. Дата. Подпіс.

— Дакумэнтаў, пэўна, няма, — прымаючы ад мяне заяву ня то пытаў, ня то сьцьвярджаў ён. — Згубіў? — што ж, бывае. Ды гэта не бяда. Зьмесьціш аб'яву ў «Варкуцінскай праўдзе». Гэта і будзе твой першы надзейны дакумэнт.

Зрабіўшы некалькі запісаў у сваіх кнігах, ён працягнуў мне друкаваны лісток паперы.

— Пойдзеш у брыгаду Дарашчука. Ён, дарэчы, твой зямляк, аднекуль зь Беларусі. Будзеш спачатку вучнем. З гэтай паперкай зайдзі ў прафкам. Там табе дадуць накіраваньне ў інтэрнат. Заўтра ў касе атрымаеш аванс.

— Ну, добрых табе посьпехаў, Павал, — працягнуў кадравік мне руку. — Віншую з пачаткам сумленнага працоўнага жыцьця.

Дзіўна. Неверагодна. Фантастычна. За нейкія паўгадзіны, без дакумэнтаў, без анкет і жыцьцяпісаў, характарыстык і накіраваньняў я прыняты на працу, атрымаў жыльлё, праз дзень буду мець аванс.

І гэта — у СССР, краіне хваравітага недаверу і падазрэньняў, уміленьня перад пячаткай і блатам (памятаеце: «без паперкі ты букашка, а з паперкай — чалавек», «блат — вышэй саўнаркаму»).

Пачутая ўсім нутром чалавечнасьць, цеплыня і давер патрабавалі адпаведнай аддачы. Гэта праявілася неяк нават неўсьвядомлена на маёй працы, паводзінах, грамадзкай дзейнасьці. Мяне пачалі прыкмячаць, вылучаць, адзначаць падзякамі, прэміямі, віншаваньнямі. Хутка я ўжо перадавік, стаханавец, ударнік. Накіроўваюся на вучобу. Сярэднюю. Вышэйшую. Займаюся навуковай працай. Абараняю кандыдацкую. Праз год — дэпутат гарадзкога савету. Яшчэ праз чатыры гады — ардэнаносец, кавалер адной з самых прэстыжных узнагарод — Ордэну Працоўнага Чырвонага Сьцягу.

— Бачыце, — неяк іранічна ўсьміхаецца Павал Гаўрылавіч, — суцэльная дывановая дарожка, ганаровая лесьвіца на неба. Піць ужо няма за што... Ды і няма чаго, — шчоўкае ён пазногцем па амаль пустой бутэльцы. — З таго часу ўпэўніўся я, што ў жыцьці кожнага чалавека ёсьць свае сьветлыя і цёмныя палосы, шчасьлівыя і нешчасьлівыя часіны ці пэрыяды. Кожны носіць у сабе дабро і зло, яны нябачныя, нават няведамыя самому чалавеку і праяўляюцца толькі ў выключных выпадках, пры незвычайных абставінах і ўмовах.

Няма бязгрэшных праведнікаў, як няма і злачынцаў ад самой прыроды.

Анёлаў і д'яблаў выдумаў чалавек, каб з чымсьці параноўваць ці чымсьці апраўдваць свае ўчынкі ў тым апакаліпсісе, які называецца жыцьцём.

— Вось і ўся мая споведзь, паважаны калега, — павярнуўся да мяне ўсім сваім крэслам Павал Гаўрылавіч. — Што вы можаце на гэта сказаць? Якое ваша рэзюмэ?

— Мне здаецца, што вы яшчэ нечага не дагаварылі, — заўважыў я. — Ёсьць нейкі працяг...

— Сапраўды, — засьмяяўся ён, — ёсьць, ну, не працяг, а нешта кшталту эпілёгу. Там, у Варкуце, прапанавалі мне неяк пуцёўку ў Ялту, на Чорнае мора. Я даўно ня быў тады ў адпачынку і з задавальненьнем туды накіраваўся. Толькі... апынуўся раптам дзе б выдумалі? У Гомелі! Сам ужо добра ня ведаю, як і чаго я туды павярнуў. Мабыць, мае рацыю сьцьверджаньне, што злачынцу заўжды цягне на месца злачынства. Ну, з маім тагачасным рэпрэзэнтабэльным выглядам ды іканастасам на грудзях я хутка раздабыў патрэбныя мне зьвесткі. Высьветлілася, што бухгальтар даўно ўжо на пэнсіі, гаспадыня абрабаванай намі кватэры засталася жывой: нож Скрыпача прайшоў міма сэрца. Іх адзіную дачку завуць Рэгіна, яна скончыла ўнівэрсытэт і працуе ў цэнтральнай біліятэцы.

Доўга раздумваць я ня стаў. У магазіне кветак купіў шыкоўны букет руж, прыхаваў у сярэдзіну залаты пярсьцёнак і маленькую паперку «В память о летней ночи 1959 г.» і пайшоў у біблія-тэку. Жанчыну, што паліла ў калідоры, папрасіў выклікаць Рэгіну.

Выйшла стройная, прыгожая, нават вельмі прыгожая дзяўчына.

— Вы Рэгіна Станіславаўна? Вам кветкі, — працягнуў я ёй букет руж.

— Мне?! — зрабіла яна зьдзіўленыя вочы. Тыя ж вочы, вялікія, прыгожыя, толькі ўжо ня мокрыя, перапуджаныя, а чыстыя, сьветлыя, зялёныя...

— Так, вам. Прасілі перадаць.

— Хто? Калі?

— Малады прыгожы чалавек, — зманіў я. — Ён не назваўся, сказаў, што вы яго ведаеце. Прыйдзе ў абедзены перапынак.

Хвіліну яна вагалася, але згледзеўшы мае валасы, што пачыналі ўжо сівець, ды зьзяючы золатам ордэн, перамагла сумненьні і ўзяла букет.

— Дзякуй, — пачуў я прыемны мілагучны голас.

— Табе дзякуй, родная, — хацелася мне сказаць, — дзякуй за тое, што ты ёсьць, што была тады, бо менавіта з таго часу пачалося маё новае сумленнае жыцьцё, толькі праз цябе я стаў Чалавекам.

# З Толікам і Колікам

Сьвятлана Курс. Мініятура.

Было ў мяне адзін год адзінокае сьвята. Толькі я прыладзілася выпіць як сьлед перад накрытым сталом — званок у дзьверы. Я адкрыла ня гледзячы — хто б там ні быў, хоць рабаўнік, усё весялей будзе. На парозе — суседзі Колік і Толік. Толік трымае Коліка за пас, Колік націскае мой званок. Гэта хлопцы-двайнякі, дзеці маіх суседзяў-чарнобыльцаў, ім гадоў па шэсьць, але яны вельмі маларослыя, худыя, вёрткія, чарнявыя такія гамельчукі.

— Чаго вы, хлопцы?

— Папа сказаў к вам ісьці. Маму ражаць павезьлі. А папа нагу зламаў, і яго дактары забралі.

— Мама наша даўно нейкая тоўстая хадзіла. А мы й не здагадаліся, што ў нас Наташка будзе. Нам хлопцы ў двары сказалі, што ў мамы будзе дзіця.

— А адкуль вы ведаеце, што Наташка?

— Хочацца такую Наташку. Мама хацела дзевачку. Казала нам: як вы мяне замучылі, ах, каб хто-небудзь з вас быў Наташка, а не такі ёлупень, як вы! Дык вось будзе ёй Наташка.

— Папа пайшоў па елку, а вярнуўся п'яны і зь нейкай такой аблупленай елкай, быццам на сьметніку знайшоў. Мама пачала плакаць і біць яго, а ён дастаў з курткі пакет мойвы і кажа: «Ніначка, чаго ж ты б'есься, я хлопцам падарак прынёс». Мама кажа: «Каб жа ты нечага здох са сваёй мойвай!» І стукнула папу мінэралкай. А мы заплакалі, маму абнялі, і папу абнялі. Мамачка, мы любім мойву, не крычы на папку!!!

— І мы тую мойву зьелі чуць не з пакетам! А мама пачала і плакаць, і сьмяяцца, а тады схапілася за сьпіну і закрычала, каб папа бег скорую вызываць. А хата ў нас новая, дзьверы аднолькавыя, і папа ўсё блытае дзьверы са сьценнай шафай. Ну, ён шафу адкрыў і ўляцеў туды — яна недаробленая там, глыбока, яма ўнутры, мы там хаваемся, як што якое. Мы скорую вызвалі. Папа сказаў, што бабка прыедзе заўтра, а пакуль каб мы ў вас начавалі, можна?

Мы цудоўна сустрэлі той Новы год! Зьелі ўсё, што я прыпасла. Пілі з фужэраў пад Лукашэнку й бой курантаў. Праглядзелі ўсе канцэрты аж да чацьвертай раніцы. Выпалілі пэтарду з балькона.

— А й добра, што так выйшла! — сказаў мне Колік ужо з ложка, як патушылі сьвятло. — Мы даўно падарункі знайшлі, што маме на нас выдалі, цукеркі паелі, а ў паперкі плястылін пазакручвалі. А Толік яшчэ ў згушчонцы і ананасах дно прабіў, высмактаў і вады напусьціў. А дно цэньнікам заляпіў. Нас бы мама пазабівала, а цяпер яны і ня ўспомняць.

— Мойва такая была салёная! Цёця, а ў вас больш соку няма?

— Няма, папі вады з-пад крану.

Малыя ногі ўпоцемку зашлёпалі па лінолеўму.

А нарадзілася ў іх Дар'я, бо на Дар'яў той год быў якраз умалот.

**Сьвятлана Курс**

жыве ў Варшаве. У сэрыі «Кнігарня «НН» выходзіць яе кніга прозы «Шлях дробнай сволачы».

## ЗДЫМКІ ГОДУ




**Простыя каталікі дабіваліся вяртаньня касьцёлу Сьвятога Язэпа, які ўлада хацела пераабсталяваць пад гатэль.**

# Маленства пад горку кацілася

Тацяна Барысік. Апавяданьне

«Любіў шофэр учыцельніцу. А яна за яго замуж ісьці не хацела. Казала, шофэр саляркаю сьмярдзіць. Дык ён узяў нож — ды ў жывот дзеўцы. Памерла не адразу. Шчэ да самых варотаў бегла. У фартуху вантробы свае несла…» — вось такія паданьні, мала падобныя да фальклёру са школьных падручнікаў, штовечар чуліся на вясковай вуліцы. На лаўках сядзелі абгаворвалі адна адну глухаватыя бабулькі.

У тое лета мне споўнілася дзесяць гадоў, маім сябрам было прыкладна столькі ж, як той казаў, год туды-сюды. Узрост, калі замест казак пра папялушак і цмокаў, якіх, дарэчы, у вёсцы ніхто не распавядаў, узьнікае неадольнае жаданьне слухаць гісторыі, не прыдатныя для дзіцячых вушэй, а сьвет, адмыслова створаны для цябе дарослымі, пакрысе страчвае прывабнасьць. Проста расплываецца, нібы ў тумане, і ўсё. Зьнікаюць Дзед Мароз, Бабай, ваўкі ў жыце, дзікі на копанцы. Ня вернеш. Найжахлівейшымі істотамі табе падаюцца калгасныя камбайны, што лётаюць па вясковай вуліцы, лязгаюць жалезьзем, як фантастычныя пачвары.

— Як убачыце, дзеткі, адразу ў двор уцякайце. Хто яго ведае — п'яны ён едзе ці яшчэ які, — наказвае бабуля.

Я слухаюся яе. Не ўва ўсім праўда. Чалавек — такая брыдкая істота: хлусіць і размаўляць вучыцца адначасова, а першыя ж працоўныя даручэньні выклікаюць цьвёрды намер іх не выконваць. Замест таго, каб нарваць на сопках ёмкі кошык амэрыканскай канюшыны для парсюкоў, я бегла на паплавец. Надзяру трохі лугавіны, узаб'ю яе рукамі, каб паўней глядзелася. Абы з рук, абы хутчэй да сяброў на гулі. Забаўкі нашыя таксама былі не анёльскімі. Аднаго разу злавілі вялізнага коніка (саранчу), размалявалі яго пад п'яніцу ды зноў у траву выпусьцілі. А чаго вартая задума накласьці курынага гаўна ў бляшанку з-пад цукерак-смактушак, закапаць пад ігрушаю, пасьля падвучыць гэткіх жа падшыванцаў, як самі, шукаць старажытны скарб. Дарослыя клікалі нас бандаю. Мы басьцяліся дзе хацелі: гулялі ў хованкі ў калгаснай кукурузе, лавілі жаб у копанцы. Але ў тое лета рэчаіснасьць змусіла нас часткова забыцца на ранейшыя гульні. Памерла сьляпая бабка Несьцяровічыха. Яшчэ тры дні таму мы разам з Алеськаю і яе бабуляй заходзілі ў двор да Несьцяровічыхі. Гаспадыня сядзела на ганку і, здавалася, скрозь нас узіралася сваімі невідушчымі вачыма кудысьці далёка. І вось яе няма. Ішоў дождж. Вёска рыхтавалася да хаўтураў. Наша «банда» сабралася ў Алесінай хаце, і мы прыляпіліся насамі да шыбы.

Па вуліцы сноўдаліся незнаёмыя жанчыны ў чорных хустках, ішлі глядзець нябожчыцу аднавяскоўцы ў чыстых строях з кветкамі.

Назаўтра на могілках усёй вёскай старыя і малыя разьвіталіся зь Несьцяровічыхай.

Я таксама ціхенька стаяла ў дзіцячым гурце. Усё было ў навіну. Да пэўнага ўзросту могілкі наагул здаюцца найпрыгажэйшым і найцікавейшым месцам у навакольлі, амаль парк адпачынку. Рознакаляровыя агароджы, лавачкі, безьліч кветак. Мае сябры, у адрозьненьне ад мяне, не маглі дзівіцца моўчкі.

— Глядзі, глядзі, зараз бабу закапаюць, а яна яшчэ тры разы перавернецца, — пачула я Валеркаву балбатню. Дзіўны гэты Валерка, як жа яна перавернецца? Столькі ж зямлі ўскінулі. Ат, гаворыць абы-што. Я паглядала навокал, сяброкову гамонку не падтрымлівала, і ў душы цешылася сваімі ўзорнымі паводзінамі.

А ён, Валерка, і на жалобным стале, куды патрапіў адзіны з нашай «банды», зьдзівіў дарослых.

Пасьля словаў дзеда Несьцяровіча, мужыка нябожчыцы:

— Адна ж ты ў мяне толькі й была.

Валерка, пахваляючыся, прамовіў на ўсю хату:

— А ў маёй бабы многа дзядоў было!

Адвячоркам на лаўках шчэ доўга не сьціхалі размовы і абгаворы.

Кожная бабка імкнулася некалькі разоў выказаць сваё меркаваньне пра хаўтуры, жалобны стол, Несьцяровічышыну радзіну. Казалі, па нябожчыцы ніхто ня плакаў.

Яе ўнучка, высокая кастлявая дзеўка, як прыехала, дык адразу пабегла да суседзяў тэлевізар глядзець. Толькі дачка Несьцяровічыхі, дурная Нінка, сядзела ля труны, абмахвала мухаў ды ўсё прыгаворвала:

— Мамка, ты мая мамка.

Казалі, цяпер Нінцы гора будзе, бацька здасьць яе ў інвалідны дом. Старыя перагаворвалі адно й тое ж, можа, зь месяц. Для нас, дзяцей, з таго часу не было гульні цікавейшай за пахаваньне.

Спачатку зладзілі хаўтуры па здохлым вожыку, каторага знайшлі ля калодзежа. Усё як мае быць: крыжык, кветкі, яловыя лапкі, магілка ў канцы гораду на паплаве. Пасьля была ластаўка зь перабітым крылом. Мы спрабавалі яе лячыць. Валерка прамыў крыло ў вадзе, заверыўшы, што яна цёплая, сам ногі ўчора мыў; намазаў рану нейкай бабінай націркай.

Але, нягледзячы на ўсе высілкі, птушка прапала. Хавалі таксама ў канцы гароду.

Там жа знайшлі свой спачын мухі ды каларадзкія жукі. Забіць казюрак адмыслова дзеля гульні прапанавала самая меншая з нас, Алеська. А калі натрапілі ў садзе на нябожчыка дзятла дык хаўтуры ўжо ладзіць ня сталі. Валерка выкінуў дзятла ў сьлюняк, каб паглядзець, як зь яго шкілет зробіцца. Праз гэтую прыдумку хлапца самога прадражнілі Шкілетам. Але ён не крыўдаваў на мянушку, наадварот, ганарыўся. І аднойчы прапанаваў зазірнуць у вакно кінутай хаты на водшыбе, сьцьвярджалі, нібы там, за грубкаю, ляжаць парэштткі былога гаспадара сядзібы. Сьпякотным поўднем мы падышлі да той хаты. Аканіца была выдраная, шыба выбітая, мабыць, туды лазілі злодзеі ў пошуках спажывы. Па чарзе зазірнулі ў вакно. Сьвятло праз бітую шыбу амаль не трапляла ў хату: астатнія цэлыя вокны былі закрытыя аканіцамі. Вакол мура павырасталі сьлівы.

Вядома, ніякіх чарапоў і шкілетаў мы там за грубкай ня ўбачылі. Але адтуль патыхала нежылой вільгацьцю, цемрай, і, здавалася, сьмерцьцю. Страшна зрабілася.

Мы паверылі — у такім месцы шкілеты маглі быць. Прыйсьці сюды яшчэ раз ніхто не адважыўся. Тым часам лета ішло на згон. Сасьпела калгасная кукуруза — ласаваліся ўдосталь. За гародамі зжалі жыта. Штовечар мы коўзаліся са

**Тацяна Барысік**

жыве між вёскай Круглонева Бабруйскага раёну і Магілёвам, гадуе паўтарагадовае дзіця, а ўначы падпрацоўвае вартаўніцай.

сьціртаў. У выніку — адзежа поўная асьцюкоў, ногі ўшчэнт сколатыя іржышчам. Усе дарослыя, каторыя шчэ маглі хадзіць без кіёчкаў, штосілы, як сьцямнее, цягалі салому сабе на падворкі. Нас, малечу, з сабою ня бралі, таму паход на калгасную салому ўяўляўся справай захапляльнай і рызыкоўнай. У вёсцы ня першы ўжо раз зьбіраліся раўняць дарогу. Кучы гліны і пяску ўзвышаліся пасярод вуліцы побач зь ямкамі. Вада пакрысе размывала гэты скарб, утваралася цудоўная гразь, якую прыемна мясіць босымі нагамі пасьля цёплых яшчэ дажджоў. У лужыны можна шпурляць каменьчыкі і мерацьіх глыбіню. Жыцьцё было цудоўным. Дзяцел у сьлiўняку сапраўды ператвараўся ў шкілет. Валерка начапіў сабе на шыю галаву зь дзюбаю. Мы ўсе яму зайздросьцілі. Адзінае, што нас засмучала, — хуткае разьвітаньне зь сябрамі, школа. Мы жылі ў розных гарадах. Ніколі я так ня плакала, як у дзень адʼезду дадому. Суцяшалі толькі думкі пра наступнае лета. Зноў зьбярэмся, зноў будзем гуляць разам — усё паўторыцца.

Як жа я тады памылялася.

Праз год мы насамрэч сустрэліся. Не было толькі Валеркі. Сумная вестка прыйшла яшчэ ўвосень. Няшчасны выпадак. Валерка зь сябрамі гуляўся на закінутай будоўлі, якіх у той час было багата. Нечакана абрынулася цагляная сьцяна. Прыціснула насьмерць. Пахавалі нашага сябра на вясковых могілках. Сьцішаныя, з букетам палявых кветак, мы прыйшлі адведаць яго. У вышыні рыпелі камлі соснаў, з помніка на нас пазіраў Валерка, такі, якім мы яго запомнілі. Хлапчанё ў атачэньні фатаздымкаў і прозьвішчаў старых людзей.

Можа, тады й прыйшло канчатковае ўсьведамленьне таго, што жыцьцё ня толькі цікавейшае, але й страшнейшае за самую жахлівую казку. А цагляныя сьцены, пʼяныя камбайнэры тояць у сабе большую пагрозу, чым уяўныя шкілеты за грубкаю. Пра леташнія гульні ў хаўтуры мы ня ўзгадвалі. Хапала розуму як мага радзей трапляць на вочы Валеркавай бабе. Старая, пабачыўшы нашую пасталелую за год «банду», заўсёды плакала і прыгаворвала:

— Во й мой такі ж быў бы...

Лужыны на вуліцы я больш ня мерала.

Справа нават не ў дарослых, каторыя пачалі ўшчуваць за надта ўжо дзіцячыя для маіх гадоў забаўкі. Проста лужыны і гразь на дарозе зьнiклі.

У вёсцы, першы й апошні раз за ўсю яе гісторыю, паклалі асфальт.

Зьмянілася й маё стаўленьне да працоўных абавязкаў. Бабулі ўдалося пераканаць мяне, што ад зельля на сьвіньні мяса расьце.

Падрослы арганізм патрабаваў ужо ня толькі цукерак, але й паляндвіцы. З мараю пра спрэс мяснога парсюка я апантана пхала ў кошык амэрыканскую канюшыну. Дзіўная рэч, хаця кошыкі гэтым годам былі паўнейшымі, чым леташнія, яны зрабіліся значна лягчэйшымі.

Маленства пад горку кацілася.

*Магілёў*

## ЗДЫМКІ ГОДУ



Ірына Дарафеева праславілася, выступіўшы на канцэрце «За Беларусь» 25 Сакавіка.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Хто сьмяяўся апошні

Аляксей Бацюкоў. Апавяданьне.

А я вам скажу, што такое як бы шчасьце.Яно было ў мяне.Не, не тады, калі я ўпершыню закахаўся. У бялявую, ружавашчокую, крэпенькую аднакурсьніцу. З чыстымі-чыстымі вачыма, з круглым, як макаўка, тварам. З такой шчырасьцю ў вачах, з такім ласкавым сьмехам. Ня ў тыя некалькі дзён, калі мы трымаліся за рукі ў калідоры і размаўлялі. Няважна пра што. Але пра каханьне. І ясна ж, не тады, калі яна спалохалася маіх эмоцый і адмовілася быць разам. Вядома ж, ня ў той сьлізкабалючы год сустрэч і адмоваў. І ня ў гэтых сёньняшніх успамінах, адзінаццаць гадоў пасьля. І не ў аціханьні таго першага болю было шчасьце. Ня ў тым, што час ад часу я забываўся пра яе, і наступала кволая палёгка. Больш за тое. Нават не тады, калі яна зноўку пачынала мне ўсьміхацца. Спачатку ўсьміхацца, потым згаджацца разам пагуляць пасьля занятkаў. Разам паехаць на тралейбусе. Разам пакатацца на лыжах на фізкультуры. Не было тады як бы шчасьця, таму што, калі я глядзеў на яе, і яна мне ўсьміхалася, азіралася, гарэзьлівa і гульліва, я пачынаў несьвядома заўважаць, што ў яе дзесьці дужа тоўсьценька, а дзесьці — дужа дробненька. Не атрымлівалася поўнага шчасьця. Я нікуды не запрашаў яе, яна перастaвала ўсьміхацца мне, потым зноўку ўсьміхалася, потым пыталася ў мяне, чаго я вечна за ёю хаджу. А шчасьце было, сапраўднае, маленькае, але шчырае і чыстае, калі аднойчы я не зашпіліў сваёй шырынкі. Толькі не падумайце, што гэта я несур'ёзна кажу, што я наўмысна паставіў тут такое слова, каб дзёрнуць вашае пачуцьцё прыгожага і прымусіць скрывіцца. Насамрэч, расшпіленая шырынка — гэта вусьцішная ў сваёй мізэрнасьці трагедыя для мужчыны. У нейкім сэнсе, гэта кастрацыя ягонага вонкавага вобразу. Ператварэньне яго, гэтага вобразу, ва ўмоўны вобраз жанчыны, прычым жанчыны, якая выставілася напаказ. Потым я і яшчэ бываў з расшпіленымі шырынкамі, але толькі аднойчы, толькі тады гэта прынесла мне як бы шчасьце. Ішоў другі год маіх гарманальных пакутаў. Яна не была мне ані блізкай, ані далёкай, я не набліжаўся да яе і не аддаляўся. Ёй былі прыемныя мая ўвага і маё пачуцьцё, напэўна, але мая нерашучасьць яе, відавочна, крыўдзіла. Так што паступова нашы адносіны перайшлі на раздражнёную і абвінаваўчую танальнасьць, калі ад кпінаў ды ігнараваньня рабілася лягчэй. І нешта ўсё ныла ўва мне маё каханьне, ныла. І гэтак сталі мы неяк зь дзеўкамі і хлопцамі на прыпынку, чакаючы аўтобус дадому. І яна там была. І я глядзеў на яе, імкнучыся запомніць кожны праменьчык цеплыні на яе твары. Разам зь ёю і яшчэ адной дзяўчынай я пад'ехаў да іншага прыпынку. Потым, толькі разам зь ёю, сеў у тралейбус. «Навошта ты садзісься на гэты тралейбус? — спытала яна. — Ён не падыходзіць табе». Я маўчаў. Яна глядзела ў бок. І вось тут. Нейкі мужык побач нахіліўся да майго пляча і сказаў дужа гучна, як толькі для мяне: «Дзесяць капеек». «Што?» — сказаў я. «Зашпіліся, — сказаў ён і паказаў, — вось яно». Я засьмяяўся. Я паглядзеў ёй у вочы. Я сказаў: «Сапраўды, гэта ня мой тралейбус». Яна паглядзела на мяне. Я выйшаў. Ня толькі з тралейбусу. Вецер. Сонца. Мне захацелася ў кніжны магазын. Назаўтра яна першай загаварыла — ці ўсё ў мяне ў парадку. Усё — я пайшоў далей, на свае заднія парты. Яна была выдатніцай. Потым яна засталася ва ўнівэрсытэце. Потым працавала ў Нямеччыне. У мяне потым былі жанчыны. Жонкі. Дзеці. У мяне ніколі ня будзе болей такога як бы шчасьця. Такой свабоды. Я за свабоду.

**Аляксей Бацюкоў**
філёзаф, пісьменьнік, жыве ў Магілёве.

## ЗДЫМКІ ГОДУ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**К нам пріехал, к нам пріехал ван дэр Ліндэн дарагой...**

# Відашукальнік

Рэйманд Карвэр. Апавяданьне.

Чалавек бяз рук прыйшоў да дзьвярэй прадаць мне фотаздымак майго дому. Калі б не нікеляваныя крукі, ён выглядаў бы як звычайны мужчына, гадоў на пяцьдзясят.

— Як вы страцілі свае рукі? — спытаў я, пасьля таго як ён паведаміў, што яму трэба.

— Гэта іншая гісторыя, — адказаў ён. — Дык вам патрэбны здымак ці не?

— Заходзьце, — сказаў я, — я акурат кавы згатаваў.

Я таксама згатаваў жэле з пакеціка. Але гэтага я чалавеку не сказаў.

— Ці можна скарыстацца вашым туалетам? — папрасіў чалавек бяз рук.

Я хацеў пабачыць, як ён будзе трымаць конаўку.

Я ўжо ведаў, як ён трымае фотаапарат. Гэта быў стары «паляроід», вялікі і чорны. Ён мацаваўся да скураных рамянёў, якія перакручваліся над плячыма, а потым сыходзіліся за сьпінаю, і ўся гэтая канструкцыя прыціскала фотаапарат да грудзей. Чалавек становіцца на ходніку ў вас перад домам, ловіць дом у вочка відашукальніка, націскае адным крукам на рычажок і гоп — выпаўзае здымак.

Бо я ж, бачыце, цікаваў праз кухоннае вакенца.

— Дык дзе, кажаш, у цябе туалет?

— Вунь дзе, потым налева.

Курчачыся і ўгінаючыся, чалавек аслабаніўся ад сваіх рамянёў. Ён паклаў фотаапарат на канапу і паправіў куртку.

— Можаш пакуль што паглядзець.

Я ўзяў у яго здымак.

На ёй быў маленькі прастакутнік лужка, каляіна, паветка для аўтамабіля, ганак, пукатае вакно на першым паверсе і вакенца, празь якое я глядзеў з кухні.

Дык нашто мне здымак гэтай трагедыі?

Я пагледзеў бліжэй і ўбачыў сваю галаву, *сваю галаву*, там, на здымку, у кухонным вакенцы.

Гэта прымусіла мяне задумацца, калі я ўбачыў сябе так. Такое прымусіць задумацца, скажу я вам.

Я пачуў рокат зьліванай вады. Чалавек ішоў, зашморгваючы «маланку» і пасьміхаючыся. Адзін крук падтрымліваў ягоную папружку, а другі запраўляў кашулю.

— Ну як? — спытаў ён. — Ці падабаецца? Калі шчыра, дык, здаецца, нядблага атрымалася. Хіба я ня ведаю, што раблю? Нічога не парадзіш: профі — гэта профі.

Ён пачухаў паміж ног.

— Вось кава, — сказаў я.

Ён спытаў:

— Ты адзін, так?

Ён акінуў позіркам гасьцёўню. Пахітаў галавой.

— Ня мёд, ня мёд, — сказаў ён.

Ён сеў побач з фотаапаратам, потым, уздыхнуўшы, падаўся назад і ўсьміхнуўся, быццам яму вядома нешта нейкае, чаго мне ён ня скажа.

— Кава выстыне, — сказаў я.

Я думаў, што б такое сказаць.

— Тут прыходзілі тры малыя хлапчукі і прапанавалі напісаць мой адрас буйнымі літарамі на бардзюры. Яны прасілі за гэта даляр. Можа, ты што ведаеш пра гэта?

Наўрад ці ён меў дачыненьне. Але я ўсё адно зірнуў на яго.

Ён самавіта падаўся наперад. Конаўка балянсавала паміж крукамі. Ён паставіў яе на стол.

— Я працую адзін, — адказаў ён. — Заўжды працаваў адзін і заўжды працаваць му. А што ты хочаш сказаць?

— Спрабаваў знайсьці сувязь, — прызнаўся я.

У мяне балела галава. Ведаю, ад кавы ў гэтай справе карысьці мала, але часам дапамагае жэле з пакеціка. Я ўзяў здымак.

— Я быў у кухні, — сказаў я. — Зазвычай я ў пакоях.

— Ды пастаянна здараецца, — прамовіў ён. — Значыцца, яны проста ўзялі і пакінулі цябе? Зірні, прыкладам, на мяне, я працую адзін. Ну, што скажаш — ці возьмеш здымак?

— Вазьму, — адказаў я.

Я падняўся і прыбраў конаўкі са стала.

— Возьмеш, дзе ты падзенесься! Я арандую пакой у цэнтры. От, нішто сабе. Саджуся ў аўтобус і кружляю па прадмесьцях, а як скончу ўсе прадмесьці, пераяжджаю ў іншы горад. Разумееш, што тут да чаго? Слухай! А ў мяне таксама былі дзеткі. Як у цябе, — сказаў ён.

Я стаяў з конаўкамі і назіраў, як ён сіліцца падняцца з канапы.

Ён сказаў:

— Гэта яны надзялілі мяне гэтым во.

Я ўважліва зірнуў на ягоныя крукі.

— Дзякуй за каву і туалет. Я спачуваю.

Ён падняў і апусьціў свае крукі.

— Пакажы мне, — сказаў я, — пакажы мне наколькі: паздымай яшчэ мяне і мой дом.

— Нічога ня выйдзе, — адказаў чалавек, — яны ня вернуцца.

Але я ўжо дапамагаў яму надзець почапкі.

— Прапаную зьніжку, — сказаў ён, — тры здымкі за даляр. Менш не магу — мне ў мінус будзе.

Мы выйшлі. Ён наладзіў дыяфрагму, сказаў мне, дзе станавіцца, і мы пачалі.

Пачалі хадзіць вакол дому. Часам я глядзеў набок. Часам проста перад сабой.

«Добра», — гаварыў ён. «Так вось добра», — гаварыў ён, пакуль мы кругам не абышлі ўвесь дом ды ізноў не апынуліся сьпераду. «Тут ужо на дваццатку. Досыць».

— Не, — сказаў я. — На даху.

— Божа, — адказаў. Азірнуўся. — Канечне, — сказаў ён. — Гэта ўжо зусім іншая размова.

Я сказаў:

— Два вазы і торбачка. Проста ўзялі і ўцяклі.

— Глянь! — сказаў чалавек, і зноўку падняў свае крукі.

Я зайшоў у дом і ўзяў крэсла, паставіў яго пад паветкай. Але ж яго не хапіла. Тады я прынёс драўляную скрыню і паклаў яе на крэсла.

Там на даху было няблага.

Я ўзьняўся на ногі і азірнуўся. Я памахаў рукой, і чалавек бяз рук памахаў сваімі крукамі мне ў адказ.

І вось менавіта тады я ўбачыў камяні. Гэта нагадвала маленькае каменнае гнязьдзечка на жалезнай сетцы, якая пакрывала адтуліну коміна. Вы ж ведаеце дзетак. Вы ж ведаеце, як яны шпурляюць іх увышыню, спадзеючыся, што хоць адзін трапіць вам у комін.

— Ты гатовы? — клікнуў яго я і падняў камень, чакаючы, покуль чалавек бяз рук ня зловіць мяне ў вочка відашукальніка.

— Гатовы! — азваўся ён.

Я адвёў руку з камянём за сьпіну і зароў: «Давай!» Я шпурнуў гэтую сволач як мага далей.

— Ня ведаю, — пачуўся ягоны крык, — я не раблю здымкаў у руху.

— Яшчэ раз! — зверашчаў я і схапіў другі камень.

**Пераклаў з ангельскае мовы Пол Касьцюк**

**Рэйманд Карвэр (1938—1988) — адзін з найбольш чытаных сёньня амэрыканскіх пісьменьнікаў.**

# Кілбаса лівэрная, звычайная, палепшанай якасьці

Аляксандар Апон. Гумарэска.

Зайздрошчу Алесю Беламу — пісьменьніку і кулінару. Неяк сяджу, адпачываю. Нядзеля. Гляджу па тэлевізары на палі, па якіх сюдытуды соўваюцца трактары, і радуюся: буду з хлебам!

— Я пайду да сяброўкі! — кажа жонка, сядаючы каля мяне на канапу і гледзячы ў люстэрка, пачынае фарбаваць вочы.

«А хоць, — думаю, — да каханка, толькі хутчэй!»

— А ты нікуды не зьбіраесься? — дапытвае яна, перайшоўшы з вачэй на вусны.

— Не, што ты! — адказваю я і пераключаюся на іншы канал, каб паглядзець на лыжнікаў.

Пад Менскам, дарэчы, як і паўсюль, ажно да Калымы, ні плямы сьнегу — сышоў.

«О, — думаю, — малайцы! Дзеля мяне пакутуюць».

Між тым, заплюшчыўшы вочы, жонка цмокае мяне ў шчаку і адыходзіць. Хвілінку чакаю каля дзьвярэй, слухаючы, як гудзіць ліфт, потым кідаюся да тэлевізара і, напляваўшы на аздараўленьне, лячу ў краму.

— «Адпачынак», — пытаю ў прадавачкі, — ёсьць?

— А як жа! — чамусьці крыўдзіцца яна. — Колькі вам?

— Пляшку, — кажу, і разьлічыўшыся, сунуся ў аддзел кілбасных вырабаў, дзе, адстаяўшы невялікую чаргу, прашу: «Дайце трыста грам лівэркі».

— Для Бобіка? — адразаючы кавалак, пытае ўжо другая прадавачка.

— Не, — кажу, — для Цюліка.

— А, вось што!

«Ага, — думаю, — тое, тое!» Бо трэба быць разам са сваім народам, трымаць, так кажучы, руку на пульсе яго жыцьця, а не паводзіць сябе як некаторыя, асабліва той, што стаяў у чарзе перада мной, у чорным гарнітуры, і браў палку салямі.

З гэтай думкай пра чорныя гарнітуры вяртаюся назад і, не марудзячы, пачынаю накрываць на стол — рэжу лівэрку, чорны хлеб, чышчу цыбуліну і раптам, як абухом па галаве, тлустыя літары ў вачах: «Галубцы».

«О-ёй! — думаю. — Адкуль гэта?»

Хвіліну сяджу як прыклеены, успамінаю, потым, падскочыўшы, лячу да сябе ў пакой, хапаю падшыўку «Нашай Нівы», і — на табе — ёсьць, знаходжу: Алесь Белы «Галубцы». Чытаю: «1 качан капусты, 10 штук сушаных грыбоў, 1 цыбуліна, 100 г сьвінога фаршу, 2 яйкі…» «Так, — бухае ў галаве, — нічога сабе, сто грам сьвінога фаршу!»

Варочаю старонкі далей і бачу: «Траска і мянтуз», потым: «Селядзец па-беларуску», яшчэ: «Перакачаўнік» і нарэшце — «Гарадзенскі смак».

Пра лівэрку звычайную, палепшанай якасьці — ні слова.

«О, думаю, трэба, пакуль не агледзеўся Алесь Белы, браць, як кажуць у народзе, сьвіньню за вушы і пачынаць з галоўнага, а галоўнае — гэта рэцэпт».

І вось ён: бярэце дзьве ці тры тысячы беларускіх рублёў і — у краму.

Эх, узялі б мяне ў Прэзыдэнты! Якія пэрспэктывы, ажно дух займае, як падумаю, я адкрыў бы перад краінай, асабліва ў галіне перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Крыўдна, таварышы, далібог, крыўдна!

Толькі ўявіце сабе: Я (таксама зь вялікай літары), у жывым этэры Першага канала тэлебачаньня. Не, усіх, усіх каналах! Раніца. Сонца ўстае над краінай.

Пазяхаючы, мой народ спаўзае з ложкаў і, уключыўшы тэлевізар, становіцца, прыклаўшы рукі да сэрцаў, каб прасьпяваць з хорам гімн, які Я — найвялікшы паэт усіх часоў і народаў — начырыкаў неяк на дэкрэце пра абарону сваіх гонару і годнасьці. Сам жа Я ўжо ў студыі. Зь левага боку ад мяне вядоўца «галоўных навінаў», з правага — які-небудзь чарговы міністар, а з тылу — ахоўнікі з кулямётамі наперавес.

Я адразу пасьля таго, як сьпевакі адсьпявалі, насупіўшы бровы, зьвяртаюся да міністра: «Ну ты, еш ужо!» Ён, з ладным кавалкам лівэркі ў руцэ, глытаючы сьлінкі: «О, што за водар!» Я: «Давай, давай, тужся, а то рогі ўраз пааблömваю!» Ён, засунуўшы сабе кавалак у рот і выціраючы рукавом з вачэй сьлёзы, што нечакана пырснулі: «А што за смак!» — і далей, глытнуўшы, умольна зазіраючы мне ў вочы: «Геній, геній». Я, недзе трошкі сарамліва: «Так, так, гэта вядома!» Між тым, ня вытрымаўшы, вядоўца кажа ўбок, але каб было ўсім чуваць: «І што за шчасьце жыць зь ім у адзін час!» Я, пачуўшы, бо маю ідэальны, як і ўсё астатняе, слых: «Ага, дзякую за шчырасьць!»

Ну, а што зробіць міністар, трапіўшы пасьля жывога этэру да сябе ў міністэрства, няцяжка здагадацца. Бо чаму гэта давіцца лівэркай павінен ён адзін — ягоныя намесьнікі з памочнікамі што, лепшыя?

І вось яны стаяць, пашыхтаваўшыся ў шарэнгу, і, вядома, ня так проста, а з партфэлямі, набітымі лівэркай.

— Ну, — аглядаючы шарэнгу, строга кажа міністар, — па адмашцы, разам… І падымае руку, каб ужо махнуць, але тут з крыкам: «Не, стой, чакаць!» — кідаецца з усіх ног, пускаючы газы, у прыбіральню.

А яны застаюцца чакаць, варочаюць насамі, панура гледзячы ў падлогу, і толькі думка пра тое, што ў іх таксама ёсьць свае намесьнікі з памочнікамі, грэе іхныя сэрцы.

І выходзіць указ, нумар, ня ведаю які, але пачынаецца ён прыкладна так: «Усім прадпрымальнікам, да першага нуль першага…» Га, як вам? І вось ужо перад дзьвярыма ў падатковую інспэкцыю чэргі з кветачкамі ў руках пра аплату права нешта і некалі рабіць і зь лівэркай на шыях, бо на тых жа дзьвярах, якраз пад нумарам кабінэта, у чорнай рамцы, вялізнымі літарамі: «Бяз колаў не заходзіць!!!»

Я ўжо не кажу пра байцоў амону, бо наколькі зручней дубасіць якое-небудзь саплівае дзеўчанё, што насьмелілася нешта піскнуць на вуліцы па-беларуску, ня гумай, а кавалкам лівэркі спэцгатунку. Даў раз у лоб — і тут жа адкусіў, падсілкаваўся. На захадзе зойдуцца ад зайздрасьці, о далібог, зойдуцца!

Не, каб не спазьніцца, трэба ляцець, браць патэнт, толькі ня ведаю куды. Таму вымушаны на гэтым разьвітацца. Шчыра дзякуючы за ўвагу, цалую, асабліва дзяўчат, зычу ўсяго і гэтак далей.

*Горадня*

Пра **Аляксандра Апона** нам вядома толькі тое, што ён жыве ў Горадні і дасылае нам свае творы факсам з пошты.

# Сьвяты вечар

Пэтар Шабах. Апавяданьне.

Ладзя жыў ужо толькі з матуляй.

— Выпі хоць какавы зь пірагом, — клапатліва сказала яна яму раніцай перад Калядамі.

— Ды не, дзякуй, — кінуў той у адказ, — пасьціць дык пасьціць… Прынамсі, убачу залатое парасятка[1]…

— Ой, ня ведаю, ці тое ты робіш… — пахітала яна галавой. — Посьціш, а ў карчму зноў ідзеш. Што агульнага ў карчмы з Калядамі?! З Божым дзіцяткам[2]?! Акрамя таго, што яна называецца «Ў Сьвятога»?!

— Ніякага Божага дзіцяці няма. Існаваньне Божага дзіцяці нікім не было пацьверджанае… — мармытаў Ладзя, корпаючыся ў шафе. — Яго ніколі ня бачылі ні савецкія касманаўты, ні амэрыканскія астранаўты. Дый шахцёры так і ня здолелі пераканаўча засьведчыць, што пад зямлёй жывуць чэрці ды іншыя звышнатуральныя істоты, хоць у іх ня раз пыталіся…

— Ці ты не п’яны?! — занепакоена ўзьняла бровы маці.

— Ты ж ведаеш, што ў нас традыцыя — зайсьці ў гэты дзень кульнуць чарку… — крактаў Ладзя, спрабуючы прадрацца праз швэдар. Знайшоўшы нарэшце гарлавіну, ён абдарыў маці шырокай усьмешкай і, узяўшы яе галаву ў далоні, уляпіў ёй у лоб пацалунак — быццам паставіў на чало пячатку, гэткае слаба чытэльнае «люблю цябе».

Ён сядзеў у карчме і чакаў Гонзу.

«Калі прыйдзеш раней, — сказаў той напярэдадні, — вазьмі сабе за мой кошт чарку ці дзьве, але ня болей за тры, бо яшчэ мяне разарыш!»

Ён сядзеў за сталом, аздобленым сьвечкай, і гуляўся з пушкай запалак.

Аднекуль ззаду наблізіўся афіцыянт — мужчынка, якога, здавалася, шмат гадоў таму бусел прынёс адразу сюды, у гэтую забягалаўку. Голас афіцыянта прагучаў ціха, але нечакана — Ладзя зь пярэпалаху ажно таргануўся:

— Што магу вам прапанаваць?

Ладзя разгубіўся, бо пакуль сядзеў у карчме, думаў пра ўсё, што заўгодна, толькі не пра тое, што замовіць. У моду тады ўваходзілі простыя мяшаныя напоі, прыкладам, кола з ромам, якую называлі «Гэмінгўэй», або сок з гарэлкай, які называлі «сок з гарэлкай», але ні таго, ні другога Ладзю не хацелася.

Паўза зацягнулася, ужо выглядала на тое, што Ладзя сабе так нічога й ня возьме, папросту ня здолее зарыентавацца, і далей будзе сухама глядзець у прафэсійна спагадлівыя вочы старога афіцыянта, як раптам ён заўважыў перад сабой цэньнік напояў, а на ім ядлаўцоўку, пра якую Гонза заўжды сьцьвярджаў: «Бляха, ды гэта натуральны джын, толькі напалову таньнейшы!»

Ладзя ўхапіўся за гэты выратавальны круг і сказаў, што паспытаў бы той ядлаўцоўкі.

— Чыстай? — спытаў афіцыянт.

— Не-не, барані мяне Бог! — жахнуўся Ладзя і, каб прадэманстраваць, што ён думае пра людзей, якія п’юць чыстую ядлаўцоўку, да таго ж з самага ранку, афэктавана паражагнаўся, на што афіцыянт з разуменьнем усьміхнуўся.

— Дайце мне яе з джынам! — хутка прамовіў Ладзя; паколькі ў думках ён увесь час суаднасіў кошт джыну і ядлаўцоўкі, то ня дзіўна, што ён агаварыўся, насамрэч ён хацеў сказаць «з тонікам».

— Як, прабачце??? — афіцыянт прыгладзіў пасму сівых валасоў, якія ад нікатыну месцамі набылі амаль брунатны колер.

— З джынам, — бяз задняе думкі пацьвердзіў Ладзя.

— Дазвольце пацікавіцца, як вы гэта сабе ўяўляеце? — схіліўся да яго афіцыянт, які вачыма літаральна павіс на ягоных вуснах.

— Вы мне ў шклянку нальяце ядлаўцоўкі, — прамовіў Ладзя, — а я разрэджу яе джынам…

— Я разрэджу і сам! — пакрыўджана сказаў афіцыянт. — Але вы мусіце мне сказаць, у якой прапорцыі вам іх зьмяшаць.

— Адзін да двух. Натуральна, на карысьць джыну! — засьмяяўся Ладзя, бо быў упэўнены, што гаворыць пра тонік.

— Прабачце… — заўважыў, ціха адкашляўшыся, афіцыянт. — Ня ведаю, ці

[1] Паводле традыцыйных чэскіх калядных вераваньняў, узнагародай для тых, хто на Шчодры дзень ад самага ранку нічога ня еў, бывае зьяўленьне залатога парасятка.
[2] Функцыі Дзеда Мароза ў Чэхіі выконвае Божае дзіцятка (Ježnšek).

**Пэтар Шабах**

нар. у 1951 у Празе. Аўтар каля дзесяці пасьпяховых кніг (напр., «Як патапіць Аўстралію», «Гаўно гарыць», «П’яныя бананы», «Бабулі»). Паводле некаторых зь іх былі зьнятыя мастацкія фільмы. Шабах сваёй творчасьцю працягвае традыцыю чэскай гумарыстычнай літаратуры, закладзеную Яраславам Гашакам і разьвітую Каралам Палачакам і Ёзэфам Шкворацкім.

## ЗДЫМКІ ГОДУ


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Самалі трагічна загінуў экіпаж беларускіх лётчыкаў.**

паверыце, але за ўсю сваю практыку я з падобнай замовай яшчэ не сутыкаўся!

— Як доўга вы ў афіцыянтах?! — ласкава ўсьміхнуўся яму Ладзя.

— Сорак адзін год… — ціха сказаў мужчынка і пайшоў мяшаць напой. Празь імгненьне ён вярнуўся са шклянкай. Ладзя прагна прыпаў да яе вуснамі, але зь ягоных вачэй тут жа пырснулі сьлёзы.

— Моцнае? — зьедліва ўхмыльнуўся афіцыянт.

— А х-хал-лера! — выціснуў зь сябе Ладзя, калі змог авалодаць дыханьнем, бо, каб прагнаць смагу, глынуў сапраўды многа. — Ну й пойла!!!

— Я таксама так думаю… — сказаў мужчынка і дадаў:

— Але… што цяпер будзем рабіць?

У гэты момант Ладзя заблытаўся дарэшты і, нічога ня цямячы, папрасіў:

— Дайце мне, калі ласка, яшчэ трохі джыну — каб запіць!

Афіцыянт акінуў яго строгім позіркам — ён усё больш схіляўся да думкі, што гэты малады чалавек, мусіць, спрабуе яго на нешта справакаваць.

Толькі тады, калі Ладзя атрымаў чарговую порцыю джыну, да яго дайшло, што ён увесь час блытаў яго з тонікам, але перад ім ужо стаяла трыста пяцьдзясят грамаў алькаголю, а поруч сядзеў Гонза і ня мог паверыць лічбам на рахунку.

Яны замовілі тонік і па-таварыску падзялілі джын зь ядлаўцоўкай.

— У мяне няма ніякага падарунку для маці… — сумна сказаў пасьля паўзы Ладзя.

— «Котва»[3] яшчэ адчыненая… — заўважыў Гонза, і тут жа дадаў:

— А лепш не марнуй часу, я табе дам якога мыла з парфумай. Жанчыны такому заўсёды радыя.

Ён запусьціў руку ў торбу, што стаяла пад сталом, і выцягнуў зь яе каробку, старанна загорнутую ў дарагую калядную паперу. Паставіў яе на стол і хітра ўсьміхнуўся:

— Для Зузанкі, бляха…

— Для якой Зузанкі?

— Для маёй, бляха… Для той, якую я выдумаў дзеля маці…

— Прыкольна… — сказаў Ладзя і ўзважыў на руцэ пакунак.

— Не прыкольна… Маці хоча, каб я іх пазнаёміў.

— Во блін, і што ты будзеш рабіць? — спытаў Ладзя.

— Пакуль намякнуў дома, што Зузанка трохі прыхварэла, там, высокая тэмпэратура і ўсё такое… А зараз падумваю, што калі да гэтага дададуцца нейкія ўскладненьні, дык яна іх можа й не перажыць…

— А не зажорстка?

— Як зажорстка, калі, бляха, Зузанка не існуе! — засьмяяўся Гонза.

Нейкі час яны толькі маўчалі і папівалі тонік зь ядлаўцоўкай і джынам.

— Неяк дзіўна, — раптам рэзка прамовіў Ладзя, — я ведаю, што яна не існуе, і ўсё адно мне здаецца жорсткім вось так проста дазволіць Зузанцы памерці… Нават калі яна і не існуе.

Ад паху ігліцы іх ужо цягнула на ваніты, таму сябры замовілі чырвонага віна.

— Ну, за Каляды! — узьняў Ладзя келіх.

— За Каляды! — падтрымаў тост Гонза.

— А што калі проста сказаць, што яна куды-небудзь зьехала… — амаль загаласіў Ладзя. — Не абавязкова ж ёй адразу паміраць. Мне гэта не падабаецца… І гэты падарунак для яе мне падаецца нейкім брутальным…

— Ты ведаеш, колькі я ўжо ваджу маці за нос?! — гучна прашаптаў Гонза, і ў ягоных вачах раптам зьявіўся адчай. — Я ўжо больш не магу! Увесь час толькі й чую: дык калі ты яе нарэшце прывядзеш? час табе ўжо, хлопча, пасталець! ня думай, што мне ня хочацца ўнукаў! — увесь час адно і тое ж… А што я магу зрабіць, трасца!?

— Прынясіце яшчэ па адным… — кінуў Ладзя афіцыянту, а потым задумена дадаў:

— Слухай, а мо пакінем Зузанку ў жывых? Ты мне дапамог з падарункам, дык цяпер дапамагу я табе?

— Гэта як, цікава?!

— Я б яе мог у цябе адбіць!

— Ну, не! — выгукнуў Гонза і нахіліўся наперад так рэзка, што ледзь не перакуліў келіх зь віном. — Што-што, а гэта — не, бляха!

— Ты чаго?! — жахнуўся Ладзя. — Ніякай жа Зузанкі ўсё адно няма! І я хацеў як лепш… — дадаў ён.

— Як лепш… як лепш… — мармытаў Гонза і ўзлавана глядзеў у стол. — Хочаш, каб я прыйшоў дадому і сказаў: дарагая мамуля, маю Зузанку зьвёў мой найлепшы дружбак Ладзя, і я ўжо, відаць, да самай сьмерці буду адзін… Ня будзе ў вас ніякіх унукаў. Унукі будуць у Ладзі, дакладней, бляха, у ягонай маці. А ў вас дома будзе як максымум стары кавалер, які, можа быць, завядзе сабе з часам сіямскую котку…

— Ты як малы… — уздыхнуў Ладзя. — Гэта тое самае, што спрачацца, ці існуе Божае дзіцятка. Можаш сабе ў яго верыць, гэта твая справа, але калі ты будзеш верыць і ў Зузанку, дык з табой, хлопча, усё ясна! Гэта ўжо патыхае Богніцамі[4]!

— Паўтарыце нам яшчэ раз! — махнулі яны адначасова афіцыянту.

— Я толькі не хацеў бы, каб яна памерла… Неяк фальшыва было б так яе пазбавіцца…

Гонза маўчаў.

— Або разыдзіся зь ёй ты! Скажы маці, што яна не хацела дзяцей, бо яны былі б перашкодай у ейнай кар'еры… Ці нешта ў такім духу…

— Я ведаю… Яе пераедзе машына… — цьвёрда абвесьціў Гонза. — Ад яе застанецца адно мокрае месца!

— Ну ты й сьвіньня! — сказаў Ладзя абурана. — Ты самая натуральная бяздушная сьвіньня!

— Асьцярожней у выразах! — працадзіў Гонза скрозь зубы. — Раіў бы табе ўзважваць кожнае слова!

— Ты ўжо, здаецца, добра ўпіўся… Гэта ня мае сэнсу, — з агідай махнуў Ладзя рукой.

— Вясёлых Калядаў!!! — крыкнуў Гонза гістэрычным фальцэтам і ляснуў аб стол грашыма. — Вельмі вясёлых Калядаў табе жадаю! І не забудзься, бляха, падарунак!!! — прамычаў ён ад дзьвярэй. Увесь шынок на яго зьдзіўлена азірнуўся.

Ладзя прыцягнуўся дахаты якраз перад вячэрай. Прыняў душ, прамыў вочы борнай вадой і апрануў чыстую кашулю. Яшчэ раз уважліва агледзеў пакуначак ад Гонзы, а потым на абгортцы зялёным флямастарам намаляваў яловую галінку, над якой напісаў: «Матулі ад Зузаны».

— Якое на мяне сёлета шчасьце звалілася! Я ўжо думала, што гэтай хвіліны ніколі не дачакаюся! Ах ты сакрэтнік! Ладзя, а калі ты яе прывядзеш паказаць? — спытала ў яго маці, прыбіраючы са стала сьвяточную парцаляну.

— Ня ўсё так проста… — прамовіў ён сур'ёзным тонам і даліў сабе ў шклянку віна да самага краю. — Разумееш, Зузка зараз крыху прыхварэла…

**Друкуецца з ласкавай згоды аўтара і выдаўца.**
**З чэскай мовы паводле Petr Šabach: Svatvečer, in: Šťastné a veselé…, Listen, Jihlava 2006**
**пераклаў Сяргей Сматрычэнка**

[3] Вялікі гандлёвы дом у Празе.

[4] Клініка для псыхічна хворых у Празе.

# Дзякуй за падтрымку

**А.Б.** з Полацку.
**А.С., С.І.** з Горадні.
**Сяргею Б.** з Слуцку.
**Вользе В., С.Г., Ганьне П., Аляксею Ш.** зь Менску.




## Артур Клінаў
## Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца

Аўтабіяграфічны раман Артура Клінава — культавай постаці эўрапейскага мастацкага андэграўнду — напісаны як падарожная кніга па Менску і зьмяшчае арыгінальныя фотаздымкі. Гэта глыбокі філязофскі і стылёва вытанчаны тэкст, дзе асабістая гісторыя героя арганічна ўплеценая ў мінулае і цяперашняе гораду. Па пракладзеным Клінавым маршруце, як па дублінскіх маршрутах Джойса і Венечкі Ерафеева ў Маскве, у Менску можна вадзіць з экскурсіямі турыстаў.

**Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца / Артур Клінаў. — Менск: Логвінаў, 2008. — 202 с. — («Кнігарня «Наша Ніва»)**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП “Суродзічы”, УНП 190 786 828
МГД ААТ “Белінвестбанк”, вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перараказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

# Якія падарункі прывёз Капітан Танака?



## КАНЦЭРТЫ

### Троіца

**6 студзеня ў «ROCK-HOUSE CAFE» (Няміга, 12)** выступае этна-трыё «Троіца» з «Калядным канцэртам». **Пачатак а 21-й.**

### Вайцюшкевіч

**7 студзеня ў малой залі КЗ «Менск»** — Зьміцер Вайцюшкевіч і WZ-Orkiestra з традыцыйным сьвяточным канцэртам «Сустрэча на Каляды» — калыханкі, калядкі, прэм'еры. Квіткі: 15000—27000. **Пачатак а 19-й.**

## ВЫСТАВЫ

### Калядны шопінг у «Падземцы»

**Да 14 студзеня Арт-галерея «Падземка» (пр. Незалежнасьці, 43)** запрашае на традыцыйны «Елачны кірмаш 2007». Каралева гэтага сьвята — елка — зьдзівіць і пацешыць Вас нечаканымі выяўленьнямі і формамі. У залях галерэі — працы найлепшых беларускіх мастакоў, дызайнэраў і сяброў галерэі. Вас чакаюць жывапіс, графіка, фатаграфія, керамка, а таксама самаробныя цацкі і падарункі.

### Калядная бяседа

**23 сьнежня а 17-й у Мастацкім музэі** — адкрыцьцё выставы «Калядная бяседа», на якой можна ўбачыць творы Валер'я Славука (графіка), Ганны Балаш (лялькі і арт-аб'екты), Данілы Парнюка (фота). На гэтай выставе ў якасьці адной з асноўных пазначаная тэма бяседы каралёў (тры асноўныя сымбалічныя пэрсанажы выставы — Кароль, Каралева, Блазан). **Выстава працуе да 11 студзеня.**

### Калядны кірмаш

**Галерэя «Ла-Сандр Арт» (Раманаўская слабада, 24) да 15 студзеня** запрашае на «Калядны кірмаш» — пярэсты калейдаскоп твораў беларускіх мастакоў.

### Выстава ў гонар перамогі на Сініх водах

**24 сьнежня ў менскай галерэі «Арт-блік» (вул. Някрасава, 11/34)** адкрылася выстава «Віват, Альгерд! Хвала Айчыне». Яна прысьвечаная 645-годзьдзю перамогі беларускага войска Вялікага Княства Літоўскага ў бітве з татарамі на Сініх водах. Наладзіла выставу мастацкая суполка «Пагоня». Прадстаўленыя партрэты вялікага князя Альгерда аўтарства **Арлена Кашкурэвіча** і **Міколы Купавы**, «Бітва на Сініх водах» **Міхася Басалыгі** і выявы беларускіх гарадоў, гістарычна зьвязаных з падзеямі на Сініх водах. Выстава невыпадкова адкрылася ў калядны вечар, адзначыў мастак Мікола Купава: «Альгерд з войскам пайшлі ў дзікія стэпы ў жніўні. Нібыта ў верасьні адбылася бітва. І менавіта да Калядаў яны вярнуліся ў Вільню зь перамогай».






## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### Першае беларускамоўнае навагоднее тэлешоў

Падрыхтаваны **першы беларускі «Аганёк»** з удзелам рэдкіх гасьцей тэлеэкранаў: **N.R.M.**, **IQ48**, **Neuro Dubel**, **«Крамбамбулі»**, **«Палацу»**, **«Крамы»**, **Зьмітра Вайцюшкевіча** і **Віктара Шалкевіча**. **«Сьнежны завулак 8, альбо Незвычайная сустрэча пад Новы год»** — гэта сьвяточная атмасфэра, цудоўная музыка, трапныя жарты і віншаваньні вядомых людзей. У навагоднюю ноч паглядзець шоў можна будзе **на канале Belsat**.

**Паводле generation.by**

## ТЭАТРЫ

### Купалаўскі тэатар

**28 (пт)** — «Сны аб Беларусі».
**29 (сб)** — «Макбэт».
**30 (ндз)** — «Каханьне ў стылі барока».
**2 (ср)** — «Смак яблыка».
**3 (чц)** — «Кім».
**4 (пт)** — «Паўлінка».
**5 (сб), 6 (ндз)** — «Чорная панна Нясьвіжу».

*ранішія спэктаклі*

**29 (сб), 30 (ндз)** — «Афрыка».

*малая сцэна*

**6 (ндз)** — «Варшаўская мэлёдыя».

### Тэатар юнага гледача

**28 (пт), 29 (сб), 30 (ндз), 3 (чц), 4 (пт), 5 (сб)** — «Шчаўкунок».
**6 (ндз)** — «Шлях на Батлеем».

## ВЫСТАВЫ

### У пошуках ілюзіяў

**Да 21 студзеня** ў М-Галерэі інстытуту імя Гётэ (Фрунзэ, 5) працуе пэрсанальная выстава твораў літоўскага фатографа Томаса Будрыса, сябры фотаклюба Palangos Fotoklubas 750 — «У пошуках ілюзіяў».

### Жывапіс і графіка Мсьціслава Дабужынскага

У Мастацкім музэі **да 8 студзеня** працуе выстава жывапісу і графікі Мсьціслава Дабужынскага (1875—1957). Графік і плякатыст, жывапісец, яго імя злучана з сусьветнай культурай к.XIX—п.XX ст.

зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»

# Апошні месяц па старых цэнах!

Толькі да праваслаўных Калядаў (7 студзеня) кнігі сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва» будуць прадавацца па старых цэнаў. З 2008 году цэны павышаюцца на 50 %. Зрабі падарунак сабе, а нават сваім унукам.

Замаўляйце кнігі праз
029-505-39-11
029-126-36-87
knihi@me.by




**Вясна народу:** Эсэістыка 1991—2007




**Віталь Тарас. Звыклае зло.** Зборнік эсэ.




**Застаемся!** Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае

Увага! Засталіся апошнія дзесяць асобнікаў!




**Сямён Печанко. У беларускім войску:** Падарунак прызыўніку.




**Бабілёнская бібліятэка:** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы».

Эдгар Алан По, О. Генры, Яраслаў Гашак, Бруна Шульц, Альбэр Камю, Хорхэ Люіс Борхэс ды іншыя — на роднай мове




**Алесь Кудрыцкі. Суд на Каляды.** Зборнік публіцыстыкі.




**Андрэй Хадановіч. Сто лі100ў на tut.by.** Новая кніга паэта, якога няма патрэбы прэзэнтаваць.

Увага! У продажы застаецца апошняя сотня асобнікаў!




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна**

Кнігу склалі апавяданьні і дэтэктыўная аповесьць.




**Наталка Бабіна. Рыбін горад.** Раман




**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне

У кнігу ўвайшлі найлепшыя мужчынскія апавяданьні 1991—2007 гадоў у выбарцы «Нашай Нівы». Гэта апавяданьні Вячаслава Адамчыка, Уладзімера Арлова, Ігара Бабкова, Васіля Быкава, Лявона Вольскага, Адама Глёбуса, і іншых — усяго 30 аўтараў.



**Жанчыны выходзяць з-пад кантролю:** Беларускае жаночае апавяданьне

У зборнік увайшлі творы найлепшых сучасных аўтарак: Тацьцяны Барысік, Евы Вежнавец, Марыі Роўды ды іншых.




**Найясьнейшая Рэч Паспалітая:** Цывілізацыя—Культура—Рэлігія—Палітыка—Авантура—Героіка—Успамін.




**Валянцін Тарас. На высьпе ўспамінаў.** У сваіх мэмуарах, поўных важкіх дэталяў і трапных апісаньняў, пісьменьнік запрашае нас у прастору, дзе жылі Якуб Колас, Уладзімер Караткевіч, Васіль Быкаў, Яўгенія Янішчыц...
Гэта ўнікальны летапіс быцьця душы, што праходзіць праз вайну і мір, жыцьцё і сьмерць, сяброўства і здраду, напісаны паўзьверх старонак гісторыі СССР, Эўропы, Беларусі...

ш у к а й ц е ў к н і г а р н я х і ў н е з а л е ж н ы х р а с п а ў с ю д н і к а ў




**Каляндар на 2008 год**

**са здымкамі фатографаў «НН» Юліі Дарашкевіч і Андрэя Лянкевіча.**




**Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца / Артур Клінаў. — Менск: Логвінаў, 2008. — 202 с. — («Кнігарня «Наша Ніва»)**




**Пётра Краўчанка. Беларусь на ростанях:** Нататкі дыплямата і палітыка




**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў.** Кніга падарожных эсэ.




**Павал Севярынец. Лісты зь лесу.** У кнзе сабраныя лісты, якія Павал Севярынец ад верасьня 2005 да ліпеня 2007 дасылаў у «Нашу Ніву» з Малога Сітна — месца сваёй высылкі.



**Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі**

с э р ы я з а с н а в а н а я ў г о н а р 100-г о д з ь д з я «Н а ш а й Н і в ы»

# Важная справа

Трэці год падпіска на «Нашу Ніву» і іншыя незалежныя газэты адбываецца ў нязвыклай форме. Газэта трымаецца, бо Вы захоўваеце вернасьць ёй і дзейнічаеце як вольныя грамадзяне. На самай справе, Вы сталі сутворцамі нечага беспараўнанага ў Беларусі і незвычайна важнага для духу ўсёй эўрапейскай супольнасьці. Два гады выходзяць газэты, забароненыя да распаўсюду. Такога ня выкрасьліш з гісторыі. Грамадзтва паказвае, хто галоўны: грамадзяне ці ўлада.

Просім працягнуць падпіску. Болей: мала проста вам асабіста застацца з газэтай, каб яна выстаяла, трэба яшчэ ўвесь час прыцягваць новых людзей. Мы езьдзім па краіне, сустракаемся зь людзьмі, робім, што можам. Ад вас просім, каб КОЖНЫ З ВАС расказаў пра «Нашу Ніву» ў сваёй сяброўскай, працоўнай, царкоўнай, партыйнай суполцы, проста знаёмым, якія падзяляюць Вашы погляды, але магчыма ня ведаюць пра такую крыніцу інфармацыі, як «НН».

Што ім трэба сказаць? Што «Наша Ніва» дае праўдзівую інфармацыю, новыя ідэі, пажыву для розуму ў камэнтарах, унікальныя фатаграфіі, а самае важнае — пачуцьце беларускай супольнасьці. Яна хутка даходзіць, друкуецца ў Беларусі.

У гэтыя найцяжэйшыя для свабоднай прэсы гады «Наша Ніва» ўмацавалася ў сваім пакліканьні як трыбуны незалежнага грамадзтва. Дзякуючы Вам.

Няхай 2008 год будзе добрым годам.

# А ты падпішыся!

Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву», проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 43.**



**Шасьцімэтровы саламяны анёл пасяліўся на Каляды ў менскай капліцы Сьвятога Яна Хрысьціцеля. Ён — праца мастакоўскай сям'і Лойкаў.**

## *каляд**Н**ы **Н**умар «**НН**»*

*сем апавяданьняў на сем калядных вечароў*


**Уладзімер Лялькоў.** Лёсы ..... **31**
**Сьвятлана Курс.** З Толікам і Колікам ..... **35**
**Таня Барысік.** Маленства пад горку каціласа ..... **36**
**Аляксей Бацюкоў.** Хто сьмяяўся апошні ..... **38**
**Рэйманд Карвэр.** Відашукальнік ..... **39**
**Аляксандар Апон.** Кілбаса лівэрная, звычайная, палепшанай якасьці ..... **40**
**Пэтар Шабах.** Сьвяты вечар ..... **41**



## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### БЕЛАРУСКАЯ СЯМЕЙНАЯ ЯЛІНКА

**Шаноўныя** дзеткі, мамы й таты, бабулі й дзядулі, дзядзькі й цёткі! Запрашаем вас на Беларускую Сямейную Ялінку 30 сьнежня (нядзеля) у 10.30! У праграме сьпевы ды скокі, падарункі і пачастункі, сюрпрызы і прыемныя сустрэчы. Чакаем усіх у Моладзевым цэнтры пры Касьцёле Сьв. Яна Хрысьціцеля ў Менску. Цэнтар знаходзіцца ў Серабранцы на вул. Пляханава 28/1, першы паверх. Грамадзкім транспартам даезд да прыпынку вул. Гараўца: трамваі на Серабранку (№ 3, 7), тралейбус № 35, аўтобусы № 9, 9в, 9д, 56. Папярэдне кантактуйце: e-mail: n.dzietki@yahoo.com, тэлефон у Менску 292 -31 -85 (Вольга), (029) 632- 27- 43 (Крысьціна), (029) 403-15-35 (Натальля), ICQ 353 181 833, Skype: Mazurava

### БЕЛАРУСКАСЬПЕЎНАЯ СКРЫПКА

**Прымем у падарунак**, возьмем у часовае карыстаньне або нядорага набудзем (або памяняем на коціка!) смык для скрыпкі беларускай. Т.: (029)912-27-30


Наступны нумар газэты выйдзе **11 студзеня**.
Добрых Вам сьвятаў!


**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**.



Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2339. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 26.12.2007.

Замова № 7041.

**Рэдакцыйны адрас**: Ракасоўскага, 102-71.